Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 24 мая 1985 г. № 21 (3275) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

46-метровы абеліск, увенчаны Залатой Зоркай, узняўся напярэдадні 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў беларускай сталіцы на праспекце Машэрава, дзе пачынаецца парк Перамогі. Мемарыял «Гораду-герою», аўтарамі якога з'яўляюцца вядомы беларускі скульптар, лаўрэат Ленінскай прэміі В. ЗАНКОВІЧ і архітэктары В. РАМАНЕНКА, В. КРАМАРЭНКА, В. ЯЎСЕЕЎ, сімвалізуе мужнасць і няскоранасць народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

На шасціметровай вышыні на абеліску размешчаны тэкст Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Мінску ганаровага звання «Горад - герой». Справа знаходзіцца бронзавая скульптура жанчыны з узнятай у левай руцэ фанфарай — увасабленне Радзімы. Здаецца, што толькі прагучала мелодыя, якая апавясціла аб чаканай Перамозе.

Фота Ул. КРУКА.

НЕЎМІРУЧЫ ПОДЗВІГ НАРОДА

Асобнай брашурай выпушчан даклад таварыша **М. С. ГАРБАЧОВА** «Неўміручы подзвіг савецкага народа», з якім ён выступіў 8 мая 1985 года на ўрачыстым сходзе ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў, прысвечаным 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Брашура выпушчана Выдавецтвам палітычнай літаратуры.

ТАСС.

ДРУЖБЫ ГЛЫБОКІЯ КАРАНІ

Балгарская літаратура па колькасці перакладаў на беларускую мову займае адно з першых месц сярод зарубежных літаратур. За апошнія чатыры дзесяцігоддзі ў выдавецтвах рэспублікі выйшла больш як 30 кніг аўтараў з брацкай краіны агульным тыражом каля 400 тысяч экземпляраў. Беларускім чытачам вядомы творы больш як 200 балгарскіх пісьменнікаў. Асобнымі выданнямі выйшлі творы Г. Караславава, С. Паптонева, К. Калчава, А. Германава, Н. Вылчава і іншых.

Аб гэтым расказаў удзельнікам вечара, прысвечанага Дню славянскай пісьменнасці, балгарскай асветы і культуры, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР прафесар Н. С. Гілевіч. На вечары, які адбыўся 22 мая ў БДУ імя У. І. Леніна, прысутнічалі актывісты рэспубліканскага аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы, а таксама студэнты НРБ, якія вучацца ў ВНУ горада Мінска, балгарскія выкладчыкі.

Н. С. Гілевіч расказаў таксама аб удзеле беларускіх пісьменнікаў у літаратурных чытаннях у Балгарыі, шматлікіх сустрэчах з дзеячамі літаратуры і мастацтва гэтай брацкай краіны. У Балгарыі добра знаёмы з творчасцю многіх беларускіх пісьменнікаў. На роднай мове балгары чытаюць творы Я. Купалы і Я. Коласа, П. Броўкі і М. Танка, В. Быкава і А. Адамовіча.

Навуковы супрацоўнік з Габрава В. Георгіева, якая выступіла на вечары, адзначыла вялікі ўклад беларускіх пісьменнікаў у развіццё і ўмацаванне савецка-балгарскіх літаратурных сувязей.

БЕЛТА.

НА ЎСЕСАЮЗНЫМ ТЭЛЕЭКРАНЕ— ПРА БЕЛАРУСКУЮ ЛІТАРАТУРУ

Цэнтральнае тэлебачанне паказала перадачу «Толькі сэрцам верачы ў Перамогу», якая мае падзагаловак: «Савецкая літаратура пра Вялікую Айчынную вайну». Праграма была цалкам пабудавана на беларускім матэрыяле: у ёй гучалі выказванні пісьменнікаў, вершы паэтаў, урыўкі з твораў празаікаў. Стваральнікі перадачы (рэжысёр У. Яжоў, аператары А. Швячкоў і С. Лешчаў) імкнуліся не толькі пазнаёміць усесаюзнага тэлегледача з лепшымі старонкамі нашай літаратуры на ваенна-патрыятычную тэму, але і даць уяўленне аб сённяшнім абліччы беларускай зямлі, аб тых свяшчэнных мясцінах, дзе навечна захавана памяць пра мужныя, трагічныя і гераічныя дні народнага змагання з ворагам.

Перадача пачалася ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой», дзе І. Чыгрынаў у сваім інтэрв'ю падкрэсліў, што адсюль — вытокі нашага гераізму, вытокі той мужнасці, што выявілася пад Магілёвам, Смаленскам, Масквой. Вядомы беларускі празаік прызнаўся: працуючы над сваімі раманамі, прысвечанымі першым месяцам вайны, ён не мог не думаць пра герояў Брэста.

У сённяшняй Хатыні, дзе штодзень — новыя і новыя наведвальнікі і экскурсанты, А. Адамовіч разважаў пра самую адказную задачу літаратуры: абуджаць сумленне, узмацніць свой голас у барацьбе за мір, за тое, каб не было ніколі «Хатыняў-гарадоў, Хатыняў-дзяржаў, Хатыняў-кантынентаў». Думкі, выказаныя пісьменнікам, нібыта развівалі далей яго героі — Гайшун і Бокій ва ўрыўку з «Хатынскай аповесці». А. Адамовіч спыніўся таксама на суадносінах мастацкага вымыслу і аўтабіяграфічнага матэрыялу ў аповесцях В. Быкава, а потым прагучаў інсцэніраваны ўрывак з аповесці «Дажыць да світання».

Своеасаблівым паэтычным рэпартажам з мемарыяльнага комплексу «Прарыў» на Ушачыне з'явілася ўсхваляванае слова Р. Барадуліна пра ўсенародны размах партызанскага руху ў гады вайны.

Народны пісьменнік БССР І. Шамякін каля Кургана Славы гаварыў пра значэнне твораў на ваенную тэму для развіцця ўсёй савецкай шматнацыянальнай літаратуры.

Народны паэт БССР П. Панчанка расказаў пра дружбу і ўзаемадапамогу беларускіх і рускіх літаратараў у гады Вялікай Айчыннай вайны, пра тое, як рускія таварышы і калегі па пяру дапамагалі выдаваць газету «За Савецкую Беларусь».

У перадачы, падрыхтаванай Галоўнай рэдакцыяй навукова-папулярных і вучэбных праграм Цэнтральнага тэлебачання, гучалі вершы П. Броўкі, П. Панчанкі, Р. Барадуліна. Музыку і песню да яе напісаў кампазітар П. Быкаў.

В. ПЯТРОЎ.

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ СССР

Камітэт па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР паведаміў аб кандыдатурах, дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій СССР 1985 года.

Сярод іх: **В. ДАШУК**—аўтар сцэнарыяў і рэжысёр, вылучаны за цыклы дакументальных фільмаў «Я з вогненнай вёскі...» і «У вайны не жаночы твар» вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм», **А. ДУДАРАЎ** — аўтар п'есы, **В. РАЕЎСКІ** — рэжысёр, **Б. ГЕРЛАВАН** — мастак, **А. ДЗЯНІСАЎ** і **В. ФІЛАТАЎ** — выканаўцы роляў, вылучаныя за спектакль «Радавыя» ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы.

ПОСПЕХ МАЛАДЫХ

Гледачы, якія пабывалі нядаўна ў музычнай гасцінай Дома работнікаў мастацтваў, пазнаёміліся з некаторымі творамі маладых беларускіх кампазітараў: А. Бандарэнкі—асістэнта-стажора Белдзяржкансерваторыі, Я. Паплаўскага—студэнта чацвёртага курса, В. Жывалеўскага—выпускніка кансерваторыі, лаўрэата Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады, В. Радыёнава—выкладчыка Гродзенскага музычнага вучылішча, Г. Гарэлавай — члена Саюза кампазітараў БССР.

Асабліва спадабаліся прысутным струнны квартэт А. Бандарэнкі ў выкананні лаўрэата Міжнароднага конкурсу А. Крамарава, Ю. Ільяшова, В. Хадыкі, С. Гарнавітавай. «Светагорскія фрэскі» для габоя сола Г. Гарэлавай у выкананні А. Прыходзькі, «Фантазія памяці Эйтора Віла-«Лобаса» для гітары В. Жывалеўскага ў выкананні аўтара, вакальны цыкл на вершы рускіх паэтаў Я. Паплаўскага ў выкананні лаўрэата Усесаюзнага конкурсу імя Глінкі М. Жылюка.

Н. ЗЛАТКОЎСКАЯ.

ПЕРАМОЖЦЫ СЯРОД СТУДЭНТАЎ-ДЫРЫЖОРАЎ

У Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага прайшоў конкурс дырыжораў сярод студэнтаў, які прысвячаўся 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Журы на чале з загадчыкам кафедры аркестравага дырыжыравання С. Кафанавым падвяло вынікі.

Першае месца заняў студэнт чацвёртага курса В. Базылёў (клас выкладчыка А. Берына). Другое месца падзялілі між сабой другакурсніца В. Шпакоўская і студэнтка чацвёртага курса Г. Мясаед (адпаведна класы выкладчыкаў З. Шацілы і Г. Ермачэнкава). Трэцяе месца прысуджана пяцікурснику С. Авадку (клас выкладчыка Ю. Яфімава).

С. САЛЫГАЎ.

ПРАПАГАНДУЮЦЬ ХАРЧОВУЮ ПРАГРАМУ

Тры гады назад, 24 мая 1982 года адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС, які прыняў Харчовую праграму СССР, а таксама разгледзеў сістэму мер, накіраваных на паляпшэнне кіравання аграпрамысловым комплексам, удасканаленне эканамічнага механізму, яго функцыяніравання і развіцця. За прайшоўшы час дасягнуты значныя поспехі ў забеспячэнні насельніцтва прадуктамі харчавання, у далейшай сацыяльна-эканамічнай перабудове вёскі.

У прапагандзе рашэнняў майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, мер, накіраваных на ажыццяўленне Харчовай праграмы, вялікую ролю выконвае навуковая, сельскагаспадарчая і дакументальная літаратура. У рэспубліцы не першы год выходзіць міжвыдавецкая серыя «Харчовая праграма — справа ўсенародная!» Асноўныя кнігі, брашуры выпускаюцца пад эгідай выдавецтва «Ураджай». Сярод іх — «Творчы пошук сельскіх эканамістаў», «Брыгадны падрад на вёсцы», «Высокія ўраджаі — кожны год», «Вопыт вытворчасці і выкарыстання кармоў у Беларусі і Літве», напісаныя рознымі аўтарамі.

Кніга А. Каралёва «Падсобныя гаспадаркі Наваполацка» — адна з апошніх у гэтай серыі. Аўтар яе доўгі час працаваў першым сакратаром Наваполацкага гаркома партыі. Ён расказвае аб тым, як калектывы прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў гэтага маладога беларускага горада, выкарыстоўваючы рэзервы, вырашаюць намечаныя XXVI з'ездам КПСС і майскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС задачы, накіраваныя на паляпшэнне жыццёвага ўзроўню савецкіх людзей.

К. ХАНЕНКА.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

Навуковая канферэнцыя «Слова любові, слова народнага гневу», арганізаваная кафедрай беларускай мовы і прысвечаная 40-годдзю Вялікай Перамогі, адбылася на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Брэсцкага педінстытута імя А. С. Пушкіна.

Гаворку пра моўныя асаблівасці твораў гадоў Вялікай Айчыннай вайны, пачатую кандыдатамі філалагічных навук Г. Малажай і М. Аляхновічам, падтрымалі студэнты.

Да свята Перамогі выкладчыкі кафедры разам са студэнтамі ў кабінеце беларускай мовы аформілі пад аднайменнай назвай стэнд, які расказвае пра тое, як жыло і змагалася ў часы ліхалецця роднае слова з вуснаў Я. Купалы і Я. Коласа, П. Глебкі і П. Броўкі, М. Танка і П. Панчанкі, К. Чорнага, М. Лужаніна, І. Мележа, В. Гарбука.

В. ТАРАСЮК.

●

Частымі гасцямі бываюць беларускія пісьменнікі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Студэнты гэтай вышэйшай навучальнай установы сустракаліся з народным паэтам Беларусі Петрусём Броўкам, народнымі пісьменнікамі рэспублікі Іванам Мележам і Іванам Шамякіным, вядомым паэтам і літаратуразнаўцам Алегам Лойкам.

І вось чарговая сустрэча — правядзенне чытацкай канферэнцыі па раманах І. Чыгрынава з запрашэннем аўтара. Уступным словам канферэнцыю адкрыў дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта М. Гуліцкі.

З дакладам «Эпас народнага жыцця», у якім быў дадзены аналіз раманаў «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві» і «Свае і чужынцы» выступіў кандыдат філалагічных навук У. Каваленка.

Прафесар У. Анічэнка расказаў прысутным аб першых кроках І. Чыгрынава ў літаратуры, засяродзіўшы ўвагу на станаўленні творчай індывідуальнасці вядомага празаіка, спасціжэнні ім падзей мінулай вайны, раскрыцці характару савецкага чалавека ў выключных абставінах.

«Нацыянальны характар у прозе Івана Чыгрынава» — такую тэму для свайго выступлення абраў студэнт І. Шаладонаў. Студэнтка В. Быхаўцава звярнула ўвагу на мову твораў пісьменніка, а А. Халатава гаварыла пра раскрыццё І. Чыгрынавым вобразаў жанчын.

І. Чыгрынаў адказаў на шматлікія пытанні ўдзельнікаў канферэнцыі, падзяліўся творчымі планамі.

У рабоце канферэнцыі актыўны ўдзел прынялі сакратар Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР І. Сяркоў і загадчык кафедры беларускай літаратуры ГДУ І. Штэйнер.

В. ПЯСОЦКІ.

●

Заслужаны артыст рэспублікі, саліст ДАВТа БССР У. Экнадзіёсаў быў госцем «Клуба сяброў оперы». Сустрэча прайшла ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага.

У. Экнадзіёсаў выканаў арыі, арыёзы, рамансы і сцэны з опер «Пікавая дама», «Атэла», «Фаўст», «Рыгалета», «Паяцы» і «Дон Паскуале». Выступалі таксама лаўрэат усесаюзнага конкурсу І. Адзінцова, лаўрэат міжрэспубліканскіх конкурсаў Г. Лукомская і Л. Грабянок. Акампаніравала канцэртмайстар Г. Каржанеўская.

Г. ПАУЛАЎ.

●

Вечар, прысвечаны 40-годдзю Перамогі над фашызмам, праведзены ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна.

Загадчык аддзела беларускай і краязнаўчай літаратуры М. Дашкоўскі расказаў пра гераізм савецкіх воінаў пры разгроме гітлераўскай Германіі і яе саюзнікаў-сатэлітаў. Сакратар абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў І. Аношкін гаварыў аб удзеле пісьменнікаў-магіляўчан у Вялікай Айчыннай вайне, пра тых, хто з іх не вярнуўся з фронту.

Удзельнікамі вечара былі прачытаны вершы народнага паэта Беларусі А. Куляшова, А. Пысіна, В. Матэвушава, М. Аўрамчыка і іншых.

Чытач бібліятэкі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны А. Хлыбаў прыгадаў баявыя будні. Члены літаратурнага аб'яднання «Прыдняпроўе» В. Габрусёва і М. Емяльянаў прачыталі свае вершы аб героях вайны, барацьбе савецкіх людзей за мір.

А. БУРАВЕЦ.

●

У канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага адбылася сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з загадчыкам кафедры спецыяльнага фартэпіяна Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага, народным артыстам РСФСР, вядомым піяністам, прафесарам В. Мяржанавым.

Цёпла сустрэлі мінчане і вучня В. Мяржанава студэнта трэцяга курса Маскоўскай кансерваторыі, удзельніка маючага адбыцца ў Вене міжнароднага конкурсу імя Бетховена І. Гірфанава, які выканаў творы рускіх і замежных класікаў.

П. ПАУЛЕНКА.

●

Перамозе прысвечана была нядаўняя сустрэча пісьменнікаў Віцебска з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, якая праходзіла ў гарнізонным Доме афіцэраў.

Сустрэчу адкрыла старшыня жаночай секцыі Савета ветэранаў вайны горада Н. Сапожнікава.

Вершы аб перамозе, міры і савецкім народзе-патрыёце, аб шчаслівым сённяшнім дні Радзімы прачыталі У. Папковіч, Д. Сімановіч, П. Ламан, Б. Беляжэнка, Р. Пабярэжскі, Н. Давыдзенка, А. Паншын.

Вёў сустрэчу сакратар абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР А. Салтук.

А. ШПЫРКОЎ.

ПРЭМ'ЕРЫ

Вялікай даце — 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне прысвяціў свае новыя работы Гродзенскі абласны драматычны тэатр.

Сцэнічны варыянт вядомага рамана лаўрэата Ленінскай і дзяржаўных прэмій СССР Ю. Бондарава «Выбар» стаў першай работай на гродзенскай сцэне новага галоўнага рэжысёра тэатра, заслужанага дзеяча мастацтваў ТАССР І. Пятроўскага. Сцэнаграфія галоўнага мастака тэатра К. Чэмекава. У спектаклі «Выбар» заняты: народны артыст БССР Я. Кімберг, заслужаны артыст БССР В. Смачнеў, артысты А. Акчурын, М. Забалотная, В. Шакала, Р. Ляонава і іншыя.

На малой сцэне тэатра адбылася прэм'ера спектакля «Галасы». П'еса, паводле якой ён пастаўлены, нарадзілася ў тэатры і пабудавана толькі на дакументальным матэрыяле. Яе аўтары — памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы тэатра Д. Кальчанка і рэжысёр М. Абрамаў, які і ажыццявіў пастаноўку спектакля. Мастак — К. Чэмекаў. У спектаклі заняты ўсе маладыя артысты трупы.

«Выбар»: Рамзін — заслужаны артыст БССР В. Смачнеў, Раіса Міхайлаўна, яго маці — Р. Ляонава.
Сцэна са спектакля «Галасы».

Тэкст і фота А. КАСАРСКАГА.

ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ УЛАДЗІМІРА ІЛЬЧА ЛЕНІНА

У рэспубліцы пачалася падпіска на Выбраныя творы У. І. Леніна ў дзесяці тамах, якія выйдуць на беларускай мове ў адзінаццаці кнігах. Рыхтуюць выпуск Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ і выдавецтва «Беларусь», а пераклад ажыццяўляецца па дзесяцітомным выданні, якое выпускае «Политиздат».

Падпісчыкі змогуць пазнаёміцца з асноватворнымі работамі па праблемах ленінізму. Гэта — творы, якія расказваюць пра стварэнне партыі новага тыпу, раскрываюць гісторыю трох расійскіх рэвалюцый, гавораць аб перамозе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і абароне яе заваёў, будаўніцтве першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян, заканамернасцях і прынцыпах стварэння сацыялізму і камунізму. У збор увойдуць таксама работы У. І. Леніна, што адлюстроўваюць пытанні барацьбы за мір, стратэгію і тактыку міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, раскрываюць нацыянальна-вызваленчую барацьбу прыгнечаных народаў.

Выданне будзе ажыццёўлена на працягу 1985—1990 гадоў.

Неўзабаве выходзіць першы том. Змест яго складуць творы, датаваныя 1894—1901 гадамі. Сярод іх — «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супраць сацыял-дэмакратаў?», «Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струвэ», «Фрыдрых Энгельс», «Ад якой спадчыны мы адмаўляемся?» — і іншыя.

П. ЛЯМЕШКА.

РЭГІЯНАЛЬНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Адбылася рэгіянальная канферэнцыя Савецкага камітэта Міжнароднага таварыства па ахове помнікаў і славутасцей па тэме «Ахова і рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і архітэктуры і іх роля ў патрыятычным выхаванні савецкага чалавека». У яе рабоце ўдзельнічалі гісторыкі, археолагі, архітэктары і мастацтвазнаўцы Літвы, Латвіі, Эстоніі і Беларусі — усяго 150 спецыялістаў. Яны заслухалі і абмеркавалі на секцыях 42 паведамленні. У праграме іх работы было знаёмства з вопытам беларускіх спецыялістаў па рэстаўрацыі музейных каштоўнасцей на аснове выстаўкі, якая разгорнута ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР, а таксама наведанне мемарыяльных комплексаў Хатынь і Курган Славы, гістарычных забудоў Нясвіжа і Міра.

Канферэнцыя адкрылася і працавала два першыя дні ў сталіцы нашай рэспублікі, а потым яе ўдзельнікі прыехалі ў Полацк. Тут яны пазнаёміліся з практыкай работы беларускіх рэстаўратараў па аднаўленні і прыстасаванні для культурных патрэб помнікаў архітэктуры Сафійскага і Багаяўленскага саборaў, агледзелі комплекс Спас-Ефрасінеўскага манастыра.

У Сафійскім саборы адбылося заключнае пасяджэнне канферэнцыі, на якім з рэзюмі руючымі паведамленнямі выступілі кіраўнікі секцый архітэктуры, археалогіі, гісторыі і мастацтвазнаўства, былі выпрацаваны і прыняты рэкамендацыі. Пасяджэнне вёў начальнік упраўлення музеяў і аховы помнікаў Міністэрства культуры БССР А. Канаваленка.

Для ўдзельнікаў канферэнцыі ў выкананні салісты Белдзяржфілармоніі К. Шарава прагучаў канцэрт арганнай музыкі.

В. АРЛОВА.

ВЫСТАЎКІ

У выставачных залах БелНДІНТІ Дзяржплана БССР разгорнута мастацкая экспазіцыя «Жывапіс, графіка», прысвечаная XII Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў, які неўзабаве адбудзецца ў Маскве.

Вернісаж, наладжаны ЦК ЛКСМ Беларусі, Міністэрствам культуры БССР і Саюзам мастакоў рэспублікі, знаёміць шырокага гледача з творчасцю маладых мастакоў В. Альшэўскага, А. Ксяндзова, У. Савіча, М. Селешчука, В. Славука, У. Тоўсціка і Ф. Янушкевіча.

Жывапісныя палотны і графічныя аркушы, сабраныя разам, адлюстроўваюць багаты духоўны свет нашага сучасніка, узнаўляюць аблічча далёкай мінуўшчыны, услаўляюць народны подзвіг у гады цяжкіх выпрабаванняў.

У рамках выстаўкі адбылася сустрэча мастакоў са студэнтамі Мінскага інстытута культуры, а таксама пашыранае пасяджэнне праўлення клуба творчай моладзі г. Мінска.

М. ВАШКЕВІЧ.

●

Рэспубліканская філатэлістычная выстаўка «40 год Вялікай Перамогі», арганізаваная Міністэрствам сувязі БССР і таварыствам філатэлістаў, завяршае работу ў Доме кнігі горада Мінска. Свае экспанаты прадставілі каля 30 калекцыянераў з абласцей і сталіцы рэспублікі. Амаль усе калекцыі адзначаны медалямі, спецыяльнымі прызамі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый ці дыпломамі.

Цікавыя калекцыі мінчан Б. Непарожняга («Пошта ваенных гадоў»), Т. Артамонава («Героі Вялікай Айчыннай вайны»), Б. Малярэнкі («Баявы шлях аднаго з многіх»), Л. Коласава («Пошта Савецкай Беларусі»), магіляўчаніна А. Чысцякова («Масква-80 на замежных марках») і іншых.

В. АСТРЫНСКІ.

●

Увагу шматлікіх наведвальнікаў Дома культуры Барысаўскага завода аўтатрактарнага электраабсталявання імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка прыцягвае выстаўка работ дзіцячай творчасці. На ёй прадстаўлены малюнкі, графіка, жывапіс. Арганізавалі гэты паказ падшэфныя школы і дзіцячая студыя выяўленчага мастацтва, якая нядаўна створана пры Доме культуры завода.

П. БАРОДКА.

●

У фае слуцкага кінатэатра «Цэнтральны» працуе выстаўка мастака-франтавіка У. Садзіна. У экспазіцыі прадстаўлена больш як 20 работ, асноўнае месца сярод якіх займаюць замалёўкі, што былі зроблены аўтарам у незабыўным сорак пятым годзе. Падоўгу спыняюцца наведвальнікі ля работ «Медсястра», «Гвардыі лейтэнант», «На Кёнігсберг», «Залп гвардзейскіх мінамётаў» і іншых.

А. РАМАНОВІЧ.

РУКАПІСНЫ, ЛІТАРАТУРНЫ

Літаратурны гурток Рубяжэвіцкай сярэдняй школы — адзін з лепшых у Стаўбцоўскім раёне. Нядаўна тут выпушчан рукапісны літаратурна-драматычны альманах «Юнацтва неспакойнае», у які ўвайшлі лепшыя творы пачаткоўцаў Вольгі Гарошка, Наташы Казлоўскай, Галі Малейка, Марыі Гурынай, Алены Цішковай. Свае вершы юныя літаратары прысвяцілі роднаму краю, людзям, якія праявілі сябе ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Кіруе гэтым гуртком настаўніца Н. Грыгор'ева.

— Я не стаўлю перад сабой задачы, каб кожны мой выхаванец стаў прафесійным літаратарам. Раблю ўсё, каб школьнікі праз сваё жыццё пранеслі любоў да мастацкага слова, каб яны вучыліся жыць і працаваць на прыкладах літаратурных герояў, — расказвае Нэлі Раманаўна.

Такія літаратурна-драматычныя альманахі выпускаюцца і ў іншых агульнаадукацыйных школах Міншчыны.

К. ПЯТРОВІЧ.

І СТАЎ КАЛЕКТЫЎ АБРАДАВЫМ

Кульмінацыйным момантам ва ўсіх канцэртах і святах, што праходзяць у калгасе «Запаветы Леніна» Жабінкаўскага раёна, сталі выступленні фальклорна-этнаграфічнага калектыву, створанага вясковцамі ў ходзе Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечанага 40-годдзю Перамогі. Вясельныя, жніўныя песні, каларытныя фальклорныя малюнкі ў выкананні даярак Лідзіі Паўлаўны і Веры Рыгораўны Собаль, палявода Я. Яцэвіч, вартаўніка Г. Дарапіевіч і іх аднавяскоўцаў гучаць на святах першага снапа, дажынках, вяселлях гімнам працы, мудрым наказам маладым.

Пад кіраўніцтвам мастацкага кіраўніка калектыву З. Ігнацьевай калгасныя артысты выступалі на свяце ўраджаю ў саўгасе «Беларусь», паказалі сваё мастацтва брастаўчанам на традыцыйным асеннім кірмашы.

Абрадавымі сталі ў раёне яшчэ 12 фальклорных і этнаграфічных калектываў.

М. МІКОЛЬСКІ.

ВІНШУЕМ!

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры, актыўную грамадскую работу і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў пісьменніка ГАУРЫЛКІНА Леаніда Іванавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

РЭПАРТАЖ У НУМАР

УСПОМНІМ КОЖНАГА ПАЙМЕННА...

Наш вечны абавязак перад загінуўшымі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх атрадах і падполлі, знішчаных у канцэнтрацыйных лагерах, расстраляных, павешаных фашыстамі, закатаваных у турэмных засценках... Перад загінуўшымі пісьменнікамі — няменшы, бо тое, што маглі б яны зрабіць на ніве роднай літаратуры, ніхто не дапіша. Нават самаму вялікаму таленту не па сіле спасціжэнне сутнасці чужой задумы. Сапраўды ўжо, творчасць — справа індывідуальная.

Памятаць трэба кожнага пайменна! І спіс гэты — немалы, бо ў ім не адзін дзесятак прозвішчаў: і тых, хто паспеў стаць членам творчага саюза, выдаць першыя кнігі, і журналістаў, якія займаліся літаратурнай творчасцю. У партрэтнай галерэі сярэдняй школы № 150 з музычным (харавым) ухілам беларускай сталіцы — іх дваццаць восем. Змітрок Астапенка, Леанід Гаўрылаў, Алесь Жаўрук, Сямён Ляльчук, Аляксей Коршак, Мікола Нікановіч, Алесь Пруднікаў, Мікола Сурначоў, Генадзь Шведзік, Хвядос Шынклер...

Прозвішчы... Поруч — спецыяльныя стэнды, прысвечаныя творчасці асобных аўтараў. Змешчаны рэпрадукцыі з іх здымкаў, у тым ліку і ваеннага часу, выстаўлены кнігі, якія выходзілі пры жыцці, ці дзякуючы рупнасці сяброў убачылі свет у мірны час, копіі лістоў да блізкіх, крытычныя артыкулы пра творчасць, іншыя матэрыялы, якія даюць уяўленне аб тым, як жылі, працавалі, верылі ў заўтрашні дзень тыя, хто назаўсёды застаўся маладым.

Усё гэта экспанаты школьнага музея «Да штыка прыраўнялі пяро», прысвечанага беларускім пісьменнікам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адкрыццё якога адбылося ў панядзелак. Сабраліся літаратары, вучні і педагогі, прыйшлі і прыехалі ў Мінск родныя і блізкія загінуўшых. Сабраліся, каб пазнаёміцца з плёнам працы школьнікаў і педагогаў, якая працягвалася не адзін месяц.

Ініцыятарам стварэння музея стала настаўніца Д. Гальпер, чалавек, па-сапраўднаму ўлюбёны ў літаратуру, якая шмат робіць, каб прывіць дзецям любоў да прыгожага пісьменства. Дзіяна Рыгораўна пастаянна сочыць за кніжнымі навінкамі, праводзіць з дзецьмі гутаркі аб творчасці вядомых аўтараў. Жаданне сабраць матэрыялы пра пісьменнікаў, якія загінулі ў гады барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, узнікла пасля таго, як адбылася адна з сустрэч з загадчыкам аддзела Цэнтральнага архіва-музея літаратуры і мастацтва БССР А. Балынінай, якая расказала пра матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменнікаў, што захоўваюцца ў гэтай дзяржаўнай установе.

Д. Гальпер далучыла да работы членаў школьнага следапыцкага клуба «Пошук». Звязаліся з роднымі загінуўшых, устанавілі кантакты з Саюзам пісьменнікаў БССР, асобнымі літаратарамі. І, вядома, шмат дапамаглі супрацоўнікі ЦДАМ ЛіМа. Што тычыцца пісьменнікаў, дык ахвотна на просьбу юных аматараў літаратуры і іх кіраўніка адгукнуліся Янка Брыль, Станіслаў Шушкевіч, Ніл Гілевіч, Сяргей Грахоўскі, Галіна Васілеўская, Мікола Гамолка, Варлен Бечык, Эдзі Агняцвет, Аляксей Зарыцкі, Мікола Аўрамчык, Анатоль Вярцінскі...

Плён гэтага супрацоўніцтва — навідавоку. Сярод экспанатаў музея—адзін з тамоў Збору твораў народнага пісьменніка Беларусі Я. Брыля, дзе змешчаны ўспаміны пра паэта Алеся Мілюця, што загінуў ва Усходняй Прусіі. В. Бечык падарыў сваю новую кнігу «Прад высокаю красою...», у якой аналізуецца і творчасць паэтаў-франтавікоў. А гэтая кніга толькі што выйшла ў выдавецтве «Беларусь» — «Летапісцы баявога подзвігу». У ёй апублікаваны і нарыс М. Нікішына «У васьмі кіламетрах ад Берліна...», што расказвае пра М. Сурначова...

На адкрыцці музея выступілі дырэктар СШ № 150 Т. Марціновіч і А. Балыніна. Дырэктар музея, вучань сёмага класа Сяргей Якаўлеў перарэзаў стужку, і пачалася першая экскурсія, якую правяла Д. Гальпер.

Яшчэ адзін музей пачаў сваё жыццё.

А. БЕРАЗОЎСКІ.

Экскурсію праводзіць Д. Гальпер.

Фота Ул. КРУКА.

ЧАТЫРЫ ЎРОКІ МУЖНАСЦІ

Сяброўскія і творчыя сувязі, што склаліся паміж пісьменнікамі Брэстчыны і Валыні, маюць ужо сваю гісторыю. Разам пісьменнікі-суседзі пабывалі ў большасці прыгранічных раёнаў, сустракаліся з рабочымі і калгаснікамі, студэнтамі і вучнямі.

Незабыўныя для кожнага з удзельнікаў паездкі па партызанскіх мясцінах Любяшоўскага і Іванаўскага раёнаў, па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Лесі Украінкі і Якуба Коласа, Аляксандра Гаўрылюка і Міколы Засіма, сустрэчы з народнымі ўмельцамі, фальклорнымі калектывамі.

Сёлета геаграфічныя і, безумоўна, творчыя параметры гэтых літаратурных сустрэч пашырыліся: да нас далучылася Жытомірская пісьменніцкая арганізацыя. Паводле дамоўленасці адказных сакратароў Брэсцкага, Валынскага і Жытомірскага аддзяленняў Саюза пісьменнікаў М. Пракаповіча, П. Маха і А. Апанасюка было вырашана правесці паэтычную вахту памяці ў вёсках, спаленых фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яна прысвячалася 40-годдзю Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй.

На гераічнай брэсцкай зямлі дарагіх украінскіх гасцей цёпла і шчыра сустрэлі У. Калеснік, М. Пракаповіч, А. Каско, З. Дудзюк. Усклаўшы кветкі да Вечнага агню ў крэпасці-героі, украінскія і беларускія літаратары накіраваліся ў былую вёску Драмлёва, што на Жабінкаўшчыне, спаленую фашыстамі, а потым у вёску Картэлісы, што ў Ратнаўскім раёне суседняй Валынскай вобласці, таксама спаленую, але адроджаную пасля вайны.

Далейшы маршрут пралягаў у вёскі Малын Млынаўскага раёна, а таксама Копішча Олеўскага раёна Жытомірскай вобласці. У кожнай з гэтых вёсак прайшлі мітынгі, галоўнымі ўдзельнікамі і слухачамі якіх былі школьнікі. Гучалі вершы на ўкраінскай і беларускай мовах, і ўсе цудоўна разумелі адзін аднаго. Мітынгі прайшлі як своеасаблівыя ўрокі мужнасці. Чатыры ўрокі мужнасці і надзеі на светлае будучае чалавецтва, якое павінна, абавязана прадухіліць новую вайну.

Светлым і трохі сумным было развітанне з украінскімі сябрамі П. Махам, І. Чарнецкім, В. Геем, А. Апанасюком, В. Грабоўскім.

Вярнуўшыся з паездкі, даведаліся, што неўзабаве выйдзе паштоўка, прысвечаная памяці ахвяр вёскі Драмлёва. Падумалася: гэты факт павінен стаць штуршком для стварэння мемарыяльнага музея «Драмлёва». Ён можа размясціцца альбо ў Сцяпанках, цэнтральнай сядзібе калгаса «Усход», альбо ў Жабінцы.

В. САХАРЧУК.

У час сустрэчы літаратараў Брэсцкай, Валынскай і Жытомірскай абласцей са школьнікамі ў вёсцы Сцяпанкі Жабінкаўскага раёна.

Выступае Уладзімір Калеснік.

Фота А. ГАНЧУКА.

ХАРЧОВАЯ ПРАГРАМА: ЗДАБЫТКІ, ПРАБЛЕМЫ...

Ігнат ДУБРОЎСКІ

НА БЫЛЫХ БАЛОТАХ...

(Працяг. Пачатак у № 20).

II

Уладзіміра Іванавіча Бялкоўскага я ведаю даўно. Некалі мы працавалі ў адной установе — Інстытуце земляробства і глебазнаўства, які быў у той час у складзе Акадэміі навук БССР. Гэта чалавек вострага погляду на рэчы і з'явы, з глыбокім адчуваннем іх рэальнага значэння. Гэта рыса характару ярка праяўляецца ў яго смеласці і, можна сказаць, мужнасці як даследчыка. Ён заўсёды выбірае складаныя, рызыкоўныя, у сэнсе нялёгкага атрымання станоўчых вывадаў, тэмы. Так, напрыклад, у тарфяных глебаў праявіліся некаторыя адмоўныя, як кажуць вучоныя, характырыстыкі, што прыносіла земляробству вялікія страты. А плошчы асушаных тарфянікаў штогод павялічваліся ў рэспубліцы на сотні тысяч гектараў. Уладзімір Іванавіч узяўся за вырашэнне праблемы карэннага паляпшэння тарфяна-балотных глебаў. Складаная задачка.

Мне запомнілася такая карціна. Сярэдзіна шасцідзесятых гадоў. Люты месяц. На Палессі ў гэты час ужо добра пахне вясной. Снегу на полі амаль што няма, але зямля, тарфянік Палескай доследнай меліярацыйнай станцыі, яшчэ замёрзлыя. На адзін участак тарфяніку самазвалы возяць пясок і скідваюць яго вялікімі кучамі. Бульдозер разгортвае пясок роўным пластом на пядзю таўшчынёю па паверхні тарфяной глебы. Тарфянік робіцца шэры, як бы прыкрыты суровым палатном.

Гэта доследы Бялкоўскага. На маю цікаўнасць, дзеля чаго гэта робіцца, Уладзімір Іванавіч разгортвае змястоўную праграму свайго доследу.

У многіх аграномаў і нават у некаторых вучоных было ўяўленне аб тарфяна-балотных глебах, як самых высокаўрадлівых і самых лепшых у Беларусі, іх называлі беларускім чарназёмам, нават лічылі лепшымі за чарназём, бо ў іх больш вільгаці, чым у чарназёме. Пад славутым «залатым дном» палескіх балот якраз і разумелі тарфяныя глебы.

Асушаныя тарфянікі вельмі рыхлыя, маюць нізкую аб'ёмную масу — адзін кубічны сантыметр паветранага сухога торфу шмат лягчэйшы за такую ж колькасць мінеральнай глебы. Такая рыхлая глеба хутчэй перасыхае, лёгка ўздымаецца ветрам, узнікаюць вядомыя на Палессі чорныя буры. Сухі распылены тарфянік лёгка загараецца нават ад іскры з выхлапной трубы трактара. Вядома шмат малых і вялікіх пажараў на асушаных палескіх балотах. Тарфянікі — адзіны від глебаў, якія можа знішчыць пажар.

У такой рыхлай глебы, як тарфяная, нізкая, па навуковай тэрміналогіі, нясучая здольнасць паверхні — па ёй цяжка праходзяць машыны, грузнуць і ў сухое, не толькі ў мокрае надвор'е.

Торф дрэнна праводзіць цяпло. Днём паверхня яго награецца да пяцідзесяці-шасцідзесяці градусаў. Расліны вянуць і пры дастатковай яго вільготнасці. Але награецца тарфянік неглыбока, таму ў ночы, асабліва ў халодныя, ён хутка астывае. Цяпло ніжніх пластоў глебы паступае ў верхнія марудна, гэта спрыяе праяўленню замаразкаў на асушаных тарфяна-балотных масівах нават улетку, не кажучы пра вясну і восень. Ураджаі сельскагаспадарчых культур зніжаюцца, а, бывае, некаторыя культуры гінуць ад летніх замаразкаў.

Нізкая цеплаправоднасць тарфянікаў праяўляецца адмоўна і ў тым, што яны вясной позна адтаюць, сяўба на іх зацягваецца, скарачаецца вегетацыйны перыяд, зацягваецца паспяванне культур, а ўвосень яны, культуры, трапляюць пад частыя і моцныя замаразкі.

Не ўсе культуры можна вырошчваць на тарфяных глебах. Набор культур для іх абмежаваны: збожжавыя і шматгадовыя травы. Пад прапашнымі культурамі яны хутка разлагаюцца ад частага варушэння глебы і доступу ў яе кісларода. У тарфяніках шмат насення пустазелля, якое можа захоўвацца ў глебе дзесяцігоддзямі і засмечваць пасевы. Тарфянікі ўтрымліваюць шмат азоту, а гэта вядзе да палягання пасеваў, асабліва злакавых культур, і, вядома, да страт ураджаю. Тарфянікі, якія моцна разлажыліся, ператварыліся ў пыл, робяцца воданепранікальнымі. Павярхоўнымі. Павярхоўныя воды — снегавыя, дажджавыя — застойваюцца ў мікрапаніжэннях паверхні глебы, вядуць да вымакання пасеваў.

— Бачыце, колькі хвароб я налічыў у хвалёных тарфяных глебаў, — кажа Уладзімір Іванавіч. — Вось мы і вядзём доследы, шукаем спосабы, з дапамогай якіх можна будзе пазбавіць тарфяныя глебы ад гэтых хвароб. На ўчастку, які вы бачыце, мы вывучаем пескаванне тарфянікаў, як адзін з такіх спосабаў.

Ён расказвае, што пескаванне тарфяных глебаў праводзіцца ў некаторых заходнееўрапейскіх краінах, напрыклад, у Нідэрландах. Але ж Палессе не Нідэрланды, проста перанесці іх практыку ў нашы ўмовы нельга. Трэба ўсебакова даследаваць гэты прыём у нас.

— Пясок, які разроўніваюць бульдозеры, мы перамешваем дыскавымі баронамі, як адтануць тарфянікі, з ворным гарызонтам торфу. Мінералізацыя тарфяной глебы павінна палепшыць яе якасці.

Уладзімір Іванавіч удакладняе, што замест пяску можна скарыстаць гліну або проста мінеральную глебу.

Доследы Бялкоўскага паказалі, што пескаванне тарфянікаў вылечвае іх ад многіх пералічаных ім хвароб. Тарфяныя глебы робяцца цяплейшымі, радзей на іх пракідваюцца замаразкі, раней адтаюць вясной, лягчэй па іх ідуць глебаапрацоўчыя і ўборачныя машыны, не так часта палягаюць пасевы.

Ужо ў працэсе распрацоўкі метадаў пескавання перад Бялкоўскім узнікла новая, больш важная і больш складаная праблема — разлажэнне торфу. У канцы шасцідзесятых і ў сямідзесятыя гады пра гэта шмат пісалася ў перыядычным друку, шмат гаварылася на навуковых і вытворчых нарадах — як спыніць працэс разлажэння, як захаваць торф. Тарфяны пласт пад пасевамі танчэў, вымываўся найбольш біялагічнай эрозіяй. Не стрымлівала разлажэнне торфу пад пасевамі і пескаванне. Тарфяныя глебы паляпшаліся, але разлажэнне ішло.

Праблема захавання торфу вельмі хвалявала Уладзіміра Іванавіча. «Што станецца з Палессем, калі знікнуць тарфянікі? Як будуць жыць людзі? Пасля тарфянікаў застануцца нізкаўрадлівыя пясчаныя глебы, на якіх ураджаі амаль цалкам залежаць ад метэаралагічных умоў года. Для ўздыму іх урадлівасці запатрабуюцца вельмі дарагія мерапрыемствы». Іншы раз у хваляваннях і думах сваіх ён даходзіў да самаабвінавачвання. «Ты ж працуеш на Палессі, даследуеш якасці і генезіс торфу, імкнешся палепшыць тарфяныя глебы, а што з тваёй работы за карысць, калі яна не спыніць працэсу знікнення торфу? А ці не важней узяцца за пошукі мер захавання торфу на доўгія часы, а можа, і назаўсёды?».

Уладзімір Іванавіч прыйшоў да цвёрдага рашэння — узяцца за распрацоўку мер па спыненні разлажэння торфу, своечасовым захаванні яго на другі час. Спознішся — назад торфу не вернеш.

●

Назаўтра, пасля ад'езду Вялешкі на Гарынь, у Парахонск вярнуўся Бялкоўскі. Мы з ім адразу адправіліся на ўчастак. Уладзімір Іванавіч з паўгадзіны ішоў за трактарам, уважліва наглядаў за работай ворыўнага агрэгата, прыглядаўся, як кладуцца скібы торфу і пяску, пахадзіў па ўзараным полі, у некалькіх месцах раскопваў пясок, правяраў, як глыбока ён засыпае торф. Падышоў да мяне і сказаў:

— Ну вось, мы з вамі наглядаем глыбокае заворванне маламоцных тарфянікаў. Але гэта не простае заворванне. Мы называем яго — меліярацыйнае заворванне. Ідзе вытворчы, звяртаю вашу ўвагу — вытворчы, а не прыродны працэс, — яшчэ раз падкрэслівае Уладзімір Іванавіч, — стварэння новага тыпу глебы. Дакладней— вядзецца трансфармацыя мелкіх тарфянікаў у новы тып глебы. Мы называем іх аргана-мінеральнымі глебамі. Глебы гэтыя складваюцца з дзвюх фракцый: арганічнай — торфу, і мінеральнай — пяску. Давайце прыгледзімся, як заворваецца торф,— і мы зноў ідзём за плугам.

Торф не заворваецца, як звычайна, і не перамешваецца з пяском. Скібы яго не сцелюцца плазам, як у звычайным ворыве і не кладуцца рубам, а ставяцца з нахілам у сорак пяць градусаў. Таксама ставяцца і скібы пяску. Робіцца гэта дзеля таго, каб там, у глыбіні, яны не перамешваліся, а чаргаваліся — пласт торфу, пласт пяску. Ставіць скібы вертыкальна нельга, і торф і пясок структурна рыхлыя, скібы іх будуць разбурацца і перамешвацца.

Пярэдні корпус плуга зразае тарфяны пласт да самага пяску, задні, ніжэйшы корпус, бярэ з глыбіні баразны пласт пяску сантыметраў сорак таўшчынёю і кладзе пясчаную скібу да тарфяной так, што пясок засыпае тарфяную скібу сантыметраў на дзесяць зверху.

— Бачыце, узаранае поле мае выгляд пясчанага, але толькі зверху, — і ён раскопвае пясок, каб паказаць, як глыбока ён прыкрывае торф.

Пясок, які ўкрывае тарфяныя скібы зверху, перамешваецца дыскавымі баронамі з торфам на глыбіню ворыўнага гарызонту — дваццаць—дваццаць пяць сантыметраў. У выніку атрымліваецца аргана-мінеральны ворны слой. Па сваім тыпе новая глеба блізкая да дзярнова-падзолістай, тлумачыць Бялкоўскі. Але не адразу пасля перамешвання торфу з пяском яна робіцца такой. Спачатку трансфармаваная глеба не ўяўляе сабой стабільнай глебы, не мае патрэбнага структурнага стану. Працэс утварэння глебы новага тыпу адбываецца паступова, і з цягам часу яна робіцца блізкай да дзярнова-падзолістых. А такія глебы, як вядома, нядрэнныя. Пры руплівай апрацоўцы іх і багатым угнаенні яны даюць высокія ўраджаі — па сорак і пяцьдзесят цэнтнераў збожжа з гектара. Дзярнова-падзолісты тып глебаў у Беларусі з'яўляецца асноўным.

Каб у мяне склалася больш поўнае ўяўленне аб трансфармацыі мелкіх тарфянікаў, Уладзімір Іванавіч робіць кароткі экскурс у гісторыю ўзнікнення гэтага метаду.

У канцы мінулага стагоддзя вучоныя заўважылі, што асушаныя тарфянікі пад пасевамі, як і ўсе арганічныя рэчывы, разлагаюцца, пласт іх змяншаецца да поўнага знікнення. А гэта значыць, што торф адносіцца да вычарпальных прыродных рэсурсаў, якія не аднаўляюцца. Пачаліся пошукі спосабаў замаруджвання працэсу разлажэння, захавання тарфяной глебы на магчыма доўгі час. Тады і было заўважана ўпершыню, што тарфянікі хутчэй разлагаюцца пад прапашнымі культурамі і марудней пад травамі. Травы стрымліваюць мінералізацыю торфу, магутнай густой каранёвай сістэмай яны ахоўваюць яго ад эразійных працэсаў. Разам з тым, травы ўзбагачаюць тарфяныя, як і ўсе іншыя, глебы каранёвымі астаткамі. Травы пакідаюць у глебе ў дватры разы больш каранёвых астаткаў, чым прапашныя.

— Таму і была рэкамендацыя сеяць на мелкіх тарфяніках пераважна шматгадовыя травы, бо мелкія тарфянікі хутчэй могуць знікнуць, — падкрэслівае Уладзімір Іванавіч.— Але практыка паказала, што на мелкіх тарфяніках травы даюць нізкія ўраджаі зялёнай масы і сена. Прычына? У мелкіх тарфяніках мала вады, а травы вельмі вільгацелюбівыя культуры. У Нідэрландах шматгадовыя травы высіваюць толькі па глыбокіх тарфяніках і накошваюць па восемдзесят—сто цэнтнераў сена з гектара і больш. У працэсе скарыстання тарфяных глебаў выявіліся іх адмоўныя бакі, пра якія мы з вамі гаварылі. У пошуках сродкаў паляпшэння іх узнікла пескаванне тарфянікаў.

Пескаванне тарфяных глебаў пачалося ў заходнееўрапейскіх краінах больш за сто гадоў назад — у Фінляндыі, Нідэрландах, Заходняй Германіі і іншых краінах. У Нідэрландах, напрыклад, усе тарфяныя глебы пяскуюцца ў абавязковым парадку.

Пескаванне, як пазней стала вядома, паляпшае тарфяныя глебы, але не выратоўвае іх ад знікнення. Вучонымі ствараліся ўсё новыя і новыя ідэі па іх доўгатэрміновым захаванні, нястомна вяліся пошукі. Нарэшце быў распрацаваны метад глыбокага заворвання торфу — трансфармацыя тарфяных глебаў, стварэнне глебы новага тыпу на іх аснове.

Першы вопыт глыбокага заворвання торфу быў праведзены ў Заходняй Германіі ў пачатку гэтага стагоддзя на Брэменскай дзяржаўнай доследнай станцыі ў пойме ракі Везер, якая ўпадае ў Паўночнае мора. Дослед даў станоўчыя вынікі, але не знайшоў укаранення. Вытворчасць на яго не адгукнулася. Гэта не вынік абыякавых адносін сельскіх гаспадароў да тарфянікаў. Не было ў той час магутных плугоў, каб узорваць тарфянік на глыбіню да метра. Не было чым і цягнуць такі плуг, не было трактароў.

Сёння заворванне мелкіх тарфянікаў практыкуецца ў многіх краінах Заходняй Еўропы. У Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі трансфармаваных глебаў налічваецца звыш ста пяцідзесяці тысяч гектараў, у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы — каля ста тысяч гектараў.

— Мы з вамі... — нечакана Уладзімір Іванавіч перарывае словы і з радаснай светлай усмешкай уздымае галаву і глядзіць у неба. — Чаплі, — прамовіў ён.

Дзве чаплі, з прытуленымі да плячэй галовамі, паволі ўзмахваючы шырокімі крыламі, плылі ў небе ў заходнім кірунку.

— Як прыгожа ляцяць! Прыемна бачыць. Здаецца, усё наўкол ажывае. Люблю птушак. То яны кіруюцца да Пагосцкага возера, да рыбнай гаспадаркі. Асушылі балоты, знішчылі іхнюю кармавую базу, вось яны і падсуседзіліся да рыбнай гаспадаркі. Ну, ладна. Пра што гэта мы з вамі? Ага, я вам расказваў пра тэхнічны бок трансфармацыі мелкіх тарфянікаў у аргана-мінеральныя глебы. Працэс жа рэканструкцыі тарфянікаў вельмі складаны.

Далей ён кажа, што працэс стварэння аргана-мінеральнай глебы вывучае цэлая брыгада пад яго кіраўніцтвам і называе сваіх паплечнікаў. Акадэмік Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна Анатоль Іванавіч Мурашка, дырэктар Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага скарыстання водных рэсурсаў, вывучае водны рэжым рэканструяваных глебаў. Мікалай Мікалаевіч Бамбалаў, навуковы супрацоўнік Інстытута торфу, хімік-арганік, займаецца прагнозам захавання заворанага торфу. Тамара Гардзееўна Зіменка, супрацоўнік Інстытута мікрабіялогіі, даследуе мікрабіялагічныя працэсы ў новай глебе. Тэхнічную аснову трансфармацыі — вызначэнне неабходнай тэхнікі і нават стварэнне яе — забяспечваюць навуковы супрацоўнік Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Пётр Пятровіч Казакевіч і вядучы інжынер лабараторыі механізацыі Беларускага навукова-даследчага інстытута меліярацыі і воднай гаспадаркі Уладзімір Паўлавіч Авешнікаў. Практычным скарыстаннем трансфармаваных глебаў, укараненнем метадаў трансфармавання мелкіх тарфянікаў у калгасах і саўгасах ведае супрацоўнік таго ж інстытута Юрый Анатольевіч Моргаль.

— Брыгада, як бачыце, салідная, але і работа не простая. І ўсе працуюць шчыра, з вялікай цікавасцю, з высокім усведамленнем важнасці даследавання.

Пра сваю ролю Уладзімір Іванавіч нічога не кажа. Мне добра вядома ад некаторых членаў брыгады, што яго воля, сіла і веды, да гэтага яшчэ і асабісты прыклад, натхняюць, з'ядноўваюць, вядуць калектыў на вырашэнне складанай і надзённа важнай праблемы, можна сказаць — выратавальнай для ўсяго Палескага краю.

(Заканчэнне будзе).

Да 80-годдзя з дня нараджэння М. А. Шолахава

Магутны, шчодры талент

Іван НАВУМЕНКА

На маёй паліцы стаяць вельмі дарагія для мяне кнігі — тры ёмістыя, у зялёна-сіне-светлых вокладках тамы «Ціхага Дона» і афармленая ў зеленавата-белы колер першая кніга «Узнятай цаліны». «Ціхі Дон» (чацвёртая кніга па-беларуску не выходзіла) пераклаў з рускай мовы вядомы паэт Уладзімір Хадыка, рэдагаваў Барыс Мікуліч, усе тры тамы ўбачылі свет у 1936 годзе.

«Узнятая цаліна» з'явілася на два гады раней і прозвішча перакладчыка на тытульным лісце не пазначана, вядома толькі, што рэдактарам рамана быў Платон Галавач.

«Ціхі Дон» выпушчан небывалым па тым часе тыражом — 15185 экземпляраў. Кнігі Шолахава такім чынам дайшлі да самых сціплых сельскіх бібліятэк. Так, маё пакаленне школьнікаў у свае дванаццаць-трынаццаць гадоў сустрэлася з Шолахавым.

«Ціхі Дон» узрушыў незвычайна. Гэта было падобна да цуду. Штосьці незнаёмае, прыцягальнае, агромністае ўваходзіла ў душу, хвалюючы свядомасць, трывожачы пачуцці.

Пазней, перачытваючы Шолахава, стараючыся разабрацца ў тайне «Ціхага Дона», я думаў пра тое, што нават юны чытач, нягледзячы на свае вельмі малыя веды пра свет, жыццё, здольны адчуць вялікае і трагічнае. Нават для дзіцячага ўспрымання Шолахаў шмат чаго даваў, прымушаў хвалявацца, смуткаваць, радавацца, з неаслабнай увагай сачыць за лёсам ягоных герояў.

Маё пакаленне ўваходзіла ў жыццё праз школу і кнігі. Відаць, з прычыны вядомых сацыяльных працэсаў, якія адбываліся ў краіне пасля рэвалюцыі, мы рыхтаваліся стаць інтэлігентамі: настаўнікамі, аграномамі, урачамі, інжынерамі, некаторыя песцілі мару стаць вайсковымі камандзірамі. Але жылі мы, выхоўваліся, па сутнасці, у народным, пераважна сялянскім асяроддзі, змалку былі блізкія да зямлі, ведалі, што такое ўсход і захад сонца, раса на траве, касавіца і жніво, пах свежаспечанага хлеба, рана прылучаліся да працы.

Таму, відаць, выпадак з чытаннем «Ціхага Дона» ў пачатковай школе неяк можна вытлумачыць: побыт, норавы, сама стыхія народнага жыцця, якое малявалася вялікім пісьменнікам, былі знаёмыя, збольшага зведаныя нават у дзяцінстве, хоць далёка, скажам, ад Дона да міжрэчча Прыпяці і Дняпра.

Міхаіл Шолахаў — мастак дзіўны, мастак, які спалучае ў сабе вастрыню сацыяльнага зроку і непераўзыдзены дар псіхолага, гумарыста, пейзажыста, знаўцу казацкага побыту, выдатна адчувае рускае і дыялектнае, казацка - ўкраінскае слова ва ўсіх яго сэнсавых і эмацыянальных адценнях.

У жыццё і ў літаратуру Шолахаў прыйшоў вельмі рана. Будучаму аўтару «Ціхага Дона», сыну «іншагародняга» і казачкі, было ўсяго дванаццаць гадоў, калі грымнула Кастрычніцкая рэвалюцыя, шаснаццаць — калі закончылася грамадзянская вайна на Доне. У дваццаць гадоў ён ужо пісаў сваю вялікую кнігу— эпас новага сацыялістычнага свету, што нараджаўся ў пакутах і барацьбе. Пісаў, грунтуючыся на ўласным веданні жыцця і давяраючы толькі гэтым ведам. Якая агромністая работа думкі і сэрца стаяла за кожным радком, напоеным усімі фарбамі, пахамі казацкага жыцця, за кожным паваротам сюжэта, які сплавіў у сабе мноства самых разнастайных чалавечых лёсаў, раскрываў сацыяльную, рэвалюцыйную сутнасць працэсаў, якія выяўляліся перш за ўсё праз чалавечыя характары. Як моцна трэба было любіць чалавека, народ, родную зямлю, каб здзейсніць гэты тытанічны подзвіг!

Як пісьменнік, я ведаю, што пафас твора, яго асноўную глыбінную ідэю нараджае любоў да роднай зямлі. Кожны, асабліва ў дзяцінстве, юнацтве, зведаны куток выклікае своеасаблівы настрой, які потым, калі садзішся пісаць, перарастае ў адпаведную музыку, у тое, што тэарэтыкі называюць стылем. Гэты настрой падобны да стану, які бывае ў закаханага, таму падрабіць яго нельга. Гэта святое трапятанне душы, уражанай прыгажосцю свету і таямніцамі, якія ў гэтай прыгажосці адкрываюцца. Добра, што Шолахаў напісаў «Ціхі Дон» у маладым узросце, калі яшчэ не растрачаны сілы душы, здольнай да самага глыбокага перажывання. Нават перарваўшыся для «Узнятай цаліны», таксама выдатнага твора, насычанага той жа сыноўняй любоўю да роднага стэпу, ён здолеў ад першай да апошняй кнігі пранесці замілаванне да роднага краю, узняўшы заключную частку эпапеі на высокую трагічную ноту.

Маладосць відушчая. Многія вялікія творы сусветнай літаратуры напісаны іх аўтарамі, калі яны былі вельмі маладыя. З айчыннай літаратуры ў гэтай сувязі варта ўспомніць Пушкіна і Лермантава. Янка Купала напісаў «Курган» у дваццаць восем гадоў, а «Паўлінку» — у трыццаць.

Многае здзіўляе ў «Ціхім Доне». Можна адносна лёгка зразумець, чаму так дакладна Шолахаў выпісаў казацкі побыт, норавы, характары — сам жыў у станіцы, няхай сабе і на становішчы іншагародняга. Але вось ён апісвае сям'ю купца Мохава, памешчыка Лісніцкага, салдацкі, афіцэрскі побыт у акопах і зямлянках першай сусветнай вайны, г. зн. карціны і псіхалагічныя з'явы, якіх непасрэдна не бачыў і не мог бачыць. Адкуль жа дасведчанасць і дакладнасць у паказе гэтых невядомых пісьменніку пластоў жыцця?

Тут мы маем справу са здольнасцю геніяльнага мастака паглыбіцца, улавіць дух той ці іншай эпохі, часу.

Міхаілу Шолахаву спявала рэвалюцыя. Яе ідэю ён успрыняў амаль у дзіцячым узросце, і менавіта яна дапамагала яму разгледзець тое, што рабілася ў самых разнастайных станах і лагерах напярэдадні і ў час грамадзянскай вайны. Вядома, маладому пісьменніку свяціў вопыт асабістага ўдзелу ў барацьбе з контррэвалюцыяй — ён быў прадатрадчыкам і чонаўцам,— шмат у чым дапамагалі расказы былых казакоў, якія ўдзельнічалі ў імперыялістычнай і грамадзянскай войнах, архіўныя дакументы, сведчанні. Але вызначальным у тытанічным творчым акце, які ён здзейсніў, быў магутны талент, прыродная здольнасць слухаць і разумець рэвалюцыю. Відаць, не станем мы спрачацца наконт таго, што было шмат іншых людзей, якія больш за Шолахава бачылі схватак і боек рэвалюцыі, аднак жа «Ціхага Дона» не напісалі.

Хачу сказаць яшчэ аб тым, што пісьменнікам, якія прыходзяць у літаратуру ўслед за такімі магутнымі талентамі, як Шолахаў, нялёгка працаваць. Сілавое поле прыцягнення такіх талентаў надзвычай адчувальнае, і, каб захаваць творчую самастойнасць, уласную арбіту, таксама трэба немалыя сілы.

У «Ціхім Доне» Шолахаў бліскуча, напрыклад, абмаляваў, раскрыў тры жаночыя тыпы — Наталлі, Аксінні і Дар'і, якія па сваёй чалавечай прыродзе вельмі многае гавораць увогуле пра жанчын, пра жаночае каханне. Пасля Шолахава адкрыць у народным асяроддзі тыпы падобнай велічы, сілы, страсці стала проста немагчыма. Ва ўсякім выпадку, у бліжэйшым гістарычным абсягу.

Міхаіл Шолахаў глыбока ўспрыняў гуманістычныя запаветы класічнай рускай літаратуры, якая вучыла бачыць чалавечае ў чалавеку. Некаторыя пісьменнікі захапляюцца ў апошні час так званай сітуацыяй «выбару». Прычым выбар свой іхнія героі робяць, як кажуць, «пад заслону». Што адбылося з героямі пасля таго, як яны зрабілі рашучы, няправедны крок, мы не ведаем. Але, ідучы такім шляхам, можна прыйсці да непажаданых вынікаў, якія мяжуюць з нявер'ем у чалавека, у яго духоўныя сілы і магчымасці.

Як існуе літаратура, чалавек у ёй няўхільна робіць выбар паміж дабром і злом, сіламі цемры і прагрэсу. Праблему выбару ў шырокім разуменні слова ўвасабляюць вобразы Дон-Кіхота і Санча Пансы, Фаўста і Мефістофеля, П'ера Бязухава і Анатоля Курагіна, Алёшы і Івана Карамазавых.

«Пісьменнік ярка рускі, савецкі па праблемах, па ўсяму ладу свайму, Шолахаў разам з тым належыць сусветнай літаратуры. Адзін з буйнейшых мастакоў сучаснасці, ён, безумоўна, пісьменнік сусветнага значэння і сусветнага ўплыву...».
(І. МЕЛЕЖ).

Грыгорый Мелехаў у «Ціхім Доне» таксама робіць выбар. Гісторыя яго кіданняў паміж двума варожымі станамі якраз і вызначае асноўны стрыжань шолахаўскай эпапеі. Прырода адчайнай мітусні Грыгорыя зразумелая: за ёй стаяць шматлікія сацыяльныя і іншыя складаемыя незвычайнай, у многіх адносінах выдатнай, яркай натуры. Мы не можам ненавідзець Грыгорыя перш за ўсё таму, што добра яго разумеем. Наадварот, мы спачуваем яму, шкадуем, бачачы, як траціцца чалавечае ў чалавеку, як завельмі позна дасягае герой жаданага берага. У дадзеным выпадку абставіны, прывітыя звычкі мацней за чалавека — і нараджаецца трагедыя. Але ў шолахаўскай трагедыі гучыць магутны аптымістычны акорд: рэвалюцыя рабілася менавіта для такіх, як Грыгорый, ды дарога яе была крывавая, жорсткая, і не ўсе маглі знайсці правільны жыццёвы кірунак.

Шолахаў вучыць нас любіць чалавека, верыць у яго сілы, магчымасці, у высокае яго прызначэнне, у тое, што ўсё ён адолее і пераможа, якія б цяжкія выпрабаванні ні стаялі на яго шляху.

Мне здаецца, што ў рускай літаратуры за ўсю яе гісторыю было не шмат пісьменнікаў, у якіх бы так цесна, непарыўна, як у Шолахава, зліваліся ў адно глыбокі псіхалагізм і непасрэднасць пачуццяў, гістарызм, сацыяльнасць і свежасць паэтычнага погляду на жыццё. У кнігах Шолахава, як і ў самім жыцці, смешнае суседнічае з вялікім, трагічнае з камічным. Пісьменнік аднолькава яркі, непаўторны і ў перадачы паўсядзённай плыні жыцця, і ў адлюстраванні выключных, пераломных момантаў чалавечага быцця.

Поўнай цудоўных чараў паўстае перад намі з кніг Шолахава данская зямля — раздольны стэп з усходамі і заходамі сонца, разлівам траў, буяннем кветак, спевам птушак, з яго буднямі і святамі.

А якая агромністая галерэя чалавечых твараў і характараў жыве, радуецца, сумуе на старонках гэтых кніг! Герояў не зблытаеш аднаго з другім, няхай гэта фігуры першага плана ці персанажы эпізадычныя, якія мільгнулі перад намі на адно імгненне. У кожнага з іх свая манера адчуваць, перажываць, гаварыць, свой непаўторны чалавечы твар.

Вырасшыя на берагах ціхага Дона героі Міхаіла Шолахава належаць усяму чалавецтву. Грыгорый Мелехаў, Аксіння, Наталля, Дар'я, Давыдаў, Макар Нагульнаў, дзед Шчукар — у шэрагу вобразаў сусветнага гучання. Пісьменнік вострай сацыяльнай тэмы, непарыўна звязаны са сваім часам, сапраўдны гуманіст, Шолахаў востра адчуваў непераходзячае значэнне духоўных чалавечых каштоўнасцей.

Не шмат знойдзецца ў сусветнай літаратуры такіх шчымлівых, узвышана-трагічных малюнкаў кахання, як у кнігах Шолахава. У нас многа пісалі пра блізкасць Шолахава да Талстога, і гэта справядліва. Але, думаецца, яшчэ бліжэй Шолахаў да Пушкіна — па ахопе жыцця, па здольнасці адчуваць яго багацце і разнастайнасць, па пачуцці гістарычнай Радзімы.

Шолахаў, як і Пушкін, пасапраўднаму народны. Таму такімі простымі і, акрамя ўсяго іншага, даступнымі нават дзіцячаму, юнацкаму ўспрыманню, здаюцца яго творы. Гэта прастата геніяльнасці, якая гэтак шчодра дорыць нам шчасце, радасць і смутак глыбіннага ведання свету, гісторыі і чалавечых душ.

МУДРЫ НЕСМЯРОТНЫ ГОЛАС

Добра памятаю тое ашаламляльнае ўражанне, якое аказаў на мяне раман Міхаіла Шолахава «Ціхі Дон». Ён ускалыхнуў душу, адкрыў вачам і сэрцу яркі ярасна-трывожны мацярык народнага жыцця, мацярык барацьбы, болю і надзеі. Героі Шолахава прыходзілі ў мае сны, размаўлялі са мною, вучылі мяне. Добра памятаю і пытанне, якое ўзнікла тады ж: чаму пісьменнік назваў Дон, сваю родную любімую раку, ціхім? Такія бітвы грымелі над гэтымі берагамі, так звонка скрыжоўвалася сталь шабляў, так адчайна крычалі людзі, іржалі параненыя коні, і раптам Дон — ціхі. Славянскія рэкі ніколі не былі ціхімі. І Дон, і Нёман не адзін раз чырванелі гарачай людской крывёю. Але ж вялікі Шолахаў не мог памыліцца і не памыліўся, назваўшы Дон ціхім, абраўшы эпіграфам да несмяротнага рамана старадаўнія казацкія песні, у якіх ёсць такія шчымлівыя словы: «Ой ты, наш бацюхна ціхі Дон!» Народ назваў казацкую раку ціхай, напэўна, таму, што, упёкшы ад прыгоннага рабства на паўднёвае парубежжа Рускай дзяржавы, асталяваўшы тут свае станіцы, жадаў толькі аднаго: мірнай працы і ціішыні.

У 1970 годзе ў станіцы Вёшанскай Міхаіл Аляксандравіч Шолахаў адказваў на пытанні карэспандэнта газеты «Комсомольская правда». Карэспандэнт спытаў: «Агульнавядома, што вы жывяце і працуеце сярод сваіх літаратурных герояў. Што вас звязвае з гэтым краем, якімі каранямі вы зрасліся з гэтай зямлёю, з гэтымі людзьмі?»

Вось што адказаў Шолахаў: «Я нарадзіўся на Доне, тут рос, фарміраваўся як чалавек і пісьменнік і выхоўваўся як член нашай вялікай Камуністычнай партыі. Я вырас у асяроддзі працоўнага казацтва, таго, якое потым у гады грамадзянскай вайны называлі чырвоным за падтрымку Савецкай улады.

Шлях маіх землякоў да сённяшняга жыцця складаны, пакутлівы... Казацтва нарадзіла такіх вялікіх бунтароў супроць царскага самаўладдзя, як Сцяпан Разін і Емяльян Пугачоў. У гады рэвалюцыі частка казацтва, падманутая генераламі, была ўцягнута ў братазабойчую вайну з працоўным рускім народам. Зразумеўшы сваю памылку, казацтва адышло ад белага руху.

Амаль пяцьдзесят гадоў я быў сведкам таго, як яно ўрастала ў сацыялізм. Раслі дзеці, рабіліся калгаснікамі, аграномамі, урачамі, настаўнікамі... Частка гэтага жыцця, гэтага абнаўлення — у маіх творах. І, будучы патрыётам сваёй магутнай Радзімы, з гордасцю кажу, што з'яўляюся патрыётам свайго роднага Данскога краю».

Сівер і сонцапал жыцця зведаў вялікі пісьменнік, прайшоў нялёгкімі трывожнымі пуцявінамі, каб падарыць свайму народу і ўсяму чалавецтву геніяльныя па мастацкай сіле, па сіле ўздзеяння на чытача творы. «Ціхі Дон» — гэта Іліяда XX стагоддзя, вяршыня сучаснай рэалістычнай прозы. Жыццё народа паказана тут на крутым і крывавым пераломе, у ярасных сутыкненнях моцных, як граніт, характараў, у самаахвярным пошуку дабра, справядлівасці і любові. І разам з тым гэта найтанчэйшая і найлірычнейшая цёплая проза, гімн вясковаму воблаку і зялёна-залатому стэпу, гімн зямлі, на якой жывуць, пакутуюць і кахаюць прыгожыя людзі. Хіба можна, пазнаёміўшыся аднойчы, забыць Грыгорыя Мелехава і Аксінню, Бунчука і Дар'ю, Давыдава і Лушку, дзеда Шчукара і Нагульнава?

Сіла Шолахава ў народнасці ягоных твораў. Казак Грыгорый Мелехаў і салдат Андрэй Сакалоў, гордая Аксіння і смяшлівая Лушка — дзеці народа, крывінка і сляза народная. Такіх герояў нельга выдумаць і загадзя сканструяваць, нельга ўдыхнуць імітацыю жыцця ў нежывыя гліняныя фігуры. Такія героі прыходзяць на старонкі вялікіх кніг з віхуры дзён, з грому бітваў, і гарачае сэрца б'ецца ў іхніх грудзях.

Будучы сынам народа, Шолахаў па-сыноўняму любіў родны народ, родную савецкую зямлю. Вось дзве ягоныя тэлеграмы:

«Тэлеграма на імя Маршала Савецкага Саюза т. Цімашэнкі.

Дарагі таварыш Цімашэнка! Прашу залічыць у фонд абароны СССР прысуджаную мне Сталінскую прэмію першай ступені. Па Вашаму закліку ў любы момант гатоў стаць у шэрагі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і да апошняй кроплі крыві абараняць сацыялістычную Радзіму. Палкавы камісар запаса РСЧА пісьменнік Міхаіл Шолахаў. 1941 год».

«Маім землякам.

Прыбыўшы на родную зямлю, рады паведаміць дарагім станічнікам, што будаўніцтва новай школы ў станіцы Каргінскай па рашэнні Савета Міністраў РСФСР пачынаецца ў гэтым годзе. Атрыманая мною Ленінская прэмія цалкам перададзена на будаўніцтва новай школы замест той, у якой калісьці даўно я вучыўся грамаце.

Моцна абдымаю ўсіх каргінцаў. Ваш Міхаіл Шолахаў. 1960 год».

У гэтых тэлеграмах увесь Шолахаў, патрыёт, чалавек вялікага шчодрага сэрца. Ён пайшоў ад нас, але шуміць данская хваля, звініць стэпавая трава, жывуць, вучаць людзей ягоныя кнігі. Мудраму несмяротнаму голасу вялікага чалавекалюба ляцець праз стагоддзі.

Леанід ДАЙНЕКА.

МАШТАБ УЗДЗЕЯННЯ

Да 80-годдзя з дня нараджэння М. А. ШОЛАХАВА

У кожнага юбілею свой змест, сваё значэнне. Аднак нельга не заўважыць такую асаблівасць юбілеяў: калі яны прыжыццёвыя, найперш прызначаюцца самому юбіляру, каб выказаць яму ўвагу, засведчыць пашану і, так сказаць, заахвоціць яго на далейшае; калі ж «пазажыццёвыя», пасмяротныя — пэўна, больш важныя тым, хто іх адзначае, нам самім як нагода (асабліва патрэбная і карысная ў наш імклівы час) прыпыніцца, азірнуцца, задумацца. І пра юбіляра, і пра сябе.

Асаблівы сэнс гэта мае ў дачыненні да 80-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Аляксандравіча Шолахава — пісьменніка, якога нядаўна ад нас забрала смерць, але які і пры жыцці адсвяткаваў не адзін юбілей і які меў усенароднае, сусветнае прызнанне не толькі ў час святкаванняў.

Больш як паўстагоддзя таму назад звярнуў ён увагу ўсяго цывілізаванага чалавецтва на сябе і на савецкае мастацтва і ўвесь гэты час з гонарам нёс высокае званне савецкага Чалавека, Грамадзяніна, Пісьменніка. Не знайсці, мабыць, такога кутка на зямлі, дзе б яго не ведалі, не прызналі ягонай велічы. Вось як ацэньваюць яго ў розных краінах свету: «вялікі пісьменнік» (Ч. Сноў, Англія), «вялікі мастак» (К. С. Прычард, Аўстралія), «вялікі пісьменнік зямлі» (Харбаян Сінгх, Індыя), «вялікі пісьменнік нашага часу» (Я. Івашкевіч, Польшча), «выдатны пісьменнік» (А. Труая, Францыя), «легенда ўжо пры жыцці» (М. Ларні, Фінляндыя), «незвычайны чалавек і вялікі пісьменнік» (Б. Чопіч, Югаславія). Падобных характарыстык надзвычай многа, але справа не ў іх колькасці, а ў тым, што яны паказваюць аднадушнасць успрымання М. А. Шолахава як з'явы велічнай, фенаменальнай.

Роўных Шолахаву цяжка знайсці ў сучаснай сусветнай культуры, ды і гісторыя ведае такіх нямнога. Нячаста нараджаецца той, каму наканавана стаць маяком цэлай эпохі ў гісторыі культуры і грамадства ўвогуле, увасабляльнікам гістарычнай свядомасці свайго народа і многіх народаў свету, прычым у надзвычай адказны, вырашальны для чалавецтва перыяд.

Р. Канавалаў пра Шолахава не выпадкова сказаў: «Ён — сацыяльны, духоўны і паэтычны змест XX стагоддзя ў самых рашаючых падзеях рэвалюцыі».

Што ж дало падставы для такой высновы, што абумовіла правамернасць у дачыненні да Шолахава такіх азначэнняў, як класік, гігант і нават геній — званні, якое не можа быць прысвоена ніякім указам, якое ўжываецца вельмі асцярожна, рэдка?

Тое, што ён надзвычай рана ў неймаверна складанай і адказнай гістарычнай сітуацыі зразумеў сваё прызванне і самааддана рэалізоўваў яго: даць чалавецтву «творы такога ж значэння, як і сама барацьба», прыняць на сябе абавязак судзіць жыццё з вышыні гісторыі.

Тое, што знайшоў адзіна магчымыя, адпаведныя прызванню, свае жыццёвы лад і шлях, пазіцыю і творчыя прынцыпы. А накірунак, які ён мудра, дальнабачна выбраў і пракладаў, пазней дзякуючы яму стаў магістральным шляхам развіцця ўсёй савецкай літаратуры.

ЯКУБ КОЛАС І КНІГА

З аўтабіяграфіі Якуба Коласа вядома, што яго бацька меў невялікую адукацыю, але ўмеў чытаць па-руску і па-польску, разбіраў нават і рукапіс. У сям'і былі яшчэ два дзядзькі — Пятрусь і Антось, — людзі пісьменныя. Пятрусь, старэйшы бацькаў брат, у свой час быў пісарам на вайсковай службе, любіў чытаць кнігі, разбіраўся ў іх, наогул шанаваў кнігу. Ён падарыў пляменніку Костусю кнігу «Месіяда» Клапштока, нямецкага паэта XVIII стагоддзя.

Дзядзька Антось — малодшы брат Коласавага бацькі — скончыў пачатковую школу. Гэта ён выхаваў у Коласа шчырую прыхільнасць да кнігі і, асабліва, да баек Крылова. Дзядзька Антось купіў Костусю поўны збор ягоных баек, і той вывучыў іх на памяць. Пазней ён напіша, што «з гэтымі творамі вялікага генія... доўгія гады не разлучаўся». У пісьме да крытыка і публіцыста Клейнбарта Колас паведаміць: «Я многа чытаў. Выдатныя пісьменнікі і паэты— Пушкін, Лермантаў, Гогаль, Кальцоў, Дастаеўскі былі мне знаёмы з чытання. «Браты-разбойнікі» Пушкіна я ведаў на памяць, на памяць ведаў і «Дэмана» Лермантава. З празаікаў найбольшае ўражанне выклікаў у мяне Гогаль сваім магутным і дакладным стылем... З дзесяці гадоў быў пастухом. Са мной неразлучна былі і кнігі ў пастуховай сумцы. Увогуле я шмат чытаў. Кнігі атрымліваў у знаёмых. Часам прадпрымаў цэлыя экскурсіі ў вышукоўванні кніг. Трапляліся мне раманы замежных пісьменнікаў. Шмат кніг здабываў мне бацька, якога я часта турбаваў сваімі просьбамі то купіць, то спытацца кніг у якога-небудзь пана». Падрослы, Колас чытае і захапляецца творамі Талстога, Някрасава, Чэхава, Цютчава, Нікіціна, Тургенева. Гэта з рускіх. Чытае Тараса Шаўчэнку, Адама Міцкевіча, іншых украінскіх і польскіх пісьменнікаў. У яго была выдатная памяць. Да канца жыцця ён мог на памяць чытаць амаль усе байкі Крылова, вялікія урыўкі з твораў Пушкіна, Лермантава, Някрасава і іншых любімых ім паэтаў. Часам любіў (вядома, жартуючы) цытаваць радкі з Бібліі.

Яму была добра вядомая і замежная класіка. Бальзак, Гюго, Мапасан, Мальер, Стэндаль, Флабэр, Гётэ, Шылер, Гейнэ, Келерман, Шэкспір, Дзікенс, Тагор, Гамсун... Яго жыццё немагчыма ўявіць без чытання кніг. Вось, напрыклад, што пісаў ён з Мінскага астрога ў 1909 г.: «Самае вялікае зло — адсутнасць кніг. З волі не атрымліваюцца. У турэмнай бібліятэцы ёсць крыху, але чытаць іх няма ніякага жадання. Ёсць толькі некалькі часопісаў за мінулыя гады, а астатняя публіка — найдурныя раманы. Даўно ўжо была ў нас свежая кніга. Утварылася нейкае затхлае, стаячае балота. У мяне ў Мінску ёсць дзве кнігі Гекеля (яны былі ў Вас), але той хлопец, які ўзяў іх у мяне да суда і абяцаў вярнуць іх у пераплёце, не падае аб сабе ніякіх прыкмет быцця. Я не ведаю, што зрабіць, каб атрымаць Гекеля. Чорт з ім ужо, з пераплётам. Ламаю сваю аголеную галаву і ўзлахмачаную бараду, каб знайсці спосабы дастаць свае кроўныя кнігі. Няма на волі паблізу людзей, якія б маглі ўладкаваць справу з кнігамі...»

Як бачым, адсутнасць кніг была самай большай пакутай для Коласа ў час зняволення.

Мае першыя ўспаміны пра жыццё і свет прыпадаюць на 1918—1920 гг. (я сам 1914 г. нараджэння). Мы жылі тады на Куршчыне, у вёсках непадалёку ад горада Абаянь. Жылося вельмі цяжка, часам не было чаго есці, але кнігі былі. Памятаю кнігу Каміля Фламарыёна «Популярная астрономия», кухонную кнігу Малахавец з багатай рэцэптурай разнастайных страў і, вядома, кнігі Пушкіна. Чытаць я навучыўся рана — мне не было яшчэ і пяці гадоў. Але ж бацька і маці былі настаўнікамі. Я пытаўся, як гучыць тая ці іншая літара, і так навучыўся чытаць. Ведаў тады на памяць «Казку пра цара Салтана» Пушкіна. Сяляне вёскі Якаўлеўка, у большасці непісьменныя людзі, былі вельмі здзіўлены, калі я, зусім маленькі хлопчык, чытаў на памяць такі вялікі твор. Аднойчы прачытаў гэта ў сям'і аднаго багацея і мяне пачаставалі смачным абедам.

Пасля прыезду ў Мінск, у 1921 годзе, пачала стварацца бібліятэка ў нашай сям'і. Яна была не вельмі вялікая: адчуваўся недахоп і сродкаў, і плошчы. Ды і не было тады і духу бяздумнага збіральніцтва, так званай «прэстыжнасці». Але ўсё ж было шмат цікавых кніг. Мне помняцца багата афармленыя ў выданні Бракгаўза-Эфрона, шматтомнікі Шэкспіра, Шылера, Пушкіна, творы Лермантава, Талстога, Някрасава, Гогаля, Шаўчэнкі, Барбюса, Келермана, Тагора, Гамсуна, многіх іншых пісьменнікаў, гісторыя Расіі Кастамарава, шыкоўныя навукова-папулярныя выданні «Вселенная и человечество» ў 5 тамах, «Мужчина и женщина» ў 3-х тамах і шмат яшчэ якія цікавыя кнігі.

Бібліятэка беларускай кнігі складалася перш за ўсё з кніг самога Коласа, яго паплечнікаў і сяброў — Янкі Купалы, Максіма Гарэцкага, Цішкі Гартнага, Змітрака Бядулі, пазней — і больш маладзейшых калег. Амаль усе гэтыя кнігі былі з цёплымі прысвячэннямі Коласу ад аўтараў. Значнае месца займала навуковая літаратура.

Колас быў адным са стваральнікаў Інбелкульта (з 1929 г. Акадэмія навук БССР). Творы Маркса, Энгельса, Леніна (многія з іх на беларускай мове) стаялі на паліцах Коласавай бібліятэкі. Як вядома, ён прымаў удзел у перакладзе на нашу мову многіх твораў класікаў марксізму-ленінізму. Меліся таксама літаратурныя і навуковыя часопісы, газеты, віншавальныя адрасы з нагоды 20-годдзя, 30-годдзя творчай дзейнасці народнага паэта і 50-годдзя з дня яго нараджэння. Гэтыя даты былі шырока і ўрачыста адзначаны ў нашай рэспубліцы ў 1926, 1932 і 1936 гадах. Было мноства пісем, цікавых зместам тэлеграм ад шматлікіх сяброў пісьменніка. Помніцца паштоўка-прывітанне ад Паўла Рыгоравіча Тычыны з Новым 1929 годам, якая была

Звычайна пры разглядзе творчасці М. А. Шолахава як галоўнае вылучаецца тое, што ён адлюстраваў найважнейшыя моманты гісторыі нашай краіны. Але ці ж у гэтым толькі справа? Як слушна адзначае вядомы рускі шолахавазнавец А. Хватаў, «...мастакоўская прычыннасць Шолахава да падзей грамадзянскай вайны і калгаснага руху ніяк не вычэрпвае таго, што мы называем светам пісьменніка. Тая самая тэма была здабыткам многіх, ды далёка не многія, звяртаючыся да яе, сказалі пра «свет і чалавека» тое, што сказана ў «Ціхім Доне» і «Узнятай цаліне».

Шолахаў як ніхто іншы заслужыў характарыстыкі — народны пісьменнік, мастак-летапісец, мастак-гісторык.

Ён таму і прымаў на павер ніякіх «актуальных» дэкларацый, заклікаў, патрабаванняў, не прызнаваў абвінавачванняў і прысудаў, калі яны ішлі не ад народа, калі не выяўлялі волі гісторыі.

Звернем увагу: пра Шолахава нельга сказаць, як звычайна, што ён «звязаны з народам». Ён ад народа неаддзельны, неадрыўны, аднаго з ім жыцця, аднаго ладу. Не ўсё можна растлумачыць, звесці да вядомых велічынь, але недзе тут хаваецца галоўнае — тое, што вызначае пазіцыю пісьменніка, а таксама і значэнне яго творчасці на розных узроўнях успрымання.

Даўно і трывала Шолахаў увайшоў у працэс культуры Беларусі. Як сведчаць многія сучаснікі, з'яўленне кожнага з шолахаўскіх твораў у цэнтральных выданнях станавілася падзеяй культурнага жыцця і нашай рэспублікі. Амаль адразу пасля выхаду на рускай мове група перакладчыкаў пад кіраўніцтвам С. Гайдука пераклала «Узнятую цаліну», і гэты раман на беларускай мове меў за тры гады (адпаведна—1934, 1935, 1936) тры выданні. У 1936 годзе У. Хадыкам перакладзены тры кнігі «Ціхага Дона», а яго першая кніга перавыдавалася яшчэ і ў 1940 годзе. На беларускую мову перакладзены і «Лёс чалавека», і вядомыя раздзелы рамана «Яны змагаліся за Радзіму», і шэраг апавяданняў. Выдаваліся ў нас таксама творы Міхаіла Шолахава і на рускай мове як асобнымі кнігамі, так і ўрыўкамі ў перыёдыцы.

Да творчасці М. А. Шолахава неаднаразова звярталіся навукоўцы і літаратары рэспублікі. Бібліяграфія беларускіх матэрыялаў пра Шолахава па няпоўных звестках налічвае каля 80 адзінак.

Гаварыць пра ўздзеянне М. А. Шолахава, звязваць пошукі беларускіх пісьменнікаў з яго творчым вопытам можна толькі пры ўліку заканамернасцей развіцця беларускай культуры, зместу разнастайных тэндэнцый, абумоўленых нашай гісторыяй, а таксама акалічнасцей, якія вынікаюць з агульных умоў, аднолькавых патрабаванняў эпохі, адных палітычных і эстэтычных ідэалаў рускага і беларускага народаў.

У творах беларускіх аўтараў другой паловы 20-х гадоў і пазнейшага часу можна знайсці шмат сітуацый, канфліктаў і вобразаў, якія нагадваюць шолахаўскія. Возьмем, напрыклад, апавяданні «Двое Жвіроўскіх» (1926) М. Зарэцкага, «Таварыш Кунегін» (1927) А. Дудара, «Дзве сцежкі» (1927) П. Галавача. У свядомасці сённяшняга, чытача, ды і даследчыка, востры драматызм калізій перыяду грамадзянскай вайны, калі жорсткая барацьба падзяліла не толькі грамадства, не толькі класы, але і сем'і — брат ваюе супраць брата, бацька супраць сына і г. д. — замацаваўся найперш за творамі М. Шолахава. Але наўрад ці пры ўсёй відавочнасці ідэйна-мастацкага падабенства мы маем права лічыць прыгаданыя апавяданні другаснымі ў параўнанні з «Данскімі апавяданнямі». Самым важным тут з'яўляецца тое, што пісьменнікі Беларусі, як і прадстаўнікі ўсіх літаратур народаў СССР, былі засяроджаны на адлюстраванні барацьбы за рэвалюцыйныя пераўтварэнні, а барацьба гэтая ўсюды мела характар драматычны, жорсткі.

У гэтым плане з шолахаўскімі могуць супастаўляцца многія творы беларускіх аўтараў— «Межы» С. Баранавых, «Язэп Крушынскі» З. Бядулі, «Спалох на загонах» і «Праз гады» П. Галавача, «Вязьмо» М. Зарэцкага...

Поле «сілавога прыцягнення» Шолахава надзвычай шырокае і моцнае, яго, бясспрэчна, адчулі многія нашы пісьменнікі, у першую чаргу — І. Мележ.

Варта было б прааналізаваць, што агульнае маюць Міхаіл Шолахаў і Васіль Быкаў.

Трэба ўлічваць тую акалічнасць, што Быкаў пачынае сваю творчую дзейнасць якраз у той сітуацыі, калі найважнейшым фактарам развіцця савецкай культуры па выяўленні патрабаванняў часу і ўгрунтаванні самасвядомасці савецкага народа становіцца традыцыя Шолахава і непасрэдна ягоная актыўная пазіцыя ў грамадскім і літаратурным жыцці, калі нараджаецца так званая «другая хваля» літаратуры пра вайну, самыя істотныя асаблівасці якой — аналітычнасць, дакладнасць як у ідэалагічным, так і сацыяльным і псіхалагічным падыходзе, арыентаванасць на адказны гістарызм — і наканавана было ўвасобіць Быкаву.

Нельга абысці ўвагай і яшчэ адно. Мы даволі часта карыстаемся сентэнцыяй: «Пісьменнік усё жыццё піша адну кнігу», і карыстаемся звычайна з нацяжкай. А вось у дачыненні да Быкава гэта не трэба «нацягваць», таксама як і да Шолахава, з яго нязменнай адданасцю драматызму ў лёсе народным і лёсах чалавечых.

Каб пераканацца, што грамадзянскія, а таксама ідэйна-мастацкія пазіцыі гэтых пісьменнікаў падобныя, звернемся да выказванняў, якія дэкларуюць іхнія творчыя прыхільнасці: «Я цікаўлюся людзьмі, захопленымі гэтымі сацыяльнымі і нацыянальнымі катаклізмамі. Мне здаецца, што ў гэтыя моманты іхнія характары крышталізуюцца» (М. Шолахаў) і «Сталася так, што я прызвычаіўся свае ідэі, часта агульначалавечага плана, вырашаць на матэрыяле вайны. Мусіць, гэта таму, што мінулая вайна ўсеабдымная, і таму ўсяму было месца» (В. Быкаў). Блізкім для абодвух пісьменнікаў з'яўляецца тое, што іх цікавяць складаныя перыяды гісторыі не столькі агульнападзейным зместам, колькі канцэнтрацыяй шматлікіх складаных, «усеабдымных» праблем. А ці ж не азначае гэта і ў адным і ў другім выпадках цягу да эпічнасці?

Натуральна, што творчая манера аднаго адрозніваецца ад творчай манеры другога. Быкаўская, напрыклад, нясе на сабе сляды свайго часу — перавагу аналітычнага ў сэнсе рацыяналістычнасці і завостранасці канцэпцый, палемічнай скіраванасці ў адносінах да пэўных неўгрунтаваных поглядаў.

Асабліва цікава ў гэтым плане было б асэнсаваць апошнюю аповесць Васіля Быкава — «Знак бяды». У ёй, несумненна, найбольш дакладна выявіліся тыя каардынаты, у якіх пісьменнік ад самага пачатку і да сённяшняга дня вядзе свае творчыя пошукі, стварае сваю мадэль свету.

Заводзячы размову пра быкаўскую эпічнасць, немагчыма не спыніцца на аналізе жанру і формы яго твораў. І тут, як паралель, хочацца прыгадаць выпадак з «Лёсам чалавека» Шолахава. Ідучы ад традыцыйна прынятых крытэрыяў, гэты твор па жанры вызначалі як апавяданне. Аднак заўважалася яўная неадпаведнасць ідэйна-мастацкага зместу твора і яго жанравага азначэння, таму «Лёс чалавека» атрымаў шмат розных азначэнняў нетрадыцыйных — апавяданне-драма, апавяданне-лёс, жыццёвае апавяданне, маленькі раман, раман у форме апавядання, і, нарэшце, апавяданне-эпапея, малая эпапея, «эпапея, сціснутая да навелы, ці навела, духоўнай сваёй сутнасцю дачынная да эпапеі». Прыняўшы апошняе з іх (аўтар—А. Брыцікаў), многія аповесці Быкава мы з не меншым правам можам назваць дачыннымі да эпапеі. І, акрамя таго, па многіх параметрах блізкімі да шолахаўскай традыцыі.

Вяртаючыся да пачатку нашай размовы, яе нагоды, адзначым яшчэ адну асаблівасць юбілеяў: яны, калі пасмяротныя, становяцца выяўленнем не толькі вечнай памяці, але і вечнага існавання самога юбіляра. Як сказаў пра гэта У. Караткевіч: «Забудзецца па часе многае. Але Чалавека будуць памятаць вечна... І пісьменнік Міхаіл Аляксандравіч Шолахаў будзе жыць, пакуль будуць жыць на зямлі людзі».

Іван ЧАРОТА.

паслана са Стамбула. Памятаю і фатаграфію Янкі Купалы, якую ён прыслаў бацьку зімой 1932 г. з Кіславодска. Паэт быў зняты на тэрыторыі санаторыя ў зімовым адзенні ва ўвесь рост, з кійком у руцэ. Помніцца характэрная добрая Купалава ўсмешка. На адвароце ён напісаў такія радкі:

Шкадую, дружа Колас, што
тут цябе няма,
Ярчэй свяціла б сонца,
мякчэй была б зіма.
Дзве тысячы кілометраў
сягоння дзеляць нас,
Але што значыць вольным
адлегласці і час.

Ды ўсё гэта, разам з рукапісамі Коласа, ягонай бібліятэкай, кабінетам і ўсёй маёмасцю, з домам і сядзібай, садам, беззваротна загінула ў пажары ў самым пачатку вайны — 24 чэрвеня 1941 года.

У савецкім тыле — пад Масквой, у Ташкенце, зноў у Падмаскоўі і ў Маскве, — дзе жыў, працаваў і змагаўся паэт, нанава пачынаецца збор кніг. Асабліва плённа гэта праца ідзе пасля вяртання ў вызвалены Мінск у канцы 1944 — вясною 1945 года. Набываюцца кнігі класікаў — Пушкіна, Чэхава, Гогаля, Тургенева, Лермантава, Ляскова, Маякоўскага... З'яўляюцца падпісныя выданні, энцыклапедыі. Расце папулярнасць Коласа. Значна больш выдаецца яго кніг на рускай мове, на мовах народаў братніх рэспублік нашай краіны, на замежных мовах.

Шмат сяброў і паплечнікаў Коласа дасылаюць і даюць асабіста свае кнігі з цёплымі і сардэчнымі прысвячэннямі. Так, напрыклад, у музеі ёсць 15 кніг з аўтографамі вялікага сябра Коласа Максіма Рыльскага. Ёсць многа навуковых манаграфій, падараваных вучонымі.

Колас быў членам Камітэта па Дзяржаўных прэміях СССР. У пасляваенны час штогод на атрыманне прэмій вылучалася многа твораў. Для абмеркавання на Камітэце іх трэба было ўважліва прачытаць. І не проста прачытаць кнігу, але і даць ацэнку, аналіз, характарыстыку. Такім чынам, даводзілася штогод чытаць і вывучаць многія дзесяткі кніг. Гэта была адказная і нялёгкая, але ж пачэсная і цікавая работа. Так Колас знаёміўся з лепшымі творамі савецкай літаратуры, напісанымі пісьменнікамі ўсіх саюзных рэспублік.

Нягледзячы на такую нагрузку народны паэт не можа забыць дарагіх яму яшчэ з маладых гадоў класікаў, перачытвае іх зноў. Вось урывак з яго пісьма да Максіма Лужаніна, напісанага 8 лютага 1953 года: «...Чытаю Дастаеўскага. Прачытаў «Браты Карамазавы». Чытаю іх не першы раз. Дзіўлюся геніяльнасці пісьменніцкага дара Дастаеўскага. Зараз перачытваю «Бесы» і яшчэ хачу прачытаць «Ідыёта»...» А значна раней, у канцы 1947 года, Колас піша С. Гарадзецкаму: «Мне кажется, вы, наши старшие братья, должны позаботиться о том, что Достоевский наш, а что прохвосты стараются использовать (Фёдора Михайловича Достоевского) в своих целях — это надо выбить козырь из их рук. Выше по таланту Достоевского нет в мире писателя. Достоевский наш, Достоевскому, если нужно, всё надо простить, имея ввиду что вся жизнь Ф. М. была направлена в пользу человека, а не системы».

Я гэтымі прыкладамі хацеў паказаць актыўнае, дзейснае ўспрыняцце Коласам прачытанай кнігі. Часта ён рабіў і сур'ёзныя папрокі аўтарам кніг, нават сваім блізкім сябрам. Так, рэзка, але па-таварыску, крытыкаваў Колас раман Міхася Лынькова «Векапомныя дні», раман Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах».

Народны паэт быў актыўным прапагандыстам кнігі. Ён шмат увагі ўдзяляў стварэнню і камплектаванню бібліятэк — яшчэ ў Інбелкульце, пазней у Акадэміі навук БССР. Нездарма Цэнтральная навуковая бібліятэка акадэміі носіць імя Якуба Коласа.

Можна прывесці шмат прыкладаў, якія сведчаць пра ўвагу і клопаты Коласа да кнігі, кніжнай справы ўвогуле.

Вось што казаў ён у сваёй прамове на пленуме аргкамітэта Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР у лютым 1933 г.: «Нашаму Дзяржаўнаму выдавецтву трэба карэнным чынам перарабіць сваю работу па частцы друкавання кніг. Кніжная прадукцыя, выпушчаная нашым выдавецтвам, мае такую нізкую якасць, што замоўчваць гэта ніяк нельга. Аб гэтым ведае кожны пісьменнік, каму даводзілася друкавацца апошнімі часамі. Памылкі, перакручванні слоў, скажэнні сэнсу — пастаяннае хранічнае з'явішча ў практыцы нашага выдавецтва. Лозунг аб паляпшэнні якасці прадукцыі асабліва востра стаіць перад ім, бо калі яно і далей пойдзе па той жа лініі, па якой ідзе цяпер, то яго кніжная прадукцыя ні ў якой меры не будзе спрыяць ленінскай нацыянальнай палітыцы Савецкай улады».

12 студзеня 1936 года ў калгасе «Новы шлях» Астрашыцка-Гарадоцкага сельсавета Мінскага раёна адбыўся вечар творчасці Якуба Коласа, арганізаваны саветам бібліятэкі. Народны паэт напісаў уражанні, якія змясціла газета «Чырвоная змена»: «Тут новая, нядаўна адкрытая калгасная бібліятэка. У бібліятэцы сабрана 1.300 экземпляраў кніг. Падбор кніг зусім адпавядае культурным патрэбам калгаснікаў. Тут знойдзеце шмат выданняў Леніна. Багата прадстаўлен палітычны аддзел, мастацкая літаратура, літаратура па сельскай гаспадарцы. Звыш дзвюх з паловай соцень актыўных чытачоў зарэгістравана бібліятэкай калгаса «Новы шлях». І далей: «У цэнтры ўвагі новы культурны здабытак калгаса — бібліятэка. Адзін за другім выступаюць чытачы. Дзеляцца ўражаннямі аб прачытаных кнігах, выяўляюць сваё знаёмства з кнігай, уменне крытычна разбірацца ў ёй».

10 мая 1938 г. Колас піша ліст у рэдакцыю газеты «Літаратура і мастацтва», дзе з абурэннем гаворыць пра дрэнную работу выдавецтва, якое выпусціла зборнік яго вершаў «Нашы дні» з вялікай колькасцю памылак. Я не буду прыводзіць ліст цалкам, а толькі некалькі радкоў: «Звычайна выхад з друку кнігі для аўтара — вялікая радасць. Мне гэты зборнік не толькі не прынёс радасці, але пакінуў прыкрае пачуццё поўнага расчаравання. Гэты зборнік з'яўляецца ўзорам таго, як не трэба друкаваць кніжак. У ім столькі друкарскіх памылак, столькі неахайнасці, што па сутнасці яго не варта было выпускаць у свет...». І далей прыводзіцца пералік шматлікіх памылак.

Пытанні, звязаныя з кнігай— — выпуск кніг, праца над кнігай, выбар кніг для чытання,— вельмі часта ставяцца Коласам у яго шматлікіх артыкулах і выступленнях.

Колас усё жыццё любіў і шанаваў кнігу, клапаціўся пра бібліятэчную і выдавецкую справу.

Даніла МІЦКЕВІЧ.

Слова пра паход Ігравы

Да 800-годдзя выдатнага помніка літаратуры Кіеўскай Русі

А ці не лепей, братове,
пачаць у спрадвечным слове
мужны спеў пра паход Ігара,
Святаслава сына?
І пачаць спеў гэты нашча
па былях дня нашага,
а не па надуме Баяна!
Бо вешчы Баян калі
хацеў каго ўзнесці ў спеве,
дык расцякаўся вавёркай па дрэве,
шэрым ваўком па зямлі,
шызым арлом пад аблокамі.
Бо, казаў, памятаць собіла
першых часін усобіцы.
Тады выпускаў высока
на чараду лябёдак дзесяць сокалаў,
якую лябёдку даганялі,
тая першая песню слала
старому Яраславу,
харобраму Мсціславу,
што зарэзаў Радзедзю перад палкамі
касожскімі,
Раману слыннаму,
Святаслававу сыну.
Баян жа, братове, не дзесяць сокалаў
выпускаў на чараду лябёдак
высока,
а свае ксты вешчыя
клаў на струны жывыя,
вечныя;
яны ж самі ў далі
славу князям ракаталі.
Пачнем жа, братове, аповесць гэтую
ад старога Ўладзімера да нашага Ігара,
што розум свой выверыў цвёрдасцю
і вывастрыў мужнае сэрца гордасцю;
і, ратнага духу поўны,
палкі харобрыя паваёў
на зямлю Палавецкую
за зямлю Рускую.
О Баяне, салавею старога часу!
Якую б даў ты паходам акрасу,
скачучы, салавею, па дрэве думкі
высока,
залятаючы думкаю пад аблокі,
звіваючы абое сувоі славы нашага
часу,
блукаючы па сцяжыне Траяна
цераз палі на горы.
Так бы ва ўнука Велеса
песня Ігару пелася:
«Не бура занесла сокалаў
цераз палі шырокія—
чароды галак спуджана ўцякаюць
да Дону вялікага».
Ці так бы песню пачаў ты,
вешчы Баяне,
унуча Велесаў;
«Коні ірзуць за Сулою,
звініць слава ў Кіеве:
трубяць трубы ў Новагорадзе,
стаяць сцягі ў Пуціўлі!»
Ігар чакае любага брата Ўсевалада.
І сказаў яму буй тур Усевалад:
«Адзін брат, адзін след,
адзін светлы свет—
ты, Ігару!
Абодва мы—Святаслававічы!
Сядлай, браце,
сваіх борздкіх коней старанна,
а мае дык гатовы,
ля Курска раней асядланы.
А куране мае—воіны бывалыя,
пад трубамі спазіваныя,
пад шаломамі ўзлюляныя,
з канца дзіды ўскормленыя,
шляхі ім вядомыя,
яры ім знаёмыя,
лукі ў іх напяты,
калчаны адчынены,
шаблі навостраны чынна;
ваўкамі шэрымі скачуць у полі самі,
шукаючы шаны сабе, а князю славы».

Гады Ігар зірнуў
на светлае сонца
і ўбачыў усіх сваіх вояў,
акрытых цемрай густою.
І казаў тады Ігар
да дружыны свае:
«Братове і дружыне!
Лепей пацятымі быць,
чым паддацца палону;
а ўссядзем, братове,
на сваіх борздкіх коней,
ды пагляд данясем свой
да сіняга Дону».

Саступіў розум князеў
жаданню,
і засланіла знак накліканы
ахвота дапасці да Дону вялікага.
«Хачу,—кажа,—дзіду пераламаць
на Палавецкім полі шалёным,
з вамі, русічы, хачу сваю галаву
злажыць,
альбо напіцца шаломам з Дону».
Тады князь Ігар уступіў у залатое стрэмя
і паехаў па чыстым полі.
І заступіла шлях яму сонца сляпое;
ноч разбудзіла птушак стогнамі
навальніцы;
свіст звярыны прачнуўся,
дзіў паспеў прахапіцца—
на вершаліне загадвае ўслухацца
зямлі незнаёмай, як наракае,
Волзе,
і Памор'ю,
і Пасуллю,
і Суражу,
і Корсуню,
і табе, ідале Тмутараканскі!
І полаўцы дарогамі дзікімі
пабеглі да Дону вялікага:
крычаць калёсы ў поўначы недзе
крыкам распуджаных лебедзяў.
Воінаў Ігар вядзе да Дону.

Пасуць ужо на дубах бяссонна
птушкі бяду ягоную;
Ваўкі ў ярах страх навываюць,
арлы клёкатам клічуць звяроў
касцямі жывіцца;
на шчыты чырвоныя брэшуць лісіцы.

О Руская зямля! Ужо ты за пагоркам!

Ноч гасне доўга.
Святло разліла зараніца,
імгла палі спавіла.
Заснуў салаўіны шчокат,
абудзіўся голас галак нямлявы.
Русічы палі вялікія шчытамі
чырвонымі перагарадзілі,
шукаючы шаны сабе,
а князю—славы.

У пятніцу зрана
патапталі яны палавецкія палкі паганыя
і, па полю стрэламі рассыпанымі
палавеючы,
памкнулі красных дзевак палавецкіх,
а з імі золата,
і па́валакі,
і дарагія аксаміты.
Акрываламі,
і затуламі,
і кажухамі
яны ў ахвоту масцілі
балоты і топістыя мясціны,
гацілі палавецкімі ўборамі смела.
Чырвоны сцяг,
харугву белую,
чырвоную грыўку,
срэбную зброю—вою
харобраму Святаслававічу!

Дрэмле ў полі Алегава гняздо харобрае.
Заляцела далёка!
Не на крыўду было народжана
ні сокалу,
ні крэчату,
ні табе, чорны воран,
паганы полавец!
Гзак бяжыць шэрым ваўком апрыклым,
Канчак яму правіць след да Дону
вялікага.

Другога дня вельмі рана
вестку свету дае крывавы світанак:
чорныя хмары з мора сунуцца соўма,
хочуць акрыць чатыры сонцы,
а ў іх б'юцца сінія маланкі.
Быць грому вялікаму, быць ліху,
ісці дажджу стрэламі з Дону вялікага!

Тут дзідам пераламацца,
тут шаблям павышчарбіцца ў запале
аб шаломы палавецкія,
на рацэ на Каяле,
ля Дону вялікага!
О Руская зямля! Ужо ты за пагоркам!

Вятры, Стрыбогавы ўнукі старэнныя,
веюць з мора стрэламі
на харобрыя палкі Ігаравы.
Зямля гудзе,
рэкі мутна цякуць,
пыл палі ахінае,
сцягі гавораць:
полаўцы ідуць ад Дону,
і ад мора,
і з усіх бакоў рускія палкі абступілі.
Дзеці д'яблавы перагарадзілі палі
галасамі,
а харобрыя русічы перагарадзілі
чырвонымі шчытамі.

Яр туру Ўсеваладзе!
Стаіш у віры бою,
стрэламі пырскаеш ты на вояў,
грыміш аб шаломы харалужнымі мечамі.
Куды, тур, паскачаш,
сваім залатым шаломам
пасвечваючы,
там ляжаць палавецкія галовы паганыя.
Калёнымі шаблямі шаломы аварскія
пашчапаныя
ад цябе, яр туру Ўсеваладзе!
Якая рана баліць, братове,
таму, хто забыўся на шану
і на багацце,
і ў Чарнігаве на стол залаты
бацькаў,
занядбаў сваёй жаданай краснай
Глебаўны
мілосць і ласку?
Былі вякі Траянавы,
мінулі леты Яраслававы,
былі паходы Алегавы,
Алега Святаслававіча.
Бо той Алег мечам каваў крамолу
і стрэлы па зямлі сеяў.
У залатое стрэмя ўступаў у горадзе
Тмутаракані,
звон гэты чуў сын Яраславаў
вялікі Ўсевалад, а Ўладзімер
закладваў вушы ў Чарнігаве кожнае
ранне.
Барыса ж Вячаслававіча на суд прывяла
слава
і на Каніну травы зялёнае акрывала
паслала
для вечнага начлегу
харобраму маладому князю
за крыўду Алега.
Святаполк з той Каялы
бацьку свайго прывёз у спакоі,
люляючы між угорскімі
інаходцамі,
да Кіева да Сафіі святое.
Тады пры Алезе Гарыслававічы
засявалася ўсобіцамі і прарастала,
занепадала спадчына Даждзьбогава
ўнука,
у княскіх крамолах караціўся век
чалавечы.
Тады па Рускай зямлі пераклікаліся
рэдка ратаі,
ды часта вораны граялі,
трупы дзелячы між сабою,
а галкі сваё гаварылі звычна,
хочучы паляцець на здабычу.
Гэта было ў тыя раці і ў тыя паходы,
а такой раці не чуваці!
З ранняга рання да вечара
з вечара да світання
ляцяць стрэлы калёныя,
грымяць шаблі аб шаломы,
трашчаць дзіды харалужныя
у полі незнаёмым
сярод зямлі Палавецкай.
Чорная зямля пад капытамі засеяна
была касцямі
і паліта крывёю:
яны ўзышлі на Рускай зямлі тугою.

Што мне шуміць,
што мне звініць—
здалёку чуецца да світання?
Ігар палкі заварочвае:
бо любага брата Ўсевалада шкада яму.
Біліся дзень,
біліся другі:
трэцяга дня апоўдні палі Ігаравы сцягі.
Тут два браты разлучыліся на беразе
быстрай Каялы;
тут стала крывавага віна мала;
тут пір дакончылі харобрыя русічы:
сватоў напаілі набеглых, а самі палеглі
за зямлю Рускую.
Нікне трава ад жалю,
а дрэва з тугою да зямлі схілілася.
А ўжо ж, братове, не вясёлая настала
часіна,
ужо сілу пустыня схавала.
Устала крыўда ў войску Даждзьбогава
ўнука,
на зямлю Траянаву дзевай ступіла,
усплёснула лебядзінымі крыламі
на сінім моры ля Дону;
спудзіла, ўсплёснуўшы, часіны сытыя.
Усобіца войны князёў з паганымі
супыніла,
бо сказаў брат брату, не тоячыся:
«Гэта маё, таксама маё і тое
ўсё».
І пачалі князі пра малое
«гэта вялікае» мовіць,
і каваць самім на сябе крамолу.
А паганыя з усіх бакоў прыходзілі
з перамогамі
на зямлю Рускую.

О, далёка сокал дапаў, птушак б'ючы,—
да мора!
А Ігаравага харобрага палка ўваскрэсіць
не можна!
Па ім закрычала Карна, і Жля ў знямозе
паскакала па Рускай зямлі,
сеючы людзям гора з пякельнага рога,
жанкі рускія ў горы заплакалі,
прыгаворваючы:
«Ужо нам сваіх любых ладаў
ні ўяваю ўявіць,
ні думаю здумаць,
ні вачыма згледзець,
а золата і срэбра і зусім не пакратаць».
А застагнаў бо, братове, Кіеў тугою,
а Чарнігаў напасцямі.
Жальба па Рускай зямлі разлілася;
смутак густа пацёк сярод зямлі
Рускай.
А князі на сябе самі крамолу кавалі,
а паганыя самі,
з перамогамі нарыскваючы
на зямлю Рускую,
з двара па белі даніну бралі.

Бо тыя два харобрыя Святаслававічы,
Ігар і Ўсевалад,
ужо разбудзілі падступнасць звадамі,
а яе прыспаў было бацька іхні,
Святаслаў грозны вялікі Кіеўскі,
грознасцю, каб заціхлі:
прыбіў сваімі палкамі дужымі
і мечамі харалужнымі,
наступіў на зямлю Палавецкую,
прытаптаў і яры, і пагоркі,
узмуціў рэкі і азёры,
высушыў балоты і патокі.
А паганага Кабяка з лукі мора,
ад жалезных вялікіх палкоў палавецкіх,
як віхор, вырваў,—
і паў Кабяк у горадзе Кіеве,
ў грыдніцы Святаслававай.
Тут немцы і венецічы,
тут грэкі і маравы
пяюць славу Святаславу,
каюць князя Ігара,
што на́быці, а нямала, патапіў на дне
Каялы,
ракі Палавецкай,
рассыпаў золата рускае.
Тут Ігар-князь перасеў з сядла
залатога
ў сядло нявольніцкае.
І ад стогну засмуціліся ў гарадоў
забаролы,
а весялосць маркота забрала.

А Святаслаў мутны сон бачыць
у Кіеве на горах,
«У гэтую ноч з вечара мяне апраналі,—
гаворыць,—
чорным акрывалам
на ложы цісавым;
чэрпалі мне сіняе віно,
змяшанае з горам;
з пустых калчаноў паганцаў

буйным жомчугам абсыпалі мяне
і ласкаю суцяшалі.
Ужо без князька дошкі
ў маім золатаверхім церамі.
Усю ноч з вечара
ля Плесеньска на балоні граялі
вароны шэрыя,
і крылялі з-пад лесу да сіняга мора».
І князю баяры сказаць схацелі:
«Ужо твой розум запаланіла гора,
бо гэта два сокалы зляцелі
з прастолу бацькоўскага залатога
здабыць Тмутараканя-горада,
альбо напіцца шаломам з Дону.
Ужо сакалам паганых шаблі
крылкі падсеклі без жалю,
а саміх спуталі
жалезнымі путамі.
Бо цёмна было ў трэці дзень:
два сонцы прыцьмелі,
абодва барвяныя слупы пагаслі,
і з імі два маладзікі ясныя
цемраю завалакліся
і ў мора абнізіліся,
і вялікую дзёрзкасць паганцам
дазволілі.
На рацэ на Каяле цемра над святлом
сілу займела —
па Рускай зямлі распасцерліся полаўцы,
быццам гайно гепардаў.
Ужо на славу апала пагарда;
Ўжо насела сіла на волю;
Ўжо дзіў зямлю разбудзіў.
Бо гоцкія красныя дзевы
на беразе сіняга мора запелі:
звонячы золатам рускім,
часіну ўслаўляючы Бусаву,
пялегваючы помсту за Шарукана.
Тады вялікі Святаслаў
сказаў залатое слова,
са слязамі змяшанае:
«О сыноўча мае, Ігару і Усеваладзе!
Рана вы пачалі зямлю Палавецкую
мечамі цвяліць,
а сабе славы шукаць.
Ды не па чэсці адолець змаглі,
не па чэсці кроў пралілі.
Харобрыя вашыя сэрцы
з цвярдога булата каваны
і ў смеласці гартаваны.
Што ж нарабілі вы з маёй срэбранай
сівізною?
А ўжо не бачу ўлады
магутнага,
ды багатага,
ды многавоіннага
брата майго Яраслава,
з чарнігаўскімі асілкамі,
з магутамі,
і з татранамі,
і з шальберамі,
і з тапчакамі,
і з равугамі,
і з альберамі.
Бо тыя без шчытоў, з нажом за халявай,
палкі клікам перамагаюць,
звонячы ў прадзедаўскую славу.
Ды вы сказалі: «Памужэм самі:
даўнюю славу сабе прысвоім,
а наступную самі падзелім!»
А ці не дзіва, братове, памаладзець
старому?
Калі сокал пер'е мяняе,
высока птушак збівае:
не дасць гнязда свайго ў крыўду.
Ды зло найшло—князі мне
не дапамагаюць:
насталі часіны ганебныя.
Пад шаблямі палавецкімі крычаць
ля Рымава,
а Уладзімер пад ранамі.
Туга і гора сыну Глебаву!»

Вялікі княжа Усеваладзе!
Ці ж і думкай табе здалёку прыляцець
не змагчы
бацькаў стол залаты пабераргчы?
Бо можаш ты вёсламі распырскаць Волгу,
а Дон выліць шаломамі!
Калі б быў ты тут,
дык была б раба па нагаце,
а раб па рэзані,
Бо лацвей табе посуху страляці
жывымі стрэламі—
адважнымі сынамі Глебавымі.

Ты, буй Рурыча, і Давыдзе!
Ці не вашыя воі слаўныя
залочанымі шаломамі па крыві
плавалі?
Ці не ваша дружына харобрая
рыкае, як туры,
параненыя калёнымі шаблямі
на полі незнаёмым?
Дык уступіце ж, імасці, ў залатыя
страмёны
за крыўду дня нашага,
за зямлю Рускую,
за раны Ігара,
буйнага Святаслававіча!

Галіцкі Асмамысл Яраславе!
Высока сядзіш як належыць
на сваім з золата кутым прастоле,
падпёр горы Угорскія доле
сваімі палкамі жалезнымі,
заступіўшы шлях каралю,
зачыніўшы Дунаю вароты,
цераз воблакі перакідваючы цяжары,
суды радзячы да Дуная.
Цякуць па землях грозьбы твае цяжкія,
адчыняеш вароты Кіеву,
страляеш з бацькоўскага залатога
прастолу
здалёку ў султанаў.
Страляй жа, імасць, у Канчака,
кашчэя паганага,
за зямлю Рускую,
за раны Ігаравы,
буйнага Святаслававіча!

А ты, буй Рамане, і Мсціславе!
Харобрая думка ўзносіць на подзвіг
ваш розум.
Ты крыляеш высока ў адвазе грозны,
сокалам раскашуешся на вятрах,
хочучы птушку збіць у быстрым лёце.
Бо ў вас жалезныя панцыры
пад шаломамі лацінскімі.
Ад іх зямля задрыжэла,
і краіны многія—
Хінава,
Літва,
Яцвягі,
Дзерамела,
і полаўцы суліцы свае пасклалі,
а галовы свае пасхілялі
пад тыя харалужныя мечы
знямела.
Бо ўжо, княжа,
Ігару сонца ўначэла ў святле,
а дрэва не на дабро лісце скінула:
па Росі і па Суле гарады
падзялілі.
А Ігараў харобры полк
не ўваскрэсіць!
Дон цябе, княжа, кліча
і просіць князёў на падмогу.
Ольгавічы, князі харобрыя, на рацэ
паспелі...

Інгвар і Усевалад,
і ўсе тры Мсціслававічы,
сокалы шасцікрылыя гнязда
не благога!
Вам не кідала жэрабя перамога—
самі параскрадалі ўладанні!
Дзе ж вашыя залатыя шаломы
і суліцы ляшскія
і шчыты?
Загарадзіце дзікаму полю вароты
неаслабла
сваімі вострымі стрэламі
за зямлю Рускую,
за раны Ігаравы,
буйнага Святаслававіча!
Ужо срэбрам цячы перастала
Сула Пераяслаўлю,
і Дзвіна ўчарнела цячэ
грозным тым палачанам
пад клікам паганых.
Толькі адзін Ізяслаў, сын Васількаў,
сваімі мечамі вострымі быў у сіле
пазваніць аб шаломы літоўскія.
Прыбіў ён славу дзеда свайго Усяслава,
а сам пад шчытамі чырвонымі
на траве крывавай
быў прыбіты літоўскімі мечамі
і ўчуў голас вешчы:
«Дружыну тваю, княжа,
птушкі крыламі ўбралі,
а звяры кроў палізалі».
Не было тут брата Брачыслава,
ні другога—Усевалада.
І адляцела яго душа жамчужная
з харобрага цела
праз залатое аплечча.
Зажурыліся галасы,
весялосць панікла,
трубы трубяць гарадзенскія.

Яраслававы ўсе ўнукі і Усяслававы!
Абнізце сцягі свае зрэджаныя,
схавайце мечы свае вярэджаныя.
Выпалі вы з дзедаўскай славы, як сокалы
голыя.
Бо вы сваімі крамоламі
пачалі наводзіць паганых
на зямлю Рускую,
на Усяслававу нажыць.
Вашыя ўсобіцы прывялі
гвалт ад зямлі Палавецкай!
На сёмым веку Траяна
кінуў жэрабя Усяслаў маўкліва
на любую сваю абраную.
Ды сабраў коней хітрасці рана
і скочыў да горада Кіева
і дакрануўся дзідаю
да залатога прастола кіеўскага.
Скочыў ад іх лютым зверам
апоўначы з Белгорада.
сінім воблакам ахінуўся,
урваў тры разы ён удачу,
вароты Новагорада адчыніў,
разбіў славу Яраславу,
скокнуў ваўком хутка
да Нямігі з Дудутак.

На Нямізе галовы сцелюць снапамі,
харалужнымі малоцяць цапамі,
жыццё кладуць на таку злюцела,
веюць душу ад цела.
Нямігі крывавыя берагі
не збожжам былі засеяны зноў—
засеяны косцьмі рускіх сыноў.
Усяслаў-князь людзям чыніў суды,
радзіў князям гарады,
а сам уночы ваўком рыскаў
з Кіева паспяваў да пеўняў
да Тмутараканя,
Хорсу вялікаму шлях перацінаў.
Яму ў Полацку пазвоняць ютрань рана
ў званы ў святое Сафіі,
а ён той звон чуе ў Кіеве.
Хоць і вешчую меў душу ў дзёрзкім
целе,
ды часта ад бедаў цярпеў ён.
Яму вешчы Баян
прымаўку мудрую даўно склаў:
«Ні хітраму,
ні спрытнаму,
ні чарадзею дасціпнаму
суда боскага не мінуць».

О, стагнаць Рускай зямлі,
ўспамінаючы часіны першыя
і першых князёў!
Таго старога Уладзімера
нельга было прыкуць да гораў
Кіеўскіх:
цяпер жа сталі сцягі Рурыкавы,
а другія—Давыдавы,
ды ў розныя бакі палошчуцца ў іх
палотнішчы.
І коп'і пяюць па-рознаму.

На Дунаі чуцен голас Яраслаўны,
самотнай чайкаю кігіча рана:
«Палячу, кажа, чайкаю па Дунаю,
абмачу белшаўковы рукаў у Каяле,
абатру князю крывавыя яго раны
на целе яго крамяным».

Яраслаўна рана плача
ў Пуціўлі на забароле,
прыгаворваючы:
«О ветру, вятрыла!
Чаму, валадару, вееш проці?
Чаму імкнеш палавецкія стрэлы
згубныя
на сваіх лёгкіх крылах
на воінаў майго любага?
Ці ж табе пад аблокамі не стала
прасторы,
караблі люляючы на сінім моры?
Чаму, валадару, весялосць маю
па кавылю развеяў?»

Яраслаўна рана плача
ў Пуціўлі на забароле,
прыгаворваючы:
«О Днепра Славуцічу!
Ты прабіў каменныя горы
праз зямлю Палавецкую.
Ты люляў на сабе насады Святаслававы
да Кабяковага стану.
Дык прылюляй, валадару, да мяне мой
лёс,
каб не слала я да яго слёз
на мора рана».

Яраслаўна рана плача
ў Пуціўлі на забароле,
прыгаворваючы:
«Светлае і трысветлае сонца!
Усім ты цёплае і яснае:
чаму, валадару, паслала свае гарачыя
промні
на воінаў любага?
У полі бязводным спёкай ім лукі
сцягнула,
бядою ім калчаны затнула?»

Пырснула мора апаўночы,
хмары ад смерчаў стогнуць.
Ігару-князю бог шлях кажа
з зямлі Палавецкай
у зямлю Рускую,
да бацькавага залатога прастола.

Пагаслі вечарніцы.
Ігар спіць,
Ігару рупіць,
Ігар думкаю поле мерае
ад вялікага Дону да малога
Данца.

Свіснуў Аўлур апаўночы на каня
за ракою ледзь:
князю загадаў разумець:
князю Ігару не быць у палоне!
Гукнула,
грукнула зямля,
зашумела трава,
палавецкія вежы рухацца сталі.
А Ігар-князь паскакаў
у чарот гарнастаем,
на ваду белым гогалем.
На борздкага каня ўскочыў
і саскочыў з яго ваўком шэрым.
І пабег да лукі Данца,
і паляцеў сокалам пад аблокамі,
б'ючы гусей і лебедзяў
на сняданне,
і абед,
і вячэру.
Калі Ігар сокалам паляцеў,
тады Аўлур ваўком пабег,
трусячы сцюдзёную расу сабою,
бо загналі сваіх борздкіх коней абое.
Данец кажа:
«Княжа Ігару!
Не мала табе велічы,
а Канчаку нелюбі,
а Рускай зямлі весялосці».
Ігар кажа:
«О Донча!
Не мала табе велічы,
што князя люляў на хвалях,
слаў яму траву зялёную
на берагах срэбных,
апранаў яго цёплымі туманамі
пад засенню зялёнага дрэва;
ты сцярог яго гогалем на вадзе,
чайкамі на бруях,
чэрнядзямі на вятрах».
Не такая яна, кажа, рака Стугна:
скупую брую маючы,
паглынуўшы чужыя ручаі і патокі,
шырэйшаю ў вусці стала
і юнака князя Расціслава схавала
на дне ля цёмнага берага.
Плача Расціслава маці
па маладым сыне.
Ад жалобы кветкі абнылі
і дрэва з тугою да зямлі схілілася.

А не сарокі затраскаталі—
следам Ігаравым Гзак з Канчаком
едуць.
Тады не граялі вораны,
галкі-знямелі,
сарокі не траскаталі,
толькі поўзалі змеі.
Дзятлы стукам шлях да ракі кажуць,
салаўі вясёлымі песнямі
світанне вітаюць.

Кажа Гзак Канчаку:
«Калі сокал да гнязда ляціць,
расстраляем саколіча
стрэламі сваімі залочанымі».
Кажа Канчак да Гзы:
«Калі сокал да гнязда ляціць,
дык сакалца апутаем
краснаю дзеўкаю».

І сказаў Гзак Канчаку:
«Калі яго апутаем краснаю дзеўкаю,
ні сакалятка ў нас,
ні краснай дзеўкі не стане
і пачнуць нас птушкі біць
у Палавецкім стане».

Сказалі Баян і Хадына,
Святаслававы песнятворцы
старых часін Яраслава,
Алега-князя ўлюбёнцы:
«Цяжка галаве без плячэй,
важка целу без галавы»—
Рускай зямлі без Ігара.
Сонца свеціцца на нябёсах—
Ігар-князь у Рускай зямлі;
дзеўкі пяюць на Дунаі—
галасы ўюцца цераз мора да Кіева.
Ігар едзе па Барычаву
да святой багародзіцы
Пірагошчай.
Рады сёлы, гарады вясёлы.
Пяяўшы славу князям старым,
потым пяяць і маладым.

Слава Ігару Святаслававічу,
буй туру Усеваладу,
Уладзіміру Ігаравічу!

Будзьце ў здароўі, князі і дружына,
баронячы хрысціян
ад паганай чужыны!

Князям слава і дружыне!
Амінь!

Пераклаў Рыгор БАРАДУЛІН.

САЛІСТ У АРКЕСТРЫ

Няма і дваццаці гадоў Мінскаму камернаму аркестру. А калектыў ужо добра вядомы і прызнаны: больш за тысячу канцэртаў, гастрольныя выступленні ў многіх гарадах Савецкага Саюза і за мяжой. Шматлікія аматары музыкі зазначаюць высокае выканаўчае майстэрства, ансамблевую культуру артыстаў Мінскага камернага.

Саліст-габаіст Аляксандр Прыходзька працуе ў гэтым калектыве з 1968 года, з дня яго заснавання. У суправаджэнні аркестра А. Прыходзька іграе нямала старадаўняй і класічнай музыкі, твораў Альбіноні, Баха, Беліні, Вівальдзі, Гендэля, Гумеля, Карэлі, Куперэна, Рамо, Моцарта, Тэлемана, Тарціні, Сальеры, Фаша. У канцэртным рэпертуары габаіста і творы сучасных савецкіх, замежных кампазітараў. Ды асаблівая заслуга гэтага музыканта ў тым, што ён — актыўны прапагандыст музыкі сучасных беларускіх кампазітараў: Л. Абеліёвіча, Г. Гарэлавай, Э. Зарыцкага, С. Картэса, В. Карэтнікава, В. Сярых, Д. Смольскага, А. Шпянёва.

Дарэчы, А. Прыходзька — першы выканаўца многіх твораў беларускіх кампазітараў, некаторыя ж канцэрты былі спецыяльна напісаны для габоя і камернага аркестра з разлікам на выканаўчыя магчымасці гэтага музыканта. Творчая садружнасць беларускіх кампазітараў з А. Прыходзькам пачалася ў пачатку 70-х, пасля таго, як на рэспубліканскім конкурсе музыкантаў-выканаўцаў на духавых інструментах ён быў адзначаны прызам Саюза кампазітараў рэспублікі за лепшае выкананне твораў беларускіх кампазітараў. З таго часу арыгінальны, беларускі рэпертуар для габоя значна пашырыўся. З'явіліся і творы, напісаныя не толькі ў традыцыйнай форме, г. зн. для габоя з аркестрам або фартэпіяна, але і як сольныя п'есы або п'есы для габоя ў спалучэнні з другімі інструментамі. Прычым творы гэтыя вымагалі ад выканаўцаў пераадолення значных цяжкасцей.

Быць салістам-канцэртантам у любым камерным аркестры— асаблівая адказнасць для выканаўцы на духавым інструменце. Яго выступленні ў канцэртах істотна адрозніваюцца ад удзелу саліста-духавіка ў сімфанічным аркестры, дзе іграць выпадае асобныя сольныя фразы або невялікія эпізоды. У камерным жа калектыве саліст-духавік працуе з асаблівым, высокім нервовым, эмацыянальным напружаннем і аддачай фізічных сіл, бо ён адказны за якасць гучання ўсіх нот нават у tutti. Работа ў камерным аркестры вымагае ад музыканта штодзённых заняткаў, пастаяннага прафесійнага ўдасканалення, асваення новага рэпертуару і ўмення хутка вывучаць на памяць самыя складаныя і розныя ў стылявых адносінах творы. Між іншым, усіх салістаў-духавікоў, якія пастаянна працуюць у камерных аркестрах Савецкага Саюза, можна пералічыць па пальцах; іншыя выступаюць толькі ў разавых канцэртах. Вось чаму прыцягальная для нас творчая асоба А. Прыходзькі, які стабільна і паспяхова выступае з Мінскім камерным аркестрам нямала гадоў.

Аляксандр Прыходзька — выхаванец беларускай выканаўчай школы ігры на духавых інструментах. З 12-гадовага ўзросту займаўся музыкай, паступіў у клас габоя Чэлябінскага музычнага вучылішча, тры гады служыў у Ансамблі песні і танца Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту, а затым прадаўжаў вучобу ўжо ў Мінску. Закончыў музычнае вучылішча, Беларускую дзяржаўную кансерваторыю... Займаўся настойліва і мэтанакіравана, стаў адным з лепшых габаістаў рэспублікі, а ў 1968 годзе А. Прыходзька прайшоў па конкурсе на пасаду саліста Мінскага камернага аркестра.

Тут раскрыліся лепшыя выканаўчыя рысы А. Прыходзькі як саліста-канцэртанта: Гук яго габоя пры ігры бывае надзіва пяшчотны, чаруе высакароднасцю тэмбра ў запаволеных пастаральных частках. Дарэчы, такім натхнёным быў «голас» яго гонага інструмента ў II частцы Канцэрта ля мінор А. Вівальдзі, які выконваўся на адкрыцці канцэртнай залы ў Полацкім Сафійскім саборы два гады назад. Выкананне хуткай рухавай музыкі нагадвае своеасаблівае творчае саперніцтва саліста з аркестрам, а ў tutti ігра А. Прыходзькі быццам надае гучанню струннай групы непаўторны срабрысты калярыт. Гэты саліст бліскуча валодае ўсімі сучаснымі прыёмамі ігры на габоі, дэманструючы бесперапыннае дыханне, фрулата, выкананне флажалет, двайнога стаката. На высокім прафесійным узроўні ім зроблены запіс Канцэрта Э. Зарыцкага для габоя з камерным аркестрам—на пласцінцы Усесаюзнай фірмы «Мелодия».

З Мінскім камерным аркестрам ён гастраляваў ва ўсіх саюзных рэспубліках, у Маскве, Ленінградзе, выступаў у Балгарыі, Венгрыі, Чэхаславакіі.

Як саліст А. Прыходзька шмат выступае ў Саюзе кампазітараў БССР, па тэлебачанні, запісваецца на радыё. Па ініцыятыве А. Прыходзькі ў Мінску наладжаны яго супольныя канцэрты з арганістам К. Шаравым. У Зале камернай музыкі на Залатой горцы нядаўна прайшлі паспяхова і з аншлагам такія тэматычныя канцэрты, як «І. С. Бах, яго сучаснікі і паслядоўнікі», «Інструментальная музыка Францыі», «Музыка кампазітараў сям'і Бах».

Адданасць музычнаму мастацтву, пастаянны творчы рост, імкненне як мага больш сыграць, і сыграць на высокім прафесійным узроўні са шматстайнага габойнага рэпертуару, здатнасць сваёй ігрой стымуляваць кампазітараў рэспублікі да напісання новых твораў для габоя... Гэтыя вартасці вылучаюць А. Прыходзьку ў лік лепшых беларускіх выканаўцаў на духавых інструментах.

Б. НІЧКОЎ,
загадчык кафедры духавых інструментаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, заслужаны артыст БССР.

ЗАЙГРАЛА ДУДА

Яшчэ адзін старадаўні беларускі музычны інструмент вернуты да жыцця дзякуючы настойлівасці і майстэрству вядомага музыканта-рэстаўратара Уладзіміра Пузыні. Назва яму — дуда. Па знешнім выглядзе яна чымсьці нагадвае рускую валынку ці ўкраінскую «казу». Гэта — музычны інструмент, які складаецца з дзвюх, а то і болей, трубак, што ўстаўлены ў своеасаблівы мяшок, які робіцца з пузыра ці са скуры.

Дуда да канца дзевятнаццатага стагоддзя была адным з найбольш папулярных музычных інструментаў на тэрыторыі Беларусі. Яе непаўторнае гучанне можна было пачуць у час розных вясковых святаў, але паступова гэты знешне непрыкметны музычны інструмент пачаў саступаць месца больш сучасным па выкананні, яркім па гучанні. І праз колькі часу пра дуду зусім забыліся.

— Жаданне вярнуць дуду да жыцця ўзнікла пасля таго, як у адной са старых кніг пачатку нашага стагоддзя знайшоў апісанне гэтага музычнага інструмента,— гаворыць У. Пузыня.— Я зацікавіўся ім. Захацелася, каб і нашы сучасні- кі пачулі яго гучанне.

Карпатлівая праца заняла не адзін месяц. Пры ўсёй сваёй прастаце, выраб дуды патрабуе немалога майстэрства. Ды і матэрыял для яе патрэбен асаблівы. У прыватнасці, не так лёгка зрабіць і «мяшок». Уладзімір Якаўлевіч дзеля гэтага выкарыстаў скурку казляняці. Цікава, што з унутранага боку яна не апрацавана, захоўвае поўсць. Старанна падбіраў дрэва для трубак.

І вось жаданы плён. З гучаннем дуды У. Пузыня знаёміць народнага артыста СССР Генадзя Іванавіча Цітовіча, уважліва выслухоўвае заўвагі свайго настаўніка, дарадца і старэйшага таварыша.

А. КУНЦЭВІЧ.
Фота Ул. КРУКА.

ПРАЎДА АБ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЕ

«Ідэалогія і палітыка сучаснага рускага праваслаўя» — так называецца брашура Уладзіміра Лісічкіна, выпушчаная выдавецтвам «Беларусь». Як вядома, на сучасным этапе пазіцыі царквы, яе ўплыў на людзей сталі слабымі, тым не менш, як падкрэслівае аўтар у прадмове, рускае праваслаўе «працягвае заставацца самай буйной праваслаўнай царквой свету і рэлігійнай арганізацыяй у СССР. Маскоўская патрыярхія мае ў сваім распараджэнні тысячы храмаў і малітоўных дамоў, манастыры, акадэміі і семінары».

Што ж уяўляе сабой праваслаўе на сучасным этапе? Як імкнецца яно прыстасавацца да новых умоў? На гэтыя і іншыя пытанні і дае адказ У. Лісічкін у брашуры. Паэтапна, паслядоўна раскрываецца сутнасць царквы, аналізуюцца асаблівасці сучаснай ідэалогіі і палітыкі рускага праваслаўя, новыя сродкі ўплыву на розум людзей — «Сутнасць праваслаўнага веравучэння», «Сацыяльная дактрына царквы», «Рэлігійная этыка».

Асаблівай увагі заслугоўвае раздзел «Духоўная культура і царква», у якім выкрываюцца спекулятыўна - фальсіфікатарскія спробы тэолагаў узняць значэнне рэлігіі як элемента духоўнай культуры.

Ю. РОДЗІЧ.

СПЯВАЕМ РАЗАМ... З «ВЕРАСАМІ»

Сярод зорак беларускай эстрады і вакальна-інструментальны ансамбль, з выканаўчым майстэрствам якога добра знаёмы не толькі жыхары рэспублікі. Больш таго, некаторыя з сучасных песень прыйшлі да нас упершыню менавіта ў выкананні гэтага калектыву.

Цяпер можна паспяваць... разам з «Верасамі». Для гэтага дастаткова купіць зборнік «Спяваюць «Верасы», толькі што выпушчаны выдавецтвам «Беларусь», а астатняе ўжо, як кажуць, справа ўласных вакальных даных. У кніжцы змешчаны такія папулярныя песні, як «Завіруха» Э. Ханка на словы Г. Бураўкіна, «Я хаджу закаханы» — яе напісалі кампазітар І. Лучанок і паэт Н. Гілевіч, «Зорка кахання» — плён творчага супрацоўніцтва В. Раінчыка і У. Нікляева і іншыя.

К. МУХІН.

Кансультацыя УААП

ГАНАРАР І ПЕНСІЯ

Як выплачваецца пенсія членам Саюза пісьменнікаў, калі яны працягваюць займацца літаратурнай дзейнасцю і атрымліваюць ганарар?

Л. Н. НОВІКАЎ.

Дзеючымі нарматыўнымі актамі, якімі рэгулююцца пытанні пенсійнага забеспячэння працоўных, устаноўлена, што пенсіі па старасці членам творчых саюзаў назначаюцца і выплачваюцца па нормах і ў парадку, прадугледжаных для рабочых і служачых.

Вылічваюцца пенсіі членам творчых саюзаў з сярэднямесячнага заработку (аўтарскага ганарару) за апошнія 12 месяцаў або за любыя 5 гадоў запар з апошніх 10 гадоў перад зваротам за пенсіяй. Сярэднямесячны заработак вызначаецца шляхам дзялення агульнай сумы заработку за ўказаныя перыяды адпаведна на 12 або 60.

Членам творчых саюзаў, якія займаюцца творчай дзейнасцю і адначасова працуюць у якасці рабочых і служачых, пенсіі па іх выбару вылічваюцца або з аўтарскага ганарару, або з заработку за работу ў якасці рабочага ці служачага.

Пры назначэнні пенсій членам творчых саюзаў у стаж работы ўлічваецца ўвесь перыяд творчай дзейнасці, пачынаючы з дня апублікавання або першага публічнага выканання ці публічнага паказу твора гэтага аўтара. Уключаюцца ў стаж і некаторыя іншыя перыяды, указаныя ў Палажэнні аб парадку назначэння і выплаты дзяржаўных пенсій, напрыклад, служба ва Узброеных Сілах СССР, навучанне ў вышэйшых або сярэдніх спецыяльных навучальных установах і да т. п.

Стаж творчай дзейнасці ўстанаўліваецца пастановамі сакратарыятаў праўленняў творчых саюзаў СССР або саюзных рэспублік.

Найбольш выдатным пісьменнікам, кампазітарам і работнікам выяўленчых мастацтваў па хадайніцтве адпаведных творчых саюзаў, членамі якіх яны з'яўляюцца, устанаўліваюцца персанальныя пенсіі ў парадку, прадугледжаным Палажэннем аб персанальных пенсіях.

Парадак выплаты пенсій па старасці членам творчых саюзаў рэгулюецца прынятай у 1975 годзе пастановай Савета Міністраў СССР.

Гэтай пастановай устаноўлена, што пры выплаце дзяржаўных пенсій па старасці членам Саюза пісьменнікаў, Саюза кампазітараў, Саюза мастакоў і Саюза кінематаграфістаў СССР, якія не з'яўляюцца служачымі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і працягваюць творчую дзейнасць, ганарары за аднаразовыя, выпадковыя, работы (у суме да 70 рублёў у месяц) не ўлічваюцца. Пенсіі ў такіх выпадках выплачваюцца поўнасцю.

Калі ж атрымліваемы ганарар перавышае 70 рублёў у месяц, то выплачваецца 50 працэнтаў (а ў раёнах Урала, Сібіры і Далёкага Усходу — 75 працэнтаў) назначанай пенсіі, але не менш устаноўленага Законам аб дзяржаўных пенсіях мінімальнага размеру пенсіі па старасці, г. зн. 45 рублёў. Напрыклад, калі пісьменнік, які мае пенсію 110 рублёў, атрымаў 100 рублёў ганарару, то ў наступным месяцы яму выплачваецца пенсія ў размеры 55 рублёў (50 працэнтаў ад 110 рублёў).

Ва ўсіх выпадках выплаты пенсій па старасці агульная сума пенсіі і ганарару не павінна перавышаць 300 рублёў у месяц. Пры перавышэнні гэтага размеру адпаведна зніжаецца размер выплачваемай пенсіі. Напрыклад, калі аўтар атрымае 250 рублёў ганарару, то пенсія, устаноўленая ў размеры 110 рублёў, будзе выплачана ў наступным месяцы ў размеры 50 рублёў.

Сумы ганарару ўлічваюцца пры выплаце пенсіі толькі ў тым месяцы, што ідзе за месяцам, у якім ганарар быў атрыманы фактычна. Напрыклад, калі ў сакавіку аўтар атрымаў 2.000 рублёў ганарару, то пенсія яму не будзе выплачана толькі ў красавіку, г. зн. толькі за адзін месяц пасля атрымання ганарару.

Трэба мець на ўвазе, што члены творчых саюзаў — пенсіянеры, каб пазбегнуць лішніх запытаў з боку органаў сацыяльнага забеспячэння, павінны інфармаваць іх у выпадках, калі атрымліваемы ганарар перавышае 70 рублёў у месяц.

С. ШУСТ.

«АДЧУВАЕШ СЯБЕ ЎСХВАЛЯВАНЫМ...»

20 мая ў Мінску завяршыўся XVIII Усесаюзны кінафестываль, прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

СТРАКАТАЯ, бадай, сумбурная і доўгая атрымалася б стужка ў хранікёра, які адважыўся б — кадр за кадрам — скласці кіналетапіс тых майскіх дзён у Мінску.

Мінск. Ранішні, ясны. Блакіт фестывальных сцягоў над праспектам ледзь заўважаеш на фоне спакойнай роўнядзі неба. На плошчы Леніна рэдкія ў такі час машыны не заглушаюць майскага спеву салоўкі (і гэта ў цэнтры горада!). «Выплывае» з дэпо на скрыжаванне вуліц тралейбус, а ў акне — папяровы квадрацік з фестывальнай эмблемай, Гэткія ж квадрацікі відаць праз шкляныя дзверы універмагаў.

Разгар дня. Дом кіно. Журналісты ўжо глянулі першы нумар газеты «Спутник кинофестиваля» — спецвыпуску «Кинонедели Минска». Гартаюць для многіх незнаёмае выданне «Союзэкспортфильма» — «Советский фильм». У свежым, майскім нумары яго — расказ фотакарэспандэнта часопіса І. Гневашава пра здымкі фільма «Ідзі і глядзі» (паводле А. Адамовіча, рэжысёр Э. Клімаў), у якім яму давялося сыграць невялікую ролю. У папярэднім, красавіцкім, змешчаны рэпартаж пра здымкі карціны беларускага рэжысёра І. Дабралюбава «Мама, я жывы!»

Разгар дня, кінатэатр «Піянер». Цікаўныя, засяроджаныя і ўсмешлівыя тварыкі: у рамках фестывалю — XX Усесаюзны тыдзень фільмаў для дзяцей пад дэвізам «Салют, Перамога!» У праграме Тыдня і дзве работы «Беларусьфільма»: прэм'ера стужкі «Мама, я жывы!» і паказ конкурснага фільма рэжысёра М. Лук'янава «Юрка — сын камандзіра». (Гаворка пра іх яшчэ будзе на старонках «ЛіМа»).

Зала Дома кіно. Зялёным агеньчыкам свеціцца экран: ідзе конкурсны прагляд беларусьфільмаўскай «Раданіцы». Артыст Рускага тэатра БССР імя М. Горкага В. Бандарэнка, які здымаўся тут у галоўнай ролі, расказвае:

— Звычайна рэжысёр-дэбютант дзеля большай упэўненасці ў выніках працы запрашае ў карціну папулярных выканаўцаў. На ўсякі выпадак: маўляў, «зоркі» заўсёды выратуюць фільм. А рэжысёр-пастаноўшчык «Раданіцы» Юрый Марухін, лічу, браў на сябе вялікую адказнасць, рызыкаваў, даручаючы ролю Івана Каваля мне — для шырокага гледача акцёру «з невядомым тварам». У эпізодах я, праўда, неаднойчы здымаўся, а «Раданіца» — ужо кінадэбют. Назіраючы за сабой на экране, злуюся, як большасць акцёраў. Невыноснае пачуццё: нічога ўжо нельга перайначыць, выправіць, перанесці «на заўтра», як можна ў тэатры пасля няўдалага спектакля!

Уменне працаваць на здымачнай пляцоўцы даецца практыкай, Ды мне дапамагалі і парады вопытнага майго таварыша па сцэне, вядомага як і кінаакцёра, Расціслава Іванавіча Янкоўскага. Спрыяла і тое, што поруч здымалася Аляксандра Іванаўна Клімава — у ролі Лёксы, маці майго героя. З ёю мы партнёры ў сур'ёзных спектаклях: «Гамлет», «Салодкагалосая птушка юнацтва»... Дарэчы, іграючы ў «Салодкагалосай...» пад час паралельнай работы над фільмам, мы з Аляксандрай Іванаўнай заўважылі, як прыёмы кіно неўпрыкмет увайшлі ў нашы сцэнічныя паводзіны. З'явілася нейкая нетэатральная, больш даверальная, як на буйным плане ў кадры, інтанацыя голасу, больш удумлівы і праніклівы позірк, больш глыбокая паўза. І спектакль наш тады атрымаўся даўжэйшы... А на тэатры ж і голас нельга сцішваць да мармытання, і жэст мае быць выразны — інакш што пачуе, што зразумее глядач у 12—14 радзе? Вось такі парадокс: кіно — тэатр...

Хлебам-соллю сустракалі гасцей у Вязынцы.

Народная артыстка СССР Л. Смірнова на радзіме Янкі Купалы.
Фота Ул. КРУКА.

ЭКРАННЫ ЧАС конкурснай праграмы — каля 90 гадзін. Гадзіны сустрэч з ужо знаёмымі кінагероямі ці дакументальнымі кадрамі. І гадзіны першых знаёмстваў — знаёмстваў, як у жыцці бывае, выпадковых і не надта прыемных, неспадзяваных і прыцягальных.

Своеасаблівы прыцягальны зарад у новым фільме Літоўскай студыі «Атрад» рэжысёра А. Сіманава. Адметны, варты ўвагі фільм: у ім арганічна спалучаюцца гістарычная канкрэтнасць (група савецкіх воінаў-акружэнцаў прабіваецца да Чырвонай Арміі праз Літву, Беларусь, паўночна-заходнія раёны Расіі) і мастацкая сімволіка, лакалізацыя сюжэта і абагульненне, немудрагелістасць слоў і шматзначнасць дыялога. Сумленная і ўдумлівая работа — «Падарожжа маладога кампазітара» грузінскага рэжысёра Г. Шэнгелая. Экраннае апавяданне, што ў анатацыях скупа і не зусім дакладна вызначана як фільм пра падзеі пасля рэвалюцыі 1905—1907 гадоў у Расіі, успрымаецца як мудрая і вечная прытча.

Гэтыя фільмы, ды ці толькі гэтыя, давалі спажыву гледачам і крытыкам для доўгіх «пазаэкранных» размоў. Сустрэцца, пагаварыць з некаторымі стваральнікамі фестывальных фільмаў можна было і на прэс-канферэнцыях. У час такіх тэматычных гутарак за «круглым сталом» Дома кіно гучала трывога за прагалы і недапрацоўкі ў рэпертуары для падлеткаў, а яны ж сёння — 70 працэнтаў кінааўдыторыі! За няўменне работнікаў пракату рэкламаваць і «падаваць» дакументальныя фільмы, якія выклікалі б павышаную цікавасць гледача. За «круглым сталом» па праблемах рэжысуры коратка і рэзка прынцыпова прагучала слова народнага артыста СССР, рэжысёра «Кіргізфільма» Т. Акеева:

— Не будзем баяцца параўнання кінарэжысёра з буйнымі грамадскімі дзеячамі: у ягоных руках магутная ідэалагічная зброя, сродак уздзеяння на масы, — кіно. Як важна, у чыіх яна руках! У святле нядаўніх партыйных рашэнняў, выступленняў таварыша М. С. Гарбачова, у святле падрыхтоўкі краіны да XXVII з'езда Камуністычнай партыі трэба рабіць выснову: спыніць халтуру на экране! Даць дарогу тым, хто працуе шчыра, з любоўю да ўсяго, што трэба сцвярджаць, з нянавісцю да таго, што трэба адмаўляць. Мы наладжваем фестываль, выдаткоўваем сродкі і час, з прадпрыемстваў-шэфаў адцягваем людзей ад работы — а ці заўсёды апраўданыя такія выдаткі, калі меркаваць па нашых фільмах? Чаму рэжысёрам сёння можа зрабіцца ці не кожны? Засмучае, што і маладыя вучацца вытанчана рабіць «сярэднюю халтуру», да якой фармальна і не прыдзярэшся. А жыццё патрабуе рабіць востракрытычныя фільмы, а сапраўдны мастак адчувае праблемы, прадбачыць заўтрашнюю сітуацыю, не чакаючы, як дазволу, адпаведнай дырэктывы на адлюстраванне тых ці іншых з'яў жыцця. Ды чамусьці цяжка, з тармазамі перастрахоўкі, выходзяць да гледача такія вострыя, адметныя фільмы. Затое вывадаў наконт ідэйна-мастацкай халтуры, браку нібыта і не робіцца. Вельмі важна, каму давяраецца камера, стужка, мільённыя сродкі, каму даецца права працаваць рэжысёрам кіно!

ПЕРАД ТЭЛЕКАМЕРАЙ, перад мікрафонам, у інтэрв'ю газетнаму рэпарцёру, у прафесійнай размове, на сустрэчы з гледачамі... Усюды, не баючыся паўтарыць адно аднаго, гаварылі ўдзельнікі і госці фестывалю: «На беларускай зямлі адчуваеш сябе ўсхваляваным...» Гаварылі тыя, хто добра ведае пра горкую долю Беларусі ў мінулай вайне, і тыя, хто ўпершыню наведаў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, пабываў у Хатыні, у крэпасці-героі Брэсце. Сярод іх былі кінематаграфісты краін сацыялізму і тыя прагрэсіўныя дзеячы мастацтва іншых дзяржаў, якія выкрываюць у сваіх фільмах фашызм і мілітарызм, усе формы дыктату і прыніжэння чалавечай годнасці.

Сёлетні кінафорум, вядома, асаблівы, прымеркаваны да знамянальнай даты. І ўпершыню за 20-гадовую гісторыю ўсесаюзных кінафестываляў быў праведзены сімпозіум «Антыфашысцкая тэма ў кінамастацтве» з удзелам замежных гасцей.

— У Мінск я прыехаў з Патсдама, дзе была наладжана аналагічная размова пра антыфашысцкія стужкі, створаныя кінематаграфістамі краін сацыялістычнай садружнасці,— гаварыў Герой Сацыялістычнай Працы, народны артыст СССР кінарэжысёр С. Герасімаў. — Беларусь была прадстаўлена там значным творам — вядомай карцінай Віктара Дашука. Ён жа выступаў ад імя беларускіх кінематаграфістаў, цікава і змястоўна. Для Беларусі ваенная тэма — крэўная тэма, Яна — з пакут і з подзвігу беларускага народа. Яе стане, каб жывіць яшчэ доўга карціны і іншых студый краіны. Сёння ўсе намаганні імперыялізму скіраваны на тое, каб умяшацца ў жыццё дзяржаў з іншым укладам. А моладзь наша, бывае, глядзіць на гэта праз пальцы, пераводзячы стрэлку гадзінніка на мірнае «геданістычнае» жыццё. І вось на карціне Дашука адчуваеш нібы абуджэнне ад нейкага сну, супакоенасці. Яна трывожыць, хвалюе...

Удзельнікі сімпозіума нават не рабілі перапынкаў у сваёй трохгадзіннай гаворцы. Выступалі кінематаграфісты Савецкага Саюза, ЧССР, Польшчы, ГДР, В'етнама, Балгарыі, Кубы, Манголіі, ВНР, Румыніі, Фінляндыі, КНДР. Выступалі з асуджэннем спробы некаторых заходніх ідэолагаў і дзеячаў кіно рэвізаваць вынікі другой сусветнай вайны. Разважалі пра невычарпальнасць тэмы трагічных 40-ых, з якой цесна звязаны і актуальныя паняцці міру, гуманізму, патрыятызму, інтэрнацыянальнага абавязку дэмакратыі. Гаварылі пра абавязак і правы маладога пакалення не паўтараць ужо апрабаванае экранам, а шукаць новыя сродкі, уласцівую новаму пакаленню манеру для раскрыцця і даследавання праўды і ўрокаў мінулага — і ў дакументальным, і ў іграым кіно. Заклікалі давяраць работу над такімі стужкамі людзям сумленным, мастакам сапраўдным, ствараючы для іх працы належныя матэрыяльна - тэхнічныя ўмовы. І не дапускаць з'яўлення шаблонных і раўнадушных, «парадных» фільмаў, якія дыскрэдытуюць высокую і вострападзённую тэму.

Каб увесь свет не ператварыўся ў Хатынь, нельга рабіць пудзіла з новай пагрозы вайны. Трэба працаваць у мастацтве з верай у разумнага гордага чалавека, здольнага перамагчы цемрашальства і не дапусціць гібелі Зямлі.

... Аціхлі хваляванні фестывальных сустрэч і дыскусій. Абвешчаны вынікі работы журы. Цяпер ужо ў «рабочым парадку» будуць выходзіць новыя фільмы на экраны Мінска, рэспублікі. Лепшыя з гэтых фільмаў адкрыў аматарам кіно XVIII Усесаюзны.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

У Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнікі кінафестывалю сустрэліся з Героем Савецкага Саюза М. Осіпавай.

Стваральнік кінаэпапеі «Перамога», якая атрымала адзін з галоўных прызоў фестывалю, народны артыст СССР Я. Мацвееў гутарыць з паэтам У. Някляевым.

КІНО

ЖУРЫ НАЗЫВАЮЦЬ ПЕРАМОЖЦАЎ

Завяршыўся XVIII Усесаюзны кінафестываль, які праходзіў у горадзе-герої Мінску. Журы ўсіх чатырох конкурсаў назвалі лепшыя работы.

Спецыяльнага прыза і дыплома аргкамітэта фестывалю ўдастоена дылогія «Перамога» («Масфільм»).

Галоўны спецыяльны прыз і дыплом фестывалю прысуджан мастацкаму фільму «Атрад» (Літоўская кінастудыя) за адлюстраванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Кінарэжысёр С. Герасімаў удастоен Галоўнага спецыяльнага прыза і дыплома фестывалю за фільм «Леў Талстой» (Цэнтральная кінастудыя дзіцячых і юнацкіх фільмаў імя А. М. Горкага).

Галоўнымі прызамі і дыпломамі фестывалю адзначаны «Патомак белага барса» («Кіргізфільм»), «Падарожжа маладога кампазітара» («Грузія-фільм») і «Танга нашага дзяцінства» («Арменфільм»).

Прыз і дыплом фестывалю за рэжысуру атрымлівае М. Губенка — пастаноўшчык фільма «І жыццё, і слёзы, і любоў» («Масфільм»). Прыз «Памяць» і дыпломы фестывалю прысуджаны стужкам «Раданіца» («Беларусьфільм») і «Фронт у бацькоўскім доме» (Рыжская кінастудыя).

Лепшай мужчынскай роляй названа работа Ф. Нікіціна ў фільме «І жыццё, і слёзы, і любоў». Прыз і дыплом фестывалю за лепшую жаночую ролю прысуджаецца Г. Новенц — выканаўцы адной з галоўных роляў у фільме «Танга нашага дзяцінства».

Прызамі і дыпломамі фестывалю адзначаны дэбют рэжысёра В. Бутурліна ў фільме «Апладысменты, апладысменты...» («Ленфільм») і лепшая аператарская работа Л. Пааташвілі ў стужцы «Падарожжа маладога кампазітара».

Прызы і дыпломы фестывалю атрымліваюць мастак Ю. Кладзіенка за лепшае мастацкае афармленне ў фільме «І жыццё, і слёзы, і любоў» і рэжысёр Х. Нарліеў за паэтычнае ўвасабленне гістарычнай тэмы ў карціне «Фрагі — разлучаны са шчасцем» («Туркменфільм»).

Памятны прыз і дыплом журы прысуджан кінадраматургу Я. Грыгор'еву за сцэнарый фільма «Атрад». Спецыяльных дыпломаў журы за распрацоўку палітычнай тэмы ўдастоены стваральнікі карцін «Еўрапейская гісторыя» («Масфільм»), «Дзве версіі аднаго сутыкнення» (Адэская кінастудыя), «Канкан у англійскім парку» (студыя імя А. Даўжэнкі).

Журы мастацкіх фільмаў для дзяцей і юнацтва першы прыз вырашыла не прысуджаць. Прызоў журы ўдастоены стужкі «Чыора» («Грузія-фільм»), «Вера, Надзея, Любоў» (кінастудыя імя М. Горкага), «Добрыя намеры» (студыя імя А. Даўжэнкі). Прыз журы за лепшае ўвасабленне тэмы маральнага станаўлення падлетка прысуджан фільму «Салодкі сок унутры травы» («Казахфільм»).

Дыпломамі журы адзначаны дзіцячы гумарыстычны кіначасопіс «Ералаш» за яркае і паслядоўнае развіццё камедыйнага жанру ў кінематографе для дзяцей (кінастудыя імя М. Горкага), за рэжысёрскі дэбют — пастаноўшчык фільма «Мая маленькая жонка» Р. Баніёніс (Літоўская студыя) і малады акцёр Г. Апцыауры за выкананне ролі Чыоры ў аднайменнай стужцы грузінскіх кінематаграфістаў.

Журы конкурсу дакументальных і навукова-папулярных фільмаў Галоўны спецыяльны прыз за лепшы фільм на ваенна-патрыятычную тэму прысудзіла дзвюм карцінам — «Маршал Жукаў. Старонкі біяграфіі» (Цэнтральная студыя дакументальных фільмаў) і «У вайны не жаночы твар» («Беларусьфільм»). Галоўны прыз за лепшы фільм фестывалю атрымлівае стужка «Да небяспечнай мяжы» (Рыжская кінастудыя). Прыза за лепшы кароткаметражны фільм удастоена карціна «Чаканне» («Арменфільм»). Стужка «Тады, у 45-м» (Ленінградская студыя дакументальных фільмаў) адзначана прызам за яркае ўвасабленне высокага маральнага аблічча савецкіх воінаў-пераможцаў.

Прыз за публіцыстычнае адлюстраванне на экране антываеннай тэмы прысуджан фільму «Пагроза Еўропе — пагроза міру» (кінастудыя Міністэрства абароны СССР). Дыплому журы ўдастоены аўтары карціны «Дзень і век» («Грузія-фільм») за эксперыментальную распрацоўку метаду працяглага кінаназірання, а таксама рэжысёр Украінскай студыі хранікальна-дакументальных фільмаў А. Фернандэс за адлюстраванне на экране тэмы інтэрнацыянальнага адзінства ў барацьбе з фашызмам.

Па раздзеле навукова-папулярных фільмаў галоўны прыз за лепшы фільм фестывалю прысуджан кінатрылогіі «Нэру» (Цэнтральная студыя навукова-папулярных і навучальных фільмаў). Галоўнага прыза за глыбокае раскрыццё даследчай работы вучоных удастоен фільм «Зорка Вавілава» (Кіеўская студыя навукова-папулярных фільмаў).

Прызам за прапаганду і раскрыццё актуальных праблем развіцця народнай гаспадаркі адзначан фільм «Ля нафтавага кантынента» (Ленінградская студыя навукова-папулярных фільмаў).

Дыпломамі журы ўзнагароджаны стужкі: «Хто выправіць памылку Дэметры?» («Беларусьфільм») за арыгінальнае ўвасабленне важнай экалагічнай праблемы і «Туйдук» («Туркменфільм») за паэтычнае ўвасабленне тэмы народнай творчасці.

У конкурсе мультыплікацыйных фільмаў першы прыз і дыплом журы прысуджаны стужцы «Будзе ласкавы дождж» («Узбекфільм»). Два другія прызы і дыпломы журы атрымалі фільмы «Знаходлівы селянін» («Арменфільм») і «Іржавы рыцар» («Грузія-фільм»).

Лепшым мультыплікацыйным фільмам для дзяцей журы назвала стужку «Асцярожна, малпачкі!» («Саюзмультфільм»). Прыз і дыплом журы за лепшы дэбют уручан мультыплікацыйнаму фільму «Навагодняя казка» («Талінфільм»), за лепшы лялечны фільм — карціне «Чорна-белае кіно» («Саюзмультфільм»).

Прыз Саюза пісьменнікаў Беларусі і дыплом журы за арыгінальнае вырашэнне сучаснай казкі прысуджан фільму «Не шамацець!» («Беларусьфільм»). Дыпломы журы ўручаны: за паэтычнае вырашэнне ваенна-патрыятычнай тэмы — мультыплікацыйнаму фільму «Калыханка» (Кіеўская кінастудыя навукова-папулярных фільмаў); за выдумку, вынаходлівасць і дасціпнасць — фільму «Небыліцы» («Талінфільм»); за арыгінальнае выяўленчае вырашэнне — стужцы «Загадка» (Літоўская кінастудыя); за паспяховую экранізацыю рускай класічнай казкі — фільму «Казка пра цара Салтана» («Саюзмультфільм»).

Прызы і дыпломы кінематаграфістам краіны ўручылі таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

БЕЛТА.

ВІНШУЕМ

...І ВЫПРАМЕНЬВАЕ СУТНАСЦЬ

Народнаму артысту БССР Анатолю ТРУСУ — 75

Маладым і гарэзлівым хлопцам уварваўся ён на падмосткі колішняга Другога БДТ. Больш як пяцьдзесят гадоў назад было гэта. Яго сябрамі і паплечнікамі па тым спектаклі выступалі такія ж, як і Анатоль Трус, студыйцы, выхаванцы М. Мішкевіча, К. Санікава і Ц. Сяргейчыка. Прэм'ера ў верасні трыццаць чацвёртага — «Цудоўны сплаў». Камедыя В. Кіршона. Героі — маладыя супрацоўнікі навукова-даследчага інстытута, захопленыя ідэяй стварэння высакаякаснага сплаву металу. Самі яны і не падазраюць, што іх парыванні, радасці і расчараванні, неўтаймаваны тэмперамент і пошук свайго месца ў асяроддзі аднагодкаў — гэта таксама працэс загартоўкі новага маральнага і этычнага сплаву. Садружнасці, як такі казалі, энтузіястаў. Калектыву юных будаўнікоў новага грамадства.

Здаралася так, што А. Трусу выпадала з цягам часу пераўвасабляцца ў характары герояў зусім пэўнага характару, з устойлівымі рысамі і звычкамі ў тэмпераментных праявах страсці. Жыццё і іх нечаму вучыць, бывае, падманвае, засмучае, прасвятляе. І гэтыя «ўрокі жыцця» вымушаюць персанажаў А. Труса вымаўляць то гнеўныя філіпікі, то рэзанёрскія сентэнцыі. Бадай, адзіны яго Мацей у «Несцерку» В. Вольскага застаецца на працягу ўсяго сцэнічнага існавання амаль маўклівай асобай. Ды і тут хітруе мужык: яму так лягчэй жыць, робячы выгляд і сапраўды зацюканага ўладарнай жонкай, пакорлівага і лагоднага. І ў такой маўклівай плыні паводзін Мацея артыст раскрывае штосьці накшталт жыццёвай філасофіі.

А якім маляўнічым мастацкім тэмпераментам афарбоўвае А. Трус постаці людзей, чые паводзіны і лёс і на самой справе могуць быць павучальнымі!

...Дэмакратычным лібералам хоча выглядаць яго Захар Бардзін («Ворагі» М. Горкага). Прадстаўнік пануючага класа, заводчык, гэткі рэспектабельны буржуа, ён карыстаецца кожным зручным момантам, каб пагаварыць на ўвесь голас пра тое, што нібыта добрыя ўзаемаадносіны паміж прадпрымальнікамі і рабочымі выгадныя для абодвух бакоў. Яму нават прыемна, што аб ім «у губерніі», бывае, гавораць, быццам Захар Бардзін — «чырвоны». Ды паступова сапраўднае аблічча гэтай «махровай кветкі расійскага лібералізму», як вобразна характарызаваў Бардзіна пастаноўшчык спектакля І. Судакоў, паўставала перад усімі ў сапраўднай жорсткасці перакананага і заўзятага «гаспадара жыцця» ў манархічнай Расіі, дзе, маўляў, сацыяльнае абнаўленне зусім непатрэбная раскоша, бо працоўны люд мае адну прывілею — памнажаць багацце Бардзіных. А жыць хочацца з гэтай амаль што небяспечнай і такой «прыгожай» мянушкай — «чырвоны» ліберал! Ах, яны там нешта патрабуюць, дыктуюць свае ўмовы, упарцяцца — ну, тады будзем абараняць годнасць фабрыкантаў і запросім сюды жандараў... Гэта ж так лагічна! Для каго? Для яго, Захара Бардзіна, вядома.

Дасюль помніцца «Рэвізор» у коласаўцаў другой паловы 40-ых гадоў. Які вальяжны, сыты, ганарлівы быў Амос Фёдаравіч Ляпкін-Цяпкін. Здавалася, што персанажу А. Труса выпадкова дадзена прозвішча ад «цяп-ляп», ды неўзабаве пасля знаёмства з суддзёй мы пераконваліся, што гэта фігура і страшная ў сваёй чыноўнічай зацятасці лайдака. Праўда, Амос Фёдаравіч то тут, то там спяшаўся засведчыць сваю адукаванасць і цытаваў розныя быццам прачытаныя ім кнігі («Наперад пусціць галаву, духавенства, купецтва; вось і ў кнізе «Дзяянні Іаана Масона»... — так выпрацоўвае ён сцэнарый цырымоніі сустрэчы рэвізора са сталіцы). Калі ж узнікае пагроза рэвізіі і ў судзе, ды — што а таго? «...Загляне ў якую паперу, дык жыццю не будзе рад. Я вось пятнаццаць гадоў ужо сяджу ў судзейскім крэсле, а як углыблюся іншы раз у запіску — а! толькі рукой махну. Сам Саламон не разбярэ, што ў ёй праўда, а што няпраўда...» Усмешка яго была цынічнай. Гэты Амос Фёдаравіч не баяўся ніякага рэвізора.

Калі ж Хлестакоў напусціў страху на чыноўнікаў тым, што ён і ў царскі палац ездзіць, і нават дзяржаўны савет распякае, суддзя насцярожыўся. Як смешна яго добраахвотнае адмаўленне ад тытула павятовага Цыцэрона: «Што вы: Цыцэрон!.. Выдумалі! Што іншы раз захопішся, гаворачы пра псярню ці ганчака... Адчапіцеся, панове!» Таму ўдвая смешна было глядзець сцэну, дзе Хлестакоў нечакана бачыць на падлозе асігнацыі, якія толькі што тырчэлі з кулака суддзі. Грошы? Калоцячыся ад страху, хабарнік Ляпкін-Цяпкін вымаўляе: «Зусім не!..» Рэвізор прапануе пазычыць іх яму, Івану Аляксандравічу Хлестакову, што А. Ільінскі рабіў так, быццам выратоўвае наведвальніка, і той калоціцца ўжо ад радасці: «Гэта такі гонар!..»

Суддзя ў А. Труса быў першым канкурэнтам Гараднічага. І калі таму заззяла зорка, Амос Фёдаравіч амаль з трагедыйным адчуваннем непрадбачанасці лёсу пагражаў: «Ну, брат, не, да гэтага яшчэ далёкая песня. Тут і лепшыя за цябе ёсць, ды дагэтуль яшчэ не генералы». Лепшыя? Так, гэта ён, Ляпкін-Цяпкін, першая асоба ў горадзе. Пазней менавіта ён патрабуе пакараць вінаватых у тым, што нават яго, Цыцэрона, абкруціў гэты — яшчэ добра, калі толькі абармот, а можа, і яшчэ горш... Не будзе цяпер спакою Бобчынскаму з Добчынскім за тую чутку пра рэвізора, пэцкалі праклятыя, смарчкі каратка-пузыя!.. Суддзя стараецца ўзбіцца на «цыцэронаўскую ноту», атрымліваецца лаянка...

Многа сапраўды шэкспіраўскага было ў каралі Ліры, ролю якога А. Трус упершыню выконваў дваццаць гадоў назад. Менш за ўсё клапаціўся артыст пра выяўленне каралеўскай велічы ў характары гэтага і сапраўды вельмі моцнага чалавека на троне. Духоўнае запатрабаванне пазнаць свет і людзей зводзіць яго з трона, і герой А. Труса пачынае бачыць сапраўднае аблічча дачок, прыдворных, нядаўніх васалаў і пакорлівых выканаўцаў сваёй волі. Кароль без кароны на галаве — ніхто! Дык жа ёсць абавязкі дачкі, ёсць дружба, замацаваная сумесна пралітай на полі бою крывёй, ёсць прызначэнне чалавека... Няма нічога святога на зямлі, — адказвае яму лёс. І гэты вулканічны тэмперамент выпраменьвае ласку няшчасным, прыгнечаным, бедным, спрабуе зразумець злыдняў і здрайцаў... Здаецца, стары губляе розум, калі спавядальна кідае абвінавачанні ворагам праўды і дабрыні:

...Ты, клятваадступнік
З аблічам ангела, а з сэрцам змея,
І ты, прыблуднік
І кровазмяшальнік
З праўдзівым тварам,
бруднаю душою,—
Раскрыйце тайнікі сваіх учынкаў,
Прыстаніўша брыдот,—
І на калені
Прасіць памілавання!
Я не гэтак
Перад другімі грэшны,
як другія
Перада мной...

Кароль Лір і памірае з глыбока прытоенай верай у здольнасць чалавека ачысціцца ад бруду, ад забабонаў, ад асляплення ўладай і багаццем.

...Вобраз дзеда Макара («Востраў Алены» Я. Шабана). Артыст тонка малюе сучасны па мастацкіх фарбах, па псіхалагічнай матывіроўцы паводзін партрэт сучасніка. У п'есе трактуецца даволі складанае пытанне пра адказнасць сталага чалавека за свае ўчынкі перад дапытлівым позіркам маладога пакалення. Што ты робіш і як ты гэта робіш — зусім неабыякава для тваіх дзяцей, тваіх унукаў. Крыху просталінейна драматург супрацьпаставіў прафесару-гуманітарыю вясковага дзеда, але артыст А. Трус адчуў у ролі магчымасць выявіць і сваё асабістае, сваё грамадзянскае ўяўленне пра чалавечы абавязак.

Без надакучлівай дыдактыкі яго дзед Макар вучыць нас прыкладам свайго жыцця, сваёй адданасці і паслядоўнасці аднаму вельмі важнаму прынцыпу. З якой выпакутаванай шчырасцю гучыць яго споведзь у вуснах А. Труса: «Мне сказалі—ідзі і забівай, і я сцяў зубы і пайшоў забіваць, таму што разумеў: калі я не зраблю гэтага з імі, то яны зробяць гэта са мною. Пасля мне сказалі — ідзі ажыўляй мёртвую зямлю, і я пайшоў ажыўляць мёртвую зямлю, ачышчаць яе ад попелу і гары, саджаць на ёй дрэвы, сеяць хлеб, будаваць хаты... Калі я гэтага не зраблю, то хто ж тады?.. Казалі—ідзі, і я ішоў; казалі—рабі, і я рабіў. Але я заўсёды цвёрда разумеў, што я раблю і дзеля чаго...». Гэтым можна ганарыцца. Ды не тое патрэбна Макару, а каб жылі па такіх вось прынцыпах яго дзеці і ўнукі: разумеючы, што яны робяць і дзеля чаго...

Зала заўсёды горача апладзіравала споведзі Макара. Мабыць, і сапраўды артыст А. Трус умее ўносіць у ролю штосьці ад свайго разумення жыцця, ад сваіх чалавечых турбот і свайго роздуму аб прызначэнні чалавека. І ў драматычных вобразах, і ў камедыйных. І ў Старцу («Раскіданае гняздо» Я. Купалы), і ў Мітрычу («Улада цемры» Л. Талстога), і ў Шыковічу («Сэрца на далоні» І. Шамякіна), і ў Гусляры («Лявоніха» П. Данілава), і ў Андрэі Прозараве («Тры сястры» А. Чэхава), і ў Цярэнціі Бубліку («Платон Крэчат» А. Карнейчука), і ў Барабошаве («Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага)... І ўсюды артыст, выпраменьвае сутнасць характару.

З. АКУЛІЧ.

24 мая — Дзень балгарскай асветы і культуры, славянскай пісьменнасці і друку, нацыянальнае свята Народнай Рэспублікі Балгарыі

Хрыста РАДЗЕЎСКІ,

Герой Сацыялістычнай Працы, народны дзеяч культуры НРБ, лаўрэат Дзімітраўскай прэміі.

Душа народа

О, мова, колькі ты перажыла!
Цябе паганіў пошласцю газетчык
і правапісец «нормамі» калечыў,
ды вольнай і вялікай ты была,
калі цябе, натхнёна і без змусты,
шапталі шэрхлыя, сухія вусны!

Ад старажытнасці ты з роду ў род
плывеш патокам, што ідзе з прадоння,
і яснату нябёс нясеш раздольна,
і шчодрае зямлі ўбіраеш пот.
Не змуцяць і не сплюндраць ягамосьці
ні чысціні тваёй, ні маладосці.

Калі вякамі кат душыў на смерць
маю радзіму, каб не паднялася,—
ты не загінула, не паддалася,
прайшла праз стогн, праз плач і горкі
смех,

і з тла, пажараў,
нібы птушка фенікс,
паўстала песняй волі і збавення.

Ты, як і твой няўрымслівы народ,
штодня спраўляеш хрэсьбіны на шчасце:
калі тваё старое слова згасне
і адпадзе, як звялы, ссохлы плод, —
тады ўзамен—
пяшчотна і сурова—
дзесь нараджаецца другое слова.

І ты жывеш, цвіцеш і зіхаціш
у новых песнях, новых эпапеях—
як і Балгарыя жыве-квітнее.
І ўсё вальней крынічыш і бурліш,
прыгожая і гордая заўсёды,
ты—несмяротная душа народа.

Шчаслівая

Як дзелавіта барабаніць дождж!
Жывую вільгаць прагна смокча ніва.
Зялёнай кроўю дол зазеляніла,
ажыў і волат-дуб і дробны хвошч...
І чуецца, гляджу, зямля шчасліва.

Шчасліва!
Закіпелы чарназём
зялёным морам пеніцца, бушуе,
шуміць—нібыта ўладна рапартуе
у безліч вуснаў маладых:
— Расцём!
І лета перамогу адсвяткуе!

Так, адсвяткуе!
Сонцам скрозь лісцё
даспелы плод заззяе на галінцы,
і ўсе свае раскрые таямніцы
сагрэтае праменнямі жыццё,
чыёй хадзе не ведамы граніцы.

Мая магіла

На пустыры, зарослым крапівой
ды бур'яном,
сваю магілу бачу.
І ні пліты, і ні крыжа на ёй—
ніхто нічым прытул мой не пазначыў.

Дождж будзе ліць,
сухмень агнём паліць,
шумлівы лес—то спеў, то плач заводзіць,
А я? Ці ж мне ў халодным доле гніць,
калі ўсё ходырам наўкола ходзіць?

Я—не мярцвяк, не мумія ў жыцці,
і ў смерці я
не стану мёртвым прахам.
Я буду дыхаць з цемрава жарствы
пяшчотаю, пагрозаю і страхам.

Калі з зямлёй зраўняецца грудок—
узыдзе колас,
закрасуюць зёлкі,
і з іх зірнуць, праглянуць, як з аблок,
маіх заплюшчаных вачэй вясёлкі.

У нейкі ж дзень—
у розгары вясны—
там двое закаханых пройдуць сцежкай,
і ён сарве маленькі цуд зямны
і ёй падорыць з ласкавай усмешкай.

У іх вачах каханне ўспалыхне
і воля да жыцця.
Яшчэ бязгрэшных,
пажар ахопіць іх—той, што мяне
паліў няшчадна і спаліў дарэшты.

●

Ці ты прыгожая—
не знаю сам
і не збіраюся пытаць нікога.
Я да цябе іду так, як у храм
ідзе набожны з вераю у бога.

Люблю, як чысты сэрцам чалавек
сваю радзіму любіць—
дом свой родны.
Хваробай гэтай хворы я навек
і выздаравець не хачу, не згодны!

●

Не міл я крытыкам дзябёлым.
А чытачы—
стракаты люд:
адны—захоплены футболам,
другія—ім мой верш не люб.

Ды я пяра не выпускаю
і не мяняюся—бо знаю:
жыццё ёсць сад—
цудоўны, весні,
я—птушка ў ім,
паветра—ты.
І не магу не пець я песні,
дзе столькі гоства, пекнаты.

Несмяротная

Ці ты позна, ці рана радзілася,
мова родная—доля мая,
і калі тваё слова зрабілася
вострым мечам—не ведаю я.

Толькі знаю, што ў часы праклятыя
ты расла ліху-злу насупор.
І выткоўвалі мары крылатыя
у народнай душы твой убор.

Колькі болю народ табой выказаў,
колькі радасці, колькі тугі—
каб магла ты падняцца так высака,
так натхнёна крышыць ланцугі!

Столькі фарбаў знайсці незаменістых,
столькі гукаў з жыцця пераняць,
так у боцеўскіх вершах праменіцца,
у дзімітраўскіх словах палаць!

Шматпакутная наша гісторыя—
каб не дух твой—якою б была?
Ты сваёю красой непаўторнаю
ёй магутныя крылы дала.

Быў бы край наш, цудоўны з адвечнасці,
нічыім сярод свету ўсяго,
калі б ты не аформіла велічна
прыгажосці нястройнай яго!

Хай жа мудрасць, у муках здабытая,
і дзіцячай душы чысціня
уваходзяць з табой, самавітаю,
у турботы радзімы штодня.

Бачыш: крылы распространы з годнасцю,
ім не страшны ні смерць, ні праклён.
Дык вянчай жа сваёй несмяротнасцю
нашых спраў, нашых клопатаў плён!

І шчасце ёсць

Зацвіў, прыбраўся ў краскі луг,
кусты і дрэвы ў кветках яркіх.
Цвітуць сады і ружы ў парках,
і долы квецяцца наўкруг.

Вось сіні квет—залюбавацца!
Але калі б ты толькі знаў,
як ён упарта прабіваў
зямлю—каб жыць і красавацца!

Сцяблінны ў поце аж блішчаць,
калі красу раджае поле,
і гэта таінства ніколі
ты не здалееш разгадаць.

Ды бачыш: скрозь перамагае—
што жыць павінна і квітнець.
Абшар калышацца ледзь-ледзь —
і моц і веліч набывае.

Цвіціце ж, зёлкі, травы, дрэвы!
Хай ваш магутны, шчодры цвет
сцвярджае ўсцяж:
— Прыгожы свет!
І ў шчасце, людзі, верыць трэба!..

Пераклаў з балгарскай
Ніл ГІЛЕВІЧ.

«ДРЭВЫ ВЯСНОЮ, ЯК ЛЮДЗІ...»

Мастак-аматар Мікола Ерафееў галоўнай сваёй майстэрняй лічыць... дзіцячы парк імя Горкага ў самым цэнтры беларускай сталіцы. Менавіта тут, у парку, што ператварыўся ў сапраўдны музей драўлянай скульптуры, «кватаруюць» пад небам шматлікія персанажы ерафеўскіх твораў: зубры, мядзведзі, лясныя звяркі і птахі, героі паданняў, казак і легенд. І, як у кожным музеі, тут багата наведвальнікаў штодзень, балазе працуе парк без выхадных. У гэтай майстэрні пад высокім небам і нарадзіліся сапраўдныя «драўляныя навелы». І ў кожнай ёсць месца народнаму гумару і спагадзе, іроніі і гіпербале — адвечным спадарожнікам майстроў. Толькі глядзі і дзівіся...

Пра што ж расказваюць, пра што спрачаюцца, пра што вядуць «маўклівую гаворку» драўляныя шэдэўры Міколы Ерафеева? Найперш пра дабрыню і самабытны талент беларусаў, пра іх аптымізм і хараставо душы, і яшчэ пра мару, — сцвярджае дакументальны фільм Беларускага тэлебачання «Жывая дрэва душа».

Дрэва, па словах знаўцаў, даволі зручны і падатлівы матэрыял для фантазіі, для стварэння персанажаў, бо «душа» дрэва, сагрэтая цеплынёй рук таленавітых майстроў, ажывае...

Дрэвы вясною, як людзі... Але дакументальны фільм не толькі пра гэта. Ён не толькі пра творчы плён сённяшніх разьбяроў па дрэве. Фільм яшчэ і пра вытокі беларускай драўлянай скульптуры. Гледачу даводзяць, што рамяство гэта існуе на Белай Русі здавён, і здавён спадарожнічае яно людзям майстравым, цікаўным і таленавітым, якія пакінулі свае «аўтографы» ў гранавітых палатах Маскоўскага Крамля і ў шыкоўных палацах Пецярбурга, у старажытным Суздалі, у Ноўгарадзе і Полацку. Не згубіўся почырк майстроў беларускай драўлянай скульптуры ні ў віхуры стагоддзяў, ні ў полымі пажараў і войнаў. Эстафету знакамітых майстроў Сямёна Палубеса і Кіма Міхайлава падхапілі прадстаўнікі другіх пакаленняў, каб захаваць і перадаць свае творчыя сакрэты разьбярам сённяшніх дзён.

Як і некалі, драўляная скульптура і сёння цешыць вока сваёй дзівоснай гармоніяй. Своеасаблівасцю стылістыкі найперш вылучаюцца работы Леаніда Давыдзенкі, у іх адчуваеш знакамітыя матывы бацькаўшчыны, свет яе добрых і шчырых людзей. З этнаграфічнай дэталізацыяй стылізуюць свае скульптуры і разьбяр-прафесіянал з Гродна Уладзімір Церабун, і майстры самадзейныя — Мікола Ерафееў, Міхась Корабаў, Апалінар Пупко, Анатоль Маголін, Васіль Віслаўскі, Леанід Жданаў...

Разьбярства па дрэве, як і іншыя рамёствы, мае сваю «мову», і трэба вучыцца «чытаць» драўляныя допісы, як гэта ўмее рэстаўратар старажытных скульптур Зэнта Барысаўна Куўшыннікава. Яна і «будуе» ў фільме масты памяці, якія ўдала знітоўваюць стагоддзі, эпохі і стылі...

Стваральнікі тэлевізійнай стужкі даюць магчымасць гледачу ўбачыць на свае вочы яшчэ адзін цуд народнага мастацтва — бабруйскае гарадское мастацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 15, дзе рыхтуюць спецыялістаў па трынаццаці мастакоўскіх спецыяльнасцях. І застаецца толькі парадавацца, што сярод гэтых трынаццаці прафесій ёсць і такія — «разьбяры па дрэве» і «майстар мастацкага роспісу па дрэве». Менавіта ў гэтым вучылішчы будучыя разьбяры пачынаюць з азоў, з першых прыступкаў, каб потым узняцца да вышынь мастацтва, каб ствараць і накіроўваць на шматлікія мастакоўскія выставы — айчынныя і сусветныя — герояў беларускіх народных казак і паданняў.

Вось і ўсё, бадай, пра новую дакументальную стужку Беларускага тэлебачання. Застаецца толькі параіць гледачу паглядзець гэты фільм. А яго аўтарам — сцэнарысту А. Белавусаву, рэжысёру Л. Гедравічусу і аператару І. Скорынаву — новых творчых удач.

Іосіф КАЛЮТА.

Кадр з дакументальнага тэлефільма «Жывая дрэва душа».

Уладзіміру КУДЗІНАВУ–50

Пісьменніку Уладзіміру Кудзінаву 27 мая спаўняецца 50 гадоў. З гэтай нагоды праўленне СП БССР накіравала юбіляру віншавальны адрас, у якім гаворыцца:

«Дарагі Уладзімір Георгіевіч!

Вам, таленавітаму празаіку і публіцысту, аднаму з актыўных дзеячаў рускамоўнай літаратуры ў рэспубліцы, пасылаем шчырае прывітанне з нагоды слаўнага пяцідзесяцігоддзя Вашага!»

У адрасе нагадваецца жыццёвы і працоўны шлях юбіляра, падкрэсліваецца, што каля дваццаці гадоў ён працуе рэдактарам аддзела прозы часопіса «Неман».

«Пасля выхаду першай кнігі аповесцей і апавяданняў «Разделение радости», — гаворыцца далей у адрасе, — Вы былі прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. У наступнай кнізе апавяданняў «Предчувствие перемен» Вы прадаўжалі быць чуйна ўважлівым да наваколь-най рэчаіснасці, ствараючы вобразы дзейсных па натуры людзей, улюбёных у прыроду, у спазнанне ле таямніц.

Кніга прозы «Сполохи» напісана з жыцця тых, хто прысвяціў сябе няспынным клопатам пра «другі хлеб» земляроба—беларускую бульбу. Змест аповесці «Ольховатская история» складае жыццё сучаснай беларускай вёсні.

Вашы творы вабяць выразнай, крынічна-чыстай рускай мовай, што характэрна і для здзейсненых Вамі перакладаў асобных твораў беларускай літаратуры.

Дарагі Уладзімір Георгіевіч! Горача віншуючы з юбілеем, жадаем Вам на доўгія гады добрага здароўя, творчай бадзёрасці, новых творчых здабыткаў!»

Супрацоўнікі «Літаратуры і мастацтва» шчыра далучаюцца да гэтага віншавання.

КОМПАС ДАБРЫНІ

Жыццё імчыць хутка, і кожны юбілей заўсёды нечаканасць. Магчыма, толькі юбілеі і прымушаюць нас аглядзецца. Ужо і Уладзіміру Кудзінаву з вядомага «Немана», дзе і літаратурны сіропчык умеюць ператвараць у людскае пітво, стукнула пяцьдзесят!

У наш час да вяршынь літаратуры прыходзяць позна. Майстэрства—матэрыя важная, яе не адужаць і самай натхнёнай імправізацыяй. Трэба шмат ведаць, набыць вялізны жыццёвы вопыт, класічным спосабам спроб і памылак сцвердзіць свой уласны голас.

Уладзімір Кудзінаў свой голас мае даўно. Гэта майстар не з канвеернага цэха, на яго творах кляймо непаўторнасці, адметнага лірызму, еднасці з прыродай, з чулымі людзьмі.

Рускамоўная літаратура ў Беларусі выглядае даволі сціпла на фоне вялікага і шматфарбнага букета літаратуры на беларускай мове. Але Уладзімір Кудзінаў быў і застаецца яе каштоўным набыткам. Ён любіць і ведае рускае слова і ўмее ім карыстацца.

Арыгінальная, цёплая, нейкая камерная проза Кудзінава ставіць перад намі ўсімі сур'ёзнае пытанне аб наватарстве і своеасаблівасці. Мы гэтак часта падобны адзін на аднаго, што нашы кнігі нагадваюць больш аўтаэпітафію, чым нерукатворныя помнікі. Так, мы жывём у адну эпоху, разам радуемся і сумуем, але чамусьці не адрозніваемся «лица необщим выраженьем», а між тым вельмі важна мець сваю індывідуальнасць, пераадольваць штампы і стэрэатыпы, змагацца са звычкай.

Навошта патрэбна мастацкая літаратура? На гэта вечнае пытанне ў нейкай меры адказваюць і кнігі Кудзінава—у іх свой компас дабрыні і чалавечнасці, такіх неабходных нам якасцей у непрацяглых жыццёвых падарожжах.

Я перакананы, што менавіта сумленныя і сціплыя галасы ў літаратуры служаць камертонам для вялікіх майстроў. У гэтым сэнсе я параіў бы маладым літаратарам: чытайце Уладзіміра Кудзінава!

Эдуард СКОБЕЛЕЎ.

ЁН БАЧЫЎ ХАРАСТВО

Да 85-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра ЖЫЛКІ

«Маленькая радзіма» Уладзіміра Адамавіча Жылкі — вёска Макашы, што паблізу Міра, а сам паэт — равеснік стагоддзя. Вучыўся спачатку ў гарадскім вучылішчы ў Міры, потым у Багародзіцкім сельскагаспадарчым Тульскай губерні. Сын дробнага гандляра, Уладзімір Жылка імкнуўся ў навуку (а потым і ў літаратуру) з глыбокай верай і надзеяй прынесці палёгку долі мужыка. Відаць, не варта рабіць прысутнасць у жылкаўскай паэзіі высокай павагі да селяніна прывілеяй аднаго Багародзіцкага вучылішча, дзе юнак захапіўся ідэямі народніцтва. Паважаць сялянскую долю Жылка меў усе падставы, пазнаёміўшыся з творамі Францішка Багушэвіча і Кастуся Каліноўскага. Хвалі першай сусветнай вайны пагналі ў далёкі вырай усю сям'ю Жылкаў, ажно ў Калугу. У 1917 г. спачатку сын з бацькам, а потым і маці з малодшымі, вярнуліся на радзіму. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Уладзімір уладкоўваецца аграномам у дзяржаўным маёнтку, якім загадваў Міхась Чарот. Знаёмства юнака з будучым аўтарам «Босых на вогнішчы» дапамагло акрэсліць свой шлях у паэзію. Ён пачынае глыбей вывучаць гісторыю бацькаўшчыны, авалодваць паэтычным майстэрствам.

З 1920 г. Жылка цяжка хварэе на сухоты. Тры гады назад гэта хвароба навекі затрымала ўдалечыні ад родных гоняў Максіма Багдановіча. Менавіта да Максіма Багдановіча стаіць найбліжэй постаць яго не на шмат маладзейшага сабрата па пяру Уладзіміра Жылкі. Знаёмячыся з паэзіяй Жылкі, міжволі адзначаеш падабенства: у пераклічцы паасобных вершаў («Чырванее захад ад марозу», «Народнае» і «Здароў, марозны звонкі вечар!», «У вёсцы»), у спробах адраджэння жанру эпісталы («Вельмі шаноўны пан Рэдактар!» і «Ліст...»), у імкненні аздобіць родную літаратуру новымі вобразамі, тэмамі, вершаванымі памерамі (наяўнасць у абодвух паэтаў «Гекзаметраў» і «Пентаметраў»). Складальнік пакуль што адзінага пасмяротнага зборніка Уладзіміра Жылкі («Вершы», 1970) крытык Уладзімір Калеснік, намаганнямі і рупнасцю якога падрыхтавана новае, больш поўнае выданне — «Пожні», што неўзабаве павінна ўбачыць свет, ва ўступе да свайго грунтоўнага даследавання «Ветразі Адысея» пісаў: «Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Жылкі дае ўдзячны матэрыял да пастаноўкі пытання аб узаемаадносінах беларускай паэзіі з сусветнай класікай, з класічным еўрапейскім рамантызмам, а таксама з неарамантычнымі тэндэнцыямі на пераломе стагоддзяў. Творчасць Жылкі дазваляе нам пашырыць нашы ўяўленні пра тое, як асвойвала беларуская паэзія перадавыя рамантычныя традыцыі іншых народаў і як сама асвойвалася ў сям'і славянскіх літаратур».

З'ехаўшы на лекі да сваякоў пад Гарадзеяй, пасля падпісання Рыжскага дагавору Жылка апынуўся ў Заходняй Беларусі. Пачаліся вымушаныя вандроўкі па роднай зямлі і за яе межамі: Вільня, санаторый Бірштаны ў Літве, Латвія, дзе вучыўся ў Першай беларускай гімназіі ў Дзвінску, потым — Чэхаславакія, вучоба ў славутым Пражскім універсітэце.

У 1925 годзе ў Вільні выходзіць першы зборнік паэта «На ростані» (два гады назад у той жа Вільні асобным выданнем была надрукавана прысвечаная Леапольду Родзевічу паэма «Уяўленне»). Ранні Жылка спрабуе спасцігнуць і пафіласофску растлумачыць аснову паэзіі: умець бачыць хараство свету. Інтымная лірыка Уладзіміра Жылкі заварожвае чысцінёй пачуццяў, захапленнем навізною прыгожага, што прыносіць у свет Жанчына.

Паэт не застаўся на ростанях, а абраў для сябе, бадай, адзіна правільны шлях: у 1926 г. пераехаў у Савецкую Беларусь і актыўна, на колькі дазваляў стан здароўя, уключыўся ў культурнае будаўніцтва рэспублікі. Працаваў літсупрацоўнікам газеты «Звязда», настаўнікам беларускай літаратуры ў Мінскім музычным тэхнікуме. У 1927 г. выдаў свой, найбольш поўны, зборнік «З палёў Заходняй Беларусі». Аўтар яго перакананы: сацыялістычная ява стане рэчаіснасцю і на захад ад Мінска.

Паэт памёр ва ўзросце 33 год, паспеўшы выдаць тры паэтычныя кнігі і застацца ў кагорце лепшых паэтаў беларускай зямлі.

Язэп ЯНУШКЕВІЧ.

На паўночна-ўсходнім узгорыста-лясным ускраёку Маладзечаншчыны значыцца Максімаўка. На яе пляцы стаіць помнік славутаму земляку Сымону Аляксандравічу Рак-Міхайлоўскаму. Нібы сама прырода выбрала гэтага чалавека, каб праверыць, колькі ён можа вынесці на сваіх плячах за тры дзесяцігоддзі драматычных падзей, трох рэвалюцый і заходнебеларускага падполля.

Сымон Аляксандравіч нарадзіўся сто гадоў назад у вялікай земляробчай сям'і. Пасля заканчэння Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі зучыў вясковых дзяцей. З семінарыі ён вынес захопленасць народным меласам, а таксама ўменне іграць на скрыпцы, наладзіць харавыя спевы і ставіць на сцэне драматычныя творы, балазе былі тады ў Маладзечне някепскі хор і драмгурток. За час настаўніцтва Рак-Міхайлоўскі запісаў больш за тысячу беларускіх песень, легенд, казак, прымавак, вывучаў народныя абрады і звычаі. У свае 20 гадоў юнак самааддана ўключыўся ў падзеі рэвалюцыі 1905—1907 гг., стаў агітаваць землякоў не выходзіць на панскае поле, даво-

Анатоль ІВЕРС

На родных загонах

Разгарэўся дзень, а я стаю.
Я стаю на тым пагорку сонным,
Дзе калісьці маладосць сваю
Праз зялёны перавёў сасоннік.

Палавее сонечная даль
Пад густым, як сінька, небам сінім.
Хаты роднай бацькавай шкада,
Ну і той, пасаджанай асіны.

Тут я рос і шчасце спазнаваў
І пайшоў у свет занадта вузкі.
Ах, як пахла мята і трава
Пры дарогах вёсак беларускіх!

Тая хата урасла ў зямлю,
Праваліласа страха на хаце...
Родны край, мо скажуць, не люблю
І забыў пра бацьку і пра маці?

Не, таварышы, нічога не забыў,
Калі гэта слабасць, то адкіну.
Мне б прайсці праз жытнія гарбы
І крануць касою канюшыну.

Я хачу адчуць, як край цвіце
Пасля цяжкай, страшнае навалы,
Слухаць песні звонкія дзяцей,
Як і сорак год таму, бывала.

Беларусь, заўжды жыву табой,
Багацей і сілы загартоўвай!
А калі труба пакліча ў бой,
Зноў з'яўлюся і скажу: «Гатовы!»

Сустрэчы

Вятры як шугалі—шугаюць,
Зганяюць пясок з пагорка
І водар чаромхавы з гаю
Даносяць: ён пахне горка.

Сасна ўсё стаіць як стаяла,
Скрануцца з гары не можа—
Туды, дзе вясеннім валам
Шуміць у даліне збожжа.

А можа, асколак ад міны
Рэжа нутро ёй употай,
Бо рана смыліць штохвіліны
Пад карой пазалоты?

Затое сюды герояў
Нябачнаю цягне сілай:
Сасна, як маці,
вайною
Ад гібелі іх засланіла.

І нельга забыць той часіны,
З памяці годы не сцерці...
А дзень такі сонечны, сіні
Раны рубцуе на сэрцы.

Ты жывеш пад небам сінім

Мяне маці на свет нарадзіла,
Як сасонку ў бары пасадзіла.
Д. БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА.

Сорак год вярэдзіць раны
Пасля цяжкае вайны.
«Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!»

Плыла песня па-над вёскай
Ад начлежнага кастра.
Ты—сасонка,
Ты—бярозка,
Наша родная сястра.

Ты не знала гэтай песні
У тыя грозныя гады,
Бо малую ў бор прынеслі
Ад навалы, ад бяды.

Ты жывеш ў такой краіне,
Там, «Дзе ходзяць басанож».
Ты жывеш пад небам сінім—
Гэту сінь яшчэ памнож!

Ты ж—бярозка,
Ты ж — сасонка
З беларускай глыбіні.
Мо таму і песняй звонкай
У душы маёй звініш.

ПРОДАЖ КАРОВЫ

Дзядзьку Сцяпану во як трэба было прадаць карову. І ён рашыў: хоць патурзаецца з ёю, але зацягне на базар. Вышмаргнуў з нагавіц папругу, прывязаў да рога і павёў.

Стаіць ля плота, дзе злінялая шыльда «Место для скота», і нудзіцца. Ніхто не падыходзіць нават патаргавацца. Усё больш ля цётак, што з ягадамі, трушча. І тады дзядзька пачаў расхвальваць свой тавар:

— Ото ж карова! Усім каровам карова! І не бадлівая, і не збрадлівая. А малако! Суцэльная смятана. А масла! Ці то ўлетку, ці то ўзімку, як пляснеш аб сцяну — так і прыстане!..

Мала-памалу пад шыльдай пачалі збірацца. Спачатку бабы, а потым і мужыкі. Мацалі вымя, правяралі зубы, зноў мацалі, зноў правяралі, а далей гэтага не ішло. Ушыліўся ў гурт і Сцяпанаў сусед Восіп і дзелавіта сказаў:

— Ты пра малако не залівай! Сам ведаю. Цану кажы!

— Базавая.

— А дзе вагі ўзяць?

— Вунь, пад навесам!

І тут пачуўся жаночы голас:

— А людцы мае! А бачыце, што робіцца! Я з раніцы цікую за гэнай кароўкай, прыглядаюся, а ён дарогу перабягае...

— Перабягаю?— агрызнуўся Восіп.— Ды мы са Сцяпанам суседзі, з аднаго калодзежа ваду бяром!

— А чаму дома не старгаваліся?— не сунімалася тая.

— Чаму, чаму!— ужо мякчэў Восіп.— На базары надзейней!

Сцяпан бачыць, што кабета набівае цану, стаў таптацца, не вельмі спяшацца на тыя вагі. А Восіп не пераставаў заяваць:

— Адстань, цётка! Мы ўжо і па руках ударылі, і наконт магарыча дамовіліся.

І толькі як Восіп вышмаргнуў з нагавіц папругу, пачапіў на каровіны рогі, а Сцяпанаву папругу аддаў Сцяпану, жанчына адстала.

І Сцяпан, і Восіп ішлі дадому разам. Адзін думаў, ці не прадзешавіў, другі — ці не пераплаціў.

Так і дайшлі моўчкі да вёскі.

Яраслаў ПАРХУТА

АТЭІСТ

Мне было мо гадоў шэсць, не болей, калі баба Марыля павяла да споведзі.

Стаю ў царкве і чакаю чаргі. Нарэшце баба лёгенька штурханула ў плячо:

— Ідзі, кайся!

Падыходжу да спавядальні і ажно дрыжу ад страху: у чым каяцца? Якія грахі павінен пакінуць тут, каб дадому, як баба Марыля казала, вярнуцца ачышчаным? Ды айцец Парфірый, зусім, як наш дзед Іван у хвіліны расчуленасці, паклаў руку на маю галаву і ашарашыў звычайным зямным пытаннем:

— Па дулі лазіў?

— Па якія дулі?— збянтэжыўся я.

— Па чужыя!

— Сваіх — распержыся.

Ён нібы не чуе:

— Ты не аднеквайся, а кажы: грэшны, бацюшка!

— Дык жа не лазіў!

— А ты — кайся!

І я каюся:

— Грэшны, бацюшка!..

ЖЫВЕ АБ ІМ ПАМЯЦЬ

дзіць, што сапраўднымі гаспадарамі палёў з'яўляюцца яны, хлебаробы. У час выбараў у Дзяржаўную Думу, як сведчаць архіўныя матэрыялы, жандары зрабілі ўсё, каб не дапусціць туды маладога настаўніка.

Пасля паражэння першай рэвалюцыі ў Расіі Рак-Міхайлоўскі мусіў пераехаць у Феадосію. Там у 1912 годзе ён скончыў педагагічны інстытут. Неўзабаве вярнуўся на Беларусь і зноў уключыўся ў актыўную грамадскую працу. Працягваў запісы беларускага фальклору, аж пакуль у ваколіцах Маладзечна і Вілейкі не загрымелі гарматы імперыялістычнай вайны. Як і многія, стаў пад трохлінейку, аказаўся на Румынскім фронце, дзе служыла нямала беларусаў. Сымон Аляксандравіч тлумачыў салдатам сэнс гэтай зацяжной бойкі, і яму верылі. Прымаў удзел у з'ездах салдацкіх дэпутатаў.

Рэвалюцыю сустрэў як яе салдат. З рэвалюцыяй у Расіі звязваў надзею на сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне свайго народа, заваяванне ім дзяржаўнасці. Вялікую ўвагу аддаў палітычнай асвеце сялянства.

Пасля таго, як палавіна Беларусі аказалася пад уладай буржуазна-памешчыцкай Польшчы, грамадскі рух на заняволеных землях, палітычная барацьба працоўных чабылі тут сапраўдны размах. Кіравала змаганнем Кампартыя Заходняй Беларусі. Меў вызваленчы рух заходнебеларускіх працоўных і легальныя формы. Напачатку ён спалучаўся з асветніцтвам. Яшчэ ў 1920 годзе Рак-Міхайлоўскі ў мястэчку Баруны, што на Ашмяншчыне, арганізаваў беларускую настаўніцкую семінарыю, стаў яе дырэктарам, але ўлады хутка зацінілі гэтую ўстанову. Адзін з навучэнцаў семінарыі, Я. Ермаковіч, прыпамінае: «Нас, сялянскіх хлопцаў, уражвала апантанасць дырэктара, уменне запаліць аптымізм, бачыць разумнае і справядлівае, адрозніваць ад злога, несправядлівага. Гэта быў таленавіты педагог, цудоўны матэматык, дабрэйшы чалавек. Ніколі не забуду... экскурсій у ваколіцах Барунаў. Ён любіў прыроду, народную песню. На ўсё жыццё запомніліся яго гутаркі пра родную мову...» З Барунаў Рак-Міхайлоўскі пераехаў у Вільню — галоўны цэнтр рэвалюцыйнай барацьбы Заходняй Беларусі. Сымон Аляксандравіч уваходзіць у склад рэдкалегій газет дэмакратычнага кірунку: «Змаганне», «Вольны сцяг», «Голас беларуса», «Беларуская доля». Разам з Б. Тарашкевічам, П. Мятлой, П. Валошыным і іншымі аднадумцамі арганізоўвае масавую рэвалюцыйна - дэмакратычную арганізацыю — Беларускую сялянска-рабочую грамаду. Рак-Міхайлоўскі стаў намеснікам старшыні ЦК Грамады, з'яўляўся аўтарам яе статута, арганізоўваў выдавецкую дзейнасць, падбіраў кадры. Раз'язджаў па вёсках, гарадах і мястэчках, тлумачыў рабаўніцкую палітыку санацыйнага рэжыму Пілсудскага. Ён быў палкім прамоўцам і ў польскім сейме. Значная была яго работа і ў Таварыстве беларускай школы. Ён шмат зрабіў для адкрыцця школ з беларускай мовай навучання.

Сымон Рак-Міхайлоўскі з жонкаю і дзецьмі

15 студзеня 1927 года ў ліку ўсіх кіраўнікоў Грамады Рак-Міхайлоўскага арыштавалі. Ад яго патрабавалі адмовіцца ад сваёй дзейнасці. На «працэсе 56» у Вільні, дзе польскі буржуазны суд судзіў дзеячаў вызваленчага руху працоўных Заходняй Беларусі, у заключным слове Рак-Міхайлоўскі сказаў: «Я сваёй працы не выракаюся, наадварот — ганаруся сваёй дваццацігадовай дзейнасцю ў вайсковых злучэннях, у школьных, у палітычных. Не было ніводнай галіны беларускай працы, дзе б я ні прымаў самага актыўнага ўдзелу. Усёй працай, як і працай у Грамадзе, магу пахваліцца. А Грамада раскалыхнула наш народ, і гэта дае нам сілу цярпець няволю ў турме...» Змагара не спалохалі 12 гадоў турмы.

У абарону грамадоўцаў выступілі шырокія пласты не толькі ў Заходняй Беларусі і Польшчы. Аб салідарнасці з імі заявілі працоўныя Савецкай Беларусі. Вызвалення патрабавалі на мітынгах рабочыя Чэхаславакіі, Германіі, ЗША, Канады, Францыі, Бразіліі і іншых краін свету. Вызвалены ў 1930 годзе на волю, Рак-Міхайлоўскі не мог больш заставацца ў Заходняй Беларусі. КПЗБ прымае рашэнне накіраваць яго з сям'ёй у Мінск. Тут Сымон Аляксандравіч становіцца дырэктарам музея, выбіраецца членам ЦВК БССР.

Смерць Рак-Міхайлоўскага была цяжкай адчувальнай стратай для нашай культуры. Сымон Аляксандравіч пісаў вершы, перакладаў з іншых моў на беларускую, ён — аўтар п'есы «Марцэлька». Зацвердзілася думка, што ён з'яўляецца аўтарам музыкі папулярнай песні «Зорка Венера» на словы Максіма Багдановіча. Ён быў неацэнны як педагог, мовазнавец, матэматык, публіцыст. Святло яго душы адчувалі і ў сям'і: жонка Гадзея і дзеці — Рагвалод і Рагнеда. Яго імем названа вуліца ў Маладзечне. Памяць аб ім жыве ў пакаленнях беларускага народа.

Генадзь КАХАНОЎСКІ.

— Ну во!— радуецца ён.— А цяпер прызнавайся: яечкі з-пад куры браў?

Зноў не разумею, пра якія яечкі гаворка. Перапытваю:

— З-пад якой куры?

— Ведама, з-пад чужой!

У голасе айца Парфірыя ні то просьба, ні то грозьба. Маўляў, зрабі ласку, скажы, як трэба. І я, павагаўшыся, кажу, як трэба:

— Грэшны, бацюшка...

Адчуваю: весялейшым робіцца айцец Парфірый. Толькі зноў жа — пра сваё пытаецца. На гэты раз — ці лазіў у чужы гарох. Я зноў упіраюся, паказваю на шчарбаты рот, што, каб яму было вядома, не раскушу гарошыны, і ён ажно стогне:

— А-а-мінь!..

І тыцкае халодным крыжам у губы.

Падымаюся з каленяў, вызваляюся з-пад бацюшкавай рукі, увесь спатнелы, і выходжу з царквы. Дадому не іду — лячу і ўсю дарогу лаю айца Парфірыя: усё ж дамогся свайго! Прымусіў прызнацца ў тым, чаго не рабіў!..

Дома ўпотайкі выцягнуў з-за абразоў стары малітоўнік, у якім былі партрэты святых, залез на печ, стаў слініць аловак і падпраўляць катораму — вусы, катораму — бараду.

А пасля запхнуў малітоўнік пад бэльку і, цяперашняй моваю кажучы, ужо атэістам саскочыў з печы і пабег на выган, да хлопцаў, гуляць у лапту.

БУСЬКО

Да буслоў у нас адносіліся з нейкай пяшчотнай павагай. Называлі не інакш, як буськамі. І кожны стараўся, каб на яго котлішчы жыла гэтая птушка. Лічылася нават, што тады хату міне маланка, а ў сям'і будзе шчасце.

Але тое было калісьці. Асушылі суседнія балоцейкі, выпрасталі рачулкі, спусцілі ваду — і буслы пакінулі вёску.

...Палявой дарогаю вяртаюся дамоў. Хмарна. Церусіць дождж. Паказаліся першыя хаты. А за імі, заместа колішняй лугавіны,— цямнее пярэстая ралля. «Заглыбака пусцілі плугі,— падумалася. — Ажно да глею дасталі». І тут, на ўскрайку раллі, заўважаю бусла. Мурзаты і ўсё роўна як сонны хадзіў ён пад дажджом. І ні той паставы, ні той грацыёзнасці, што мы прывыклі бачыць у гэтых птушках, — адна заклапочанасць.

На душы прыкра: «Бусько месіць гразкую раллю і здзіўляецца: а што гэта сталася, пакуль быў у вырай?..»

Мы, часам, такое пытанне і не задаём сабе.

КАМАРОЎКА

Заўсёды едзеш туды з нейкім радасным пачуццём.

...І вось, нарэшце, ён, Камароўскі рынак. Мільгаюць каляровыя хусткі, пінжакі, плашчы, кофты. Не згледзіш нават, як трапіш у той палон, і ідзеш не куды хочаш, а куды нясе цябе тая жывая плынь.

Раптам вуха выхапіць такое аб'ёмнае прастамоўнае слова, што захочацца спыніцца, як перад якім адкрыццём. Ды дзе там! За табою будзе шыліцца дзяцюк і басавіта некаму гудзець:

— Я ўзёў і тожа прымчоў. Між люду патаўчыся.

Маладзіца з-за прылаўка сароміць:

— Мёд дарагі? А хіба ў нас пшчолы — каравэ? Яны ж такія, як і ў вас, пшчолы тыя...

Гэта ўжо не з-пад Маладзечна, гэта ўжо аднекуль з-пад Пінска. Але не паспееш азірнуцца, як іншым здзівішся:

— Даўней ліс быў то ліс! Елка ў елку. А дубіна! А бярэзіна! А цяпер — салома, а не ліс!

Маларыцкага палешука пераб'е ўшацкі дзядок:

— А наша азяро — пашукаць не знойдзеш. Во такенныя шчупакі плодзяцца! А падвалоку ці заходнік возьмеш — куль ракаў мецьмеш. І кожны з лапаць. Ў кожнага кляшчотка такенная!..

«Ах, рыбачок, рыбачок! Выхваляўся б лепш у сваім паазер'і. І тых ракаў менш бы гluміў. Яны ж у Чырвоную кнігу занесены!..»

Пакуль думаеш, сказаць яму тое ці не — у новым свеце апынешся:

— Не хачу естачкі яблычка гэнага. Яно — парукана!

— Абы не паротана!— перадражнівае маладая мама дачушку, дастае хусцінку і выцірае толькі што куплены яблык.

І раптам:

— А я ўзяўшы ўчора, і галава січас как цабэрак...

Ну, канечне, з-за Магілёва прыехаў! Дзівак. Не мог куфаль піва каўтануць, перш чым сюды перціся. Тады б не вісеў хмарай над сваёю цыбуляю, не скардзіўся б суседу.

А вось і цётка ледзь не крычыць сваёй сяброўцы, з якой, пэўна, даўнавата не бачылася:

— Чалавек мой палясоўшчыкам робя, а дачка — магазінершай!..

Сяброўка, абвешаная вязанкамі часнаку, таксама не хоча адставаць:

— А мая ў вучыцелькі падалася!..

Аднекуль на прагалак між цётак і дзядзькам, які «ўзяўшы ўчора», выкаціўся загарэлы, як баравічок, цыганчук і не па гадах дзелавіта прапанаваў:

— Дайце рубля — на пузе крутануся!

Але цёткі не чуюць. Цёткі заняты сваім. Не чуе і дзядзька. А базар — ажно ломіцца ад агародніны, кветак, садавіны, рознага вясковага дабра. Зноў мільгаюць твары, хусткі, плашчы. І галасы соцень людзей зліваюцца ў нястомную музыку. Нават забываешся, чаго ты тут, якая патрэба прывяла цябе сюды.

Спеўная мова твайго народа будзе чуцца і ў сне...

ДАЎНЯЯ-ДАЎНЯЯ КАЗКА

Надвячоркам любіў сядзець у акне і назіраць, як апускаецца на зямлю сонца.

Вялікае і яркае, яно агінала суседскае гумно, праплывала над старою дзічкаю і падала на самы каптурык гары, што віднелася за вёскаю. Гара ўспыхвала, усё роўна як хто там растрасаў залацістую салому, і гэтак вось, залатой, заставалася доўга, пакуль сонца не гасла.

Аднойчы рашыўся пабегчы, туды, каб зблізку паглядзець на ўсё тое. Але, пакуль бег, сонца ўжо не застаў — некуды знікла. Спачатку меркаваў, што дзенебудзь закацілася за камень, патушыла свой ліхтар і спіць. Потым прыйшла іншая згадка: а мо прасачылася скрозь зямлю, каб раніцой паказацца ўжо на тым канцы вёскі — на Мельнікавай гары...

Назаўтра, яшчэ маці не даіла і карозы, выбег з хаты, залез на паграбок і стаў пільнаваць сонца. Яно, сапраўды, паднялося з Мельнікавай гары — павольнае і спакойнае. А потым разышлося і свяціла нам цэлы дзень. Пакуль вечарам зноў не села на Залатую гару.

Гэта прыгожая казка жыве ўва мне і зараз.

ВЕСЯЛУН

Яшчэ як мае быць і не ўднела, а Уладак вісеў на веснічках. Думаеце, так сабе вісеў? Гэты весялун і цяпер думаў, як пацешыць вёску. І прыдумаў. Праз якія паўгадзіны адарваўся ад веснічак і пачаў абходзіць хаты.

Спачатку зайшоў да Тодарыхі, сеў на парог і смаліў махру, пакуль не напусціў поўную хату сіняга дыму. Тады толькі сказаў:

— Я такое ведаю, ну, проста ўпала б...

Тодарыха ад цікаўнасці ажно рот разявіла, а ён — падняўся сабе і патупаў да Саўчыхі. Там гнуўся на парозе не доўга, пачаў амаль адразу:

— Язык трымацьмеш? Тады адной табе...

Кінуў акурак на падлогу, прыціснуў чобатам і нечакана махнуў рукою:

— Н-не. Не магу. Не маю права. Іншым разам як-небудзь.

І пайшоў да Ксюткі. Там не закурыў, не сеў на парог — з ходу пахваліўся:

— А я нештачкі ведаю...

Ксютка натапырыла вушы, узгарэлася пачуць навіну, але Уладак адным махам астудзіў яе:

— Ведаю, а не скажу.

І пасунуўся дадому.

Цюкае тапорыкам на дрывотні Уладак, цюкае, а вёска ажно млее ад невядомасці: «Чалавек нешта ведае! Сакрэт нейкі мае Уладак!..» Бразгаюць дзверы, жанкі перабягаюць з двара ў двор — узрушаныя, наструненыя, намагнічаныя. І так — пакуль не вярнуліся з работы мужыкі. Яны таксама ўзгарэліся, павячэралі на хуткую руку і — на Уладакаў падворак.

— Ты чым гэта сёння жанок нашых узбунтаваў? — здалёк пачалі закідваць вуды.—То мо нам адкрыешся?

— А чаму ж не!—Уладак хітравата варухнуў пракураным вусам і паказаў на Стручка, маленькага і ціхманага суседа:—На досвітку бачыў, як ён джгаў са свайго двара. Вось толькі не знаю: дзеркачом яго турнула жонка, ці сам на работу спяшаўся гэтак...

Мужыкі ад смеху ажно клаліся, хоць і ведалі: Уладак прыдумаў гэта людзям на пацеху. (Усе зналі, які са Стручка работнік!). Смяяўся і бяскрыўдны Стручок. І толькі хоць бы адненькая ўсмешка прабегла па Уладакавым твары...

А нядаўна Уладак пакінуў вёску — да сына ў горад зімаваць з'ехаў. Не стала весялуна-чалавека, і ўсе адчулі, быдта страцілі нешта, быдта збяднелі адразу.

Цяпер кожны чакае, калі Уладак вернецца летаваць.

ПОЗНІЯ СУНІЦЫ

У прыгарадны лес прыехалі аўтобусам. Пастаялі трошкі на шасейцы, прапусцілі чараду машын, збочылі на лясную сцяжыну і паволі пайшлі між дрэў. Усё наўкол ажно гарэла ад фарбаў. І яшчэ заўважылі: было ціха. Не варухнецца ліст, не падасць голасу птушка.

На паляне спыніліся. Ён стаяў, пазіраў, як дагаралі бярозы, і шкадаваў, што так рана прыйшла восень. А яна хадзіла паблізу, між белых, як снег, камлёў, тадысяды нахілялася і, відаць было, нешта збірала.

Калі наблізіўся, на яе маленькай далоні ляжалі тры сунічыны. Ягады былі буйныя, у залацістых макулінках на пунсовым фоне.

— Частуйся! — падала яна далонь.

Быццам у паклоне, нахіліў галаву і аднымі вуснамі зняў ягадзінку. Другую зняла яна і зноў падала далонь:

— Твая...

Недзе на шасейцы вуркаталі машыны. Недзе непакоілася сарока. Недзе над верхавінамі дрэў плыло сонца. Але яны нічога не чулі, нічога не бачылі — жылі сваім.

— Дзякуй. За гэты дзень, — прашаптаў ён, узяў яе далоні ў свае і пацалаваў спачатку адну, потым другую.

Яна стаяла, маўклівая, трапяткая, адчувала рукамі яго дыханне і не асмельвалася прамовіць слова.

Музам на пацеху

Юрый ЦЫБІН

ПАСЛЯ ПРАВАЛУ

Мамышка, дэбютуючы ў галоўнай ролі, нечакана забыў тэкст, пачаў плесці лухту і неўпапад перамяшчацца па сцэне. Нешматлікія гледачы, трапіўшы ў тэатр ці то пагрэцца, ці то выпіць свежага піва, рагаталі ад душы. Пачырванелы ад сораму, Мамышка выбег за кулісы. У грудзях пахаладзела. «Усё, — з тугой падумаў Мамышка,—цяпер ужо выганяць!»

— А гэта ідзе!—пачуўся раптам голас дырэктара тэатра, які сачыў праз шчылінку паміж кулісамі за рэакцыяй залы. — Вы толькі паглядзіце, як яны разварушыліся! А мы ж цяпер і далей так іграць паспрабуем. Людзі ж да нас валам паваляць, так, Макей Ільіч?

І ён дапытліва зірнуў на галоўнага рэжысёра. Той не адказаў, толькі раздражнёна пацісну плячамі.

Чутка аб правале ўмомант распаўсюдзілася па горадзе. Масла ў агонь падліў разгромны артыкул, надрукаваны мясцовай газетай. Праз тыдзень дастаць білет на спектакль з удзелам Мамышкі не здолеў бы нават нашчадак вялікага камбінатара.

Месяц спектакль ішоў з аншлагам.

Да задавальнення публікі Мамышка раз-пораз спраўна правальваў ролю, пакуль нечакана для сябе не зразумеў, што вывучыў яе амаль назубок.

Трэба было неадкладна мяняць рэпертуар.

У ахвяру вырашылі прынесці п'есу моднага, ужо пры жыцці аднесенага да класікаў, драматурга.

Разлік атрымаўся выдатны: на Мамышку пачалі ездзіць з іншых гарадоў. Яго пазнавалі на вуліцы, прасілі аўтограф. Цяжар гэтакай неверагоднай папулярнасці не турбаваў Мамышку, ён па-ранейшаму ахвотна выходзіў на сцэну, гатовы да бясконцых кпінаў залы.

Дырэктар задаволена паціраў рукі: тэатр упершыню паспяхова выконваў фінансавы план.

Усё скончылася нечакана. Гнілаваты яблык, пушчаны аднойчы драматургам-класікам, трапіў Мамышку ў галаву. Той на імгненне страціў арыенціроўку, пахіснуўся і паляцеў у аркестравую яму.

Больш на сцэне ён не з'яўляўся, аддаўшы перавагу працы ў кіно. Сцвярджаюць, што фільмы з яго удзелам ужо дэманструюцца на нашых экранах. Магчыма, вы бачылі?

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...

Мал. П. КОЗІЧА.

Уладзімір МАЦВЕЕНКА

ЯК ПАХУДЗЕЦЬ?

ДЫЯЛОГ

—Суседачка, прыемна
паглядзець,
Як муж твой здолеў
пахудзець.
Худзюшчы, быццам тая
палка.
А ў чым сакрэт?
— Ды ўсё рыбалка.
— І праз яе худзее
пакрысе?
— Ды не, ён есць—што
прынясе.

Яўген КРУПЕНЬКА

Баран, Асёл і Леў

Павер, чытач, мне: гэта
не падман.
Баран,
Сустрэўшыся з Аслом,
Паведаміў яму чарговую
прыгоду:
— От, нарабіў гаспадару
турботаў,—
Вароты новыя учора выбіў
лбом!
Павер,
Цяпер—
На цэлы год яму работы,
Пакуль ён зробіць новыя
вароты.
Ад гэтага паведамлення
Асёл быў проста
ў захапленні:
— Сапраўдны подзвіг ты,
Баран, зрабіў,
Які ніхто яшчэ не ацаніў.
І пра цябе—нікольні
не хлушу—
Артыкул у газету напішу.
І слова сапраўды Асёл
стрымаў:
Такі артыкул—оду напісаў,
Што неўзабаве
Баран хадзіў у славе,—
Аж да нябёс
Асёл яго узнёс:
Маўляў, у кожнай справе
ён невыпадковы,
Надзвычай прабіўны,
талковы,
Работнік самы адмысловы,
Трымаць яго патрэбна
на прыкмеце...
Леў прачытаў артыкул
у газеце
І, не задумваючыся шмат,
Адразу падпісаў загад:
«Узяць у штат...»

ПЕРАГУКВАННЕ...

Янка БРЫЛЬ:
— У Забалоцці днее.
Максім ТАНК:
— Хай будзе святло.

●

Уладзімір ЮРЭВІЧ:
— Дзе начуе сонца?
Міхась КАЛАЧЫНСКІ:
— За палямі, за лясамі.

●

Рыгор НЯХАЙ:
— Туман над стэпам.
Леанід ПРОКША:
— Туман развеецца.

●

Барыс САЧАНКА:
— Дарога ішла праз лес.
Алесь РЫБАК:
— Дарогі бываюць розныя.

●

Алесь ЖУК:
— Не забывай мяне.
Юрка ГОЛУБ:
— Помню пра цябе.

Вячаслаў АДАМЧЫК:
— Дзікі голуб.
Аляксей ДУДАРАЎ:
— Святая птушка.

●

Юрась СВІРКА:
— Шэпчуцца ліўні.
Кастусь ЦВІРКА:
— Бягуць раўчукі.

●

Валянцін МЫСЛІВЕЦ:
— Дубы не маўчаць.
Яўген КАРШУКОЎ:
— Не без таго...

●

Уладзімір ЛІПСКІ:
— Якое яно, шчасце?
Алесь ШАШКОЎ:
— Спытай сваё сэрца.

●

Аляксей КУЛАКОЎСКІ:
— Расце мята пад акном.
Эдуард ВАЛАСЕВІЧ:
— Як дбаеш—так і маеш.

Падслухаў
Цімох ДЗЕРАЗА.

Андрэй ЛЕШЧАНКА

МІНІЯЦЮРЫ

СІЛА ЯЗЫКА

Бытуе жарт здаўна
ў народзе,
Усім яго запомніць варта:
«Язык да Кіева даводзіць,
А часам нават да... інфаркта».

ПРЫЗНАННЕ БРАКАНЬЕРА

— Няўжо ты літасці
не маеш,
Калі дзічыну забіваеш?
— Шкада яе тады бывае,
Калі хто іншы забівае.

«ПРАЦАВІТЫ»

Як на пасаду сеў Міхед,
За працу «ўзяўся» ён
як след.
І тут Міхед пабіў рэкорды:
Ён разгадаў усе красворды.

Рыгор ГАЛКОЎСКІ

БАЙКІ Ў ПРОЗЕ

ПАЗАЙЗДРОСЦІЎ

— У каго выдатнае жыццё, дык гэта ў вераб'ёў, — пацягнуўшыся на цёплай ляжанцы, пазайздросціў кот Васька. — Ім мышэй лавіць не трэба.

МУРАВЕЙ

— І чаму толькі Ваўка драпежнікам завуць? — здзіўляўся Муравей. — Я такі малы і то мяне ні разу не чапае.

Дзівак-чалавек...

Мал. А. ГУРСКАГА.

На экране

з 27 мая па 2 чэрвеня

27 мая, 20.05
«СУГУЧЧА ДУМКІ І ЖЭСТУ».
Сусветна вядомы Марсель Марсо, пазнаёміўшыся з тэатрам пантамімы «Рух», сказаў: «Бадай што такому тэатру належыць будучыня».
У перадачы вы пазнаёміцеся з калектывам, убачыце лепшыя нумары з рэпертуару тэатра, даведаецеся пра гастролі ў Дортмундзе і Валгаградзе, Хельсінкі і Маскве, Варшаве і Будапешце.

30 мая, 21.40
ЙОС ВАНДЭЛОА. «ТЫДЗЕНЬ КАПІТАНАЎ».
Прэм'ера спектакля Беларускага тэлебачання. Рэжысёр — В. Мацюшэўскі. У ролях: народны артыст БССР Г. Гарбук, заслужаныя артысты рэспублікі М. Федароўскі, А. Ткачонак, А. Мілаванаў, А. Памазан.

31 мая, 20.00
«НАШЫ ГОСЦІ».
Адбудзецца знаёмства з калектывам Кіеўскага дзяржаўнага акадэмічнага рускага драматычнага тэатра імя Л. Украінкі.

1 чэрвеня, 12.15
«У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ».
Перадача прысвечана творчасці мастака Л. Асядоўскага.

1 чэрвеня, 13.05
«ЛІТАРАТУРНЫ ТЭАТР».
Урыўкі з твораў народнага пісьменніка БССР Янкі Брыля чытае артыст У. Шэлестаў.

2 чэрвеня, 14.40
«СУЗОР'Е».
Тэлевізійны клуб самадзейнай мастацкай творчасці.

2 чэрвеня, 18.15
«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ».
Перадача расказвае аб творчасці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, скульптара І. Міско. У ёй прымае ўдзел лётчык-касманаўт СССР У. Кавалёнак.

2 чэрвеня, 19.20
«ХАТЫНЬ».
Прэм'ера дакументальнага фільма Беларускага тэлебачання.

У «Кнігарні пісьменніка»

БЕЛАРУСКІЯ МАСТАКІ ПРА ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ. На беларускай, рускай, англійскай, французскай, іспанскай і нямецкай мовах. Мн., «Беларусь», 1985. — 11 р. 90 к.

Д. БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА. Габрынька і Габрусь. Вершы. Мн., «Юнацтва», 1985. — 20 к.

С. ЖАРОМСКІ. Верная рака. Пераклад з польскай М. Дубянецкага. Аповесць і апавяданні. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 1 р. 60 к.

В. ЗУБ. Надзейная апора. П'есы, сцэнкі. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 1 р. 30 к.

ЗУЛЬФІЯ. Такое сэрца ў мяне. Вершы і паэма. Пераклад Э. Агняцвет і А. Грачанікава. Серыя «Паэзія народаў СССР». Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 60 к.

У. ШАХАВЕЦ. Блакітная мара. Аповесць. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 35 к.

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКАЯ ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ ІМЯ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА
АБ'ЯВЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД ПРАФЕСАРСКА - ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ:

Кафедра фартэпіяна
Дацэнт — 2
Кафедра агульнага фартэпіяна
Дацэнт — 1
Кафедра педагогікі і псіхалогіі
Дацэнт — 2
Кафедра баяна-акардэона
Дацэнт — 1
Кафедра спеваў
Дацэнт — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Заявы і дакументы, згодна палажэнню аб конкурсе, накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Даведкі па тэл.: 22-49-42, 22-96-71.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 00191 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.